Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

№ 26 (2917)
30 чэрвеня 1978 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Выдаецца з 1932 г.
Цана 8 кап.

3 ліпеня—Дзень вызвалення Савецкай Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў





Пятро ГЛЕБКА

МІНСК

Горад мой вячысты,
Горад прамяністы,
Вечна працавіты,
Вечна урачысты!

Дзе мы ні бывалі,
Дзе ні ваявалі,
Нашы думы-мары
Над табой луналі.

На шляхах бясконцых
У чужой старонцы
Ты нам уяўляўся
У красе і ў сонцы.

А прыйшлі з вайны мы
На твае мясціны, —
Толькі і засталі
Попел ды руіны.

Але мужнай сілы
Гора не скрышыла, —
Мы ў твае падмуркі
Сэрцы палажылі.

І як славай ратнай,
Так і працай знатнай
Між сталіц рэспублік
Ты цяпер выдатны.

Як жа з гэтай працы
Нам не любавацца:
Вось яны — заводы,
Фабрыкі, палацы!..

З векам наўздагонкі
Ты ва ўсе старонкі
Як жыццё — шырокі,
І як песня — звонкі.

Днямі і начамі
Ты шуміш гудкамі,
Свецішся далёка
Белымі агнямі,

І над цэлым светам
Пурпуровым цветам
У садах і парках
Зацвітаеш летам,

І на ўсім прасторы
Над табою зоры,
Быццам бы ніколі
Ты не быў і ў горы.

Горад мой вячысты,
Горад прамяністы,
Вечна працавіты,
Вечна урачысты!

НЕЎМІРУЧЫ ТВОЙ ПОДЗВІГ, МІНСК!

Сардэчная сустрэча таварыша Л. І. Брэжнева ў сталіцы Беларусі

Цёпла, з вялікай сардэчнасцю сустрэлі 25 чэрвеня мінчане Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыню Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжнева, які прыбыў для ўдзелу ва ўрачыстасцях, прысвечаных уручэнню гораду-герою ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка».

Разам з таварышам Л. І. Брэжневым прыбылі член Палітбюро ЦК КПСС, міністр абароны СССР Д. Ф. Усцінаў, а таксама кандыдат у члены ЦК КПСС, памочнік Генеральнага сакратара ЦК КПСС А. М. Аляксандраў, намеснік кіраўніка спраў ЦК КПСС М. Е. Магілявец.

10 гадзін раніцы. Поезд падыходзіць да перона. Л. І. Брэжнева сустракаюць кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі П. М. Машэраў, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР І. Я. Палякоў, Старшыня Савета Міністраў рэспублікі Ц. Я. Кісялёў, члены Бюро ЦК Кампартыі Беларусі — А. Н. Аксёнаў, М. М. Зайцаў, А. Т. Кузьмін, М. І. Лагір, У. А. Мікуліч, У. Ф. Міцкевіч, Я. П. Нікулкін, М. Н. Полазаў, А. А. Смірноў, В. С. Шавялуха, І. Ф. Якушаў, кандыдаты ў члены Бюро ЦК Кампартыі Беларусі — У. Е. Лабанок, К. М. Платонаў, Н. Л. Сняжкова, намеснікі Старшыні Савета Міністраў БССР, загадчыкі аддзелаў ЦК КПБ, члены Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, міністры, першы сакратар Мінскага гаркома партыі Г. Г. Барташэвіч, старшыня гарвыканкома С. М. Лукашэвіч, члены і кандыдаты ў члены бюро мінскіх абкома і гаркома КПБ, члены гарвыканкома, першыя сакратары абкомаў КПБ і старшыні аблвыканкомаў, ганаровыя грамадзяне Мінска.

Героі Сацыялістычнай Працы — муляр БУ-5 будтрэста № 1 М. К. Яроменка, дырэктар Інстытута фізікі АН БССР Б. І. Сцяпанаў, слесар вытворчага аб'яднання «Інтэграл» імя XXV з'езда КПСС В. В. Заблоцкі ў знак глыбокай павагі і ўдзячнасці ад імя рабочага класа, інтэлігенцыі і ўсіх працоўных Мінска паднеслі таварышу Л. І. Брэжневу сімвалічны ключ ад горада-героя.

Піянеры ўручаюць Леаніду Ільічу букеты кветак.

Вітаць Л. І. Брэжнева на пасвяточнаму ўпрыгожаныя вуліцы і плошчы горада выйшлі сотні тысяч мінчан. На фасадах дамоў, у руках жыхароў горада — транспаранты з лозунгамі: «Слава Камуністычнай партыі Савецкага Саюза!», «Слава вялікаму савецкаму народу — народу - пераможцу!», «Сардэчна запрашаем, дарагі Леанід Ільіч!»

Картэж машын прыбывае на плошчу Перамогі. Ля велічнага помніка-абеліска, узведзенага ў гонар воінаў Савецкай Арміі і партызан, якія праявілі высокую мужнасць і гераізм у баях за Радзіму ў гады Вялікай Айчыннай вайны, выстраена ганаровая варта воінаў Мінскага гарнізона. Аркестр выконвае мелодыю «Слаўся!» М. Глінкі.

Да падножжа абеліска таварыш Л. І. Брэжнеў ускладае вянок. На чырвонай стужцы — надпіс: «Воінам, партызанам, падпольшчыкам, якія загінулі ў барацьбе за гонар, свабоду і незалежнасць нашай Радзімы, ад Л. І. Брэжнева».

Мінутай маўчання ля Вечнага агню Л. І. Брэжнеў і Д. Ф. Усцінаў ушанавалі памяць тых, хто аддаў сваё жыццё, абараняючы сацыялістычную Айчыну.

У цырымоніі ўскладання вянка прынялі ўдзел П. М. Машэраў, І. Я. Палякоў, Ц. Я. Кісялёў, іншыя кіраўнікі Кампартыі Беларусі і ўрада рэспублікі, ветэраны баёў за вызваленне Мінска.

Затым Л. І. Брэжнеў зрабіў паездку па гораду, пабываў у раёнах новага жыллёвага будаўніцтва.

Сардэчная сустрэча Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжнева з працоўнымі Мінска вылілася ў яркую дэманстрацыю непарушнага адзінства партыі і народа, аднадушнага адабрэння мудрай унутранай і знешняй палітыкі КПСС і Савецкай дзяржавы.

(БЕЛТА).

Урачыстае пасяджэнне, прысвечанае ўручэнню гораду-герою ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка»

25 чэрвеня ў Вялікім тэатры оперы і балета Беларускай ССР адбылося ўрачыстае пасяджэнне мінскіх гаркома партыі і гарадскога Савета народных дэпутатаў сумесна з прадстаўнікамі партыйных, грамадскіх арганізацый, працоўных калектываў і воінскіх часцей Мінскага гарнізона, прысвечанае ўручэнню гораду ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка».

У зале сабраліся ветэраны ленінскай партыі, вайны і працы, ганаровыя грамадзяне горада, Героі Савецкага Саюза і Героі Сацыялістычнай Працы, кавалеры ордэна Славы трох ступеней, члены і кандыдаты ў члены ЦК КПБ, члены Рэвізійнай камісіі Кампартыі Беларусі, члены Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, дэпутаты Вярхоўных Саветаў СССР і БССР, члены Ваеннага савета Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі, вядомыя ваеначальнікі, якія прымалі непасрэдны ўдзел у ажыццяўленні аперацыі па вызваленню сталіцы Савецкай Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Тут знаходзяцца таксама кіраўнікі рэспублікі перыяду Вялікай Айчыннай вайны, сакратары падпольных абкомаў і Мінскага гаркома Кампартыі Беларусі, камандзіры і камісары партызанскіх брыгад, былыя падпольшчыкі і партызаны, прадстаўнікі працоўных калектываў горада.

Падзяліць радасць мінчан з выпадку ўручэння Мінску высокіх узнагарод Радзімы прыбылі дэлегацыі ўсіх абласцей рэспублікі.

Гарачай авацыяй, здравіцамі ў гонар КПСС, яе ленінскага Цэнтральнага Камітэта, вялікага савецкага народа сустракаюць прысутныя Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыню Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыша Л. І. Брэжнева.

У прэзідыуме ўрачыстага пасяджэння — член Палітбюро ЦК КПСС, міністр абароны СССР Д. Ф. Усцінаў, кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі П. М. Машэраў, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР І. Я. Палякоў, Старшыня Савета Міністраў рэспублікі Ц. Я. Кісялёў, кандыдат у члены ЦК КПСС, памочнік Генеральнага сакратара ЦК КПСС А. М. Аляксандраў. Разам з імі—члены Бюро ЦК Кампартыі Беларусі— А. Н. Аксёнаў, М. М. Зайцаў, А. Т. Кузьмін, М. І. Лагір, У. А. Мікуліч, У. Ф. Міцкевіч, Я. П. Нікулкін, М. Н. Полазаў, А. А. Смірноў, В. С. Шавялуха, І. Ф. Якушаў, кандыдаты ў члены Бюро ЦК Кампартыі Беларусі— У. Е. Лабанок, К. М. Платонаў, Н. Л. Сняжкова, намеснікі Старшыні Савета Міністраў БССР, загадчыкі аддзелаў ЦК КПБ, члены і кандыдаты ў члены бюро Мінскага гаркома партыі, знатныя работнікі вытворчасці, дзеячы навукі і культуры, кіраўнікі рэспублікі перыяду Вялікай Айчыннай вайны на чале з былым першым сакратаром ЦК Кампартыі Беларусі, начальнікам Цэнтральнага штаба партызанскага руху П. К. Панамарэнкам, кіраўнікі дэлегацый усіх абласцей Беларусі, ганаровыя грамадзяне Мінска.

Урачыстае пасяджэнне адкрыў першы сакратар Мінскага гаркома КП Беларусі Г. Г. Барташэвіч.

Ад імя ўдзельнікаў пасяджэння старшынствуючы цёпла вітаў гасцей, якія прыбылі на ўрачыстасці ў Мінск.

Велічна гучаць дзяржаўныя гімны Савецкага Саюза і Беларускай ССР.

З вялікім натхненнем выбіраецца ганаровы прэзідыум у саставе Палітбюро Цэнтральнага Камітэта КПСС на чале з таварышам Леанідам Ільічом Брэжневым.

Пад апладысменты прысутных у залу ўносяцца сцягі горада-героя Мінска, пераходны Чырвоны сцяг ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ, Памятны сцяг ЦК Кампартыі Беларусі, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, Савета Міністраў БССР, Белсаўпрофа.

Слова атрымлівае Генеральны сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыш Леанід Ільіч Брэжнеў. Усе ўстаюць. Гучаць бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты.

Прамова таварыша Л. І. БРЭЖНЕВА

Паважаныя таварышы!

Дарагія мінчане!

На мяне ўскладзена адказная і прыемная місія—ручыць сталіцы Савецкай Беларусі Мінску, які ўдастоены ганаровага звання «Горад-герой», вышэйшыя ўзнагароды Радзімы — ордэн Леніна і медаль «Залатая Зорка». **(Апладысменты).**

Дазвольце ў гэты ўрачысты, у гэты святочны дзень сардэчна павіншаваць вас і ўсіх працоўных рэспублікі з высокай узнагародай. **(Працяглыя апладысменты).**

Прыміце самыя гарачыя віншаванні ад Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР і Савета Міністраў СССР. **(Працяглыя апладысменты).**

Усе савецкія людзі шлюць сёння свае віншаванні і прывітанні слаўнаму беларускаму народу, мужнаму і стойкаму, працавітаму і скромнаму, які валодае развітым пачуццём інтэрнацыянальнага абавязку, упэўнена ідзе ў адзіным страі з усімі нацыямі і нацыянальнасцямі нашай Радзімы. **(Працяглыя апладысменты).**

Узнагароды гарадам — гэта, вядома ж, узнагароды людзям. Людзі ствараюць гарады. Людзі абараняюць іх. Людзі ўзнімаюць іх з руін. Людзі добраўпарадкоўваюць гарады і пераўтвараюць іх.

У вашага горада — трывалыя рэвалюцыйныя традыцыі. Тут адбыўся першы з'езд РСДРП. Мінская чырвонагвардзейская дружына, пасланая ў рэвалюцыйны Петраград, удзельнічала ў штурме Зімняга. І ў суровыя дні вайны, і ў гады мірнага будаўніцтва мінскія камуністы былі сапраўднымі важакамі і арганізатарамі мас, паслядоўнымі праваднікамі палітычнага курсу партыі. **(Апладысменты).**

Сёння першыя словы ўдзячнасці, словы падзякі і найвялікшай павагі мы звяртаем да тых тысяч і тысяч мінчан, якія проціпаставілі ваеннай машыне гітлераўцаў свой гераізм і волю да перамогі. **(Апладысменты).** Мінск быў захоплены ворагам. Але Мінск ніколі не быў пакораны. **(Апладысменты).**

Пад кіраўніцтвам падпольнага гаркома партыі ў горадзе дзейнічала разгалінаваная сетка канспіратыўных груп і арганізацый. Ні масавыя пакаранні смерцю, ні зверствы карнікаў не змаглі зламаць герояў. Мінск стаў сапраўдным пеклам для акупантаў. Ніводнага дня вораг не адчуваў сябе ў бяспецы. Паўтары тысячы баявых аперацый — вось уражальны вынік трох гадоў барацьбы мінскіх падпольшчыкаў. **(Апладысменты).**

Мінск не быў адзінокім. Тысячамі ніцей мінчане былі звязаны з партызанскім рухам, які ахапіў усю Беларусь. 213 партызанскіх брыгад і 258 асобных партызанскіх атрадаў адважна змагаліся ў тыле ў ворага. Гэта была сапраўды народная, свяшчэнная вайна. **(Працяглыя апладысменты).**

У кожным горадзе, у кожнай беларускай вёсцы ёсць ветэраны вайны: партызаны, падпольшчыкі, франтавікі. Шмат іх і ў гэтай зале. Цяжка знайсці словы, каб выказаць бязмежную ўдзячнасць тым, хто выратаваў Радзіму ў часы найцяжэйшых выпрабаванняў. Дзякуй вам. Добрага вам здароўя, дарагія сябры. **(Бурныя, працяглыя апладысменты).**

Звыш двух мільёнаў сваіх сыноў і дачок страціла Беларусь. Мы схіляем галовы перад подзвігам тых, хто ўвайшоў у неўміручасць, прыняўшы смерць у імя выратавання Радзімы.

Светлую памяць герояў прашу ўшанаваць уставаннем. **(Усе ўстаюць. Мінута маўчання).**

Таварышы! Адгрымелі залпы пераможнага салюта. Эпапея вайны змянілася эпапеяй адноўлення. Многія з вас, напэўна, памятаюць Мінск такім, якім ён выйшаў з вайны. Руіны, пажарышчы, парослыя бур'яном пустэчы... Горада фактычна не існавала. І зноў бой, зноў барацьба — барацьба за тое, каб не проста ўзняць з руін сталіцу Беларусі, але зрабіць яе яшчэ больш прыгожай. Апіраючыся на дапамогу ЦК КПСС, Савецкага ўрада, на брацкую падтрымку ўсіх саюзных рэспублік, мінчане ў небывала кароткі тэрмін аднавілі свой горад.

Гонар і слава тым, хто, не паспеўшы зняць шынялі і гімнасёркі, не паспеўшы абняць прыйшоўшых з фронту родных і блізкіх, не паспеўшы выцерці горкія слёзы страт, стаў на вахту адраджэння. **(Працяглыя апладысменты).** Высокая ўзнагарода Мінска — гэта і ваша ўзнагарода, дарагія таварышы! **(Апладысменты).**

Мне давялося пабываць у многіх, вельмі многіх гарадах краіны. І, не крывячы душой, магу сказаць: цяперашні Мінск — адзін з самых прыгожых. **(Працяглыя апладысменты).**

Праехаўшы па вуліцах Мінска, я зведаў пачуццё глыбокага задавальнення. Гэта горад, які захапляе адзінствам і цэласнасцю архітэктурнай задумы, сучаснай планіроўкай, добраўпарадкаванасцю і чысцінёй вуліц, зялёнымі масівамі.

Мінск сёння—гэта не толькі буйны індустрыяльны цэнтр рэспублікі, але і ўсёй краіны. Аўтамабілі і трактары, станкі і прыборы, электронна-вылічальныя машыны і оптыка, якія вырабляюцца ў вас, карыстаюцца добрай славай. Гадавы аб'ём выпускаемай у горадзе прадукцыі ў 72 разы большы, чым у даваенным, 1940 годзе. Больш трэці вырабаў выпускаецца са Знакам якасці.

Мінск па праву можа ганарыцца сваёй маладой, але ўжо сталай навукай. Яна смела заявіла аб сабе значнымі дасягненнямі ў такіх галінах ведаў, як фізіка, тэхнічная кібернетыка, матэматыка, ядзерная энергетыка і інш. Вашы вучоныя даюць добры прыклад плённай сувязі навукі з вытворчасцю.

Мінск — гэта цэнтр беларускай культуры, горад, які ўносіць дастойны ўклад у развіццё ўсёй шматнацыянальнай савецкай культуры. Тут сканцэнтраваны буйныя навучальныя ўстановы, дзе рыхтуюцца спецыялісты высокай кваліфікацыі не толькі для рэспублікі і краіны, але і для дружалюбных дзяржаў. Шырока вядомыя і папулярныя вашы тэатры, песенныя і танцавальныя ансамблі.

Што асабліва прыемна адзначыць сёння,—у музеях Мінска, у назвах яго вуліц, у велічных манументах беражна захоўваецца памяць аб баявым мінулым горада, аб героях-мінчанах, памяць, якая служыла і служыць крыніцай патрыятычных пачуццяў і працоўнага энтузіязму. **(Апладысменты).**

Дасягненні Савецкай Беларусі, у тым ліку яе сталіцы,—жывое ўвасабленне ленінскай нацыянальнай палітыкі, рэалізацыя

цыя творчай магутнасці разняволеных сацыялізмам духоўных сіл народа. **[Апладысменты].**

Віншуючы з высокай узнагародай рабочых, інжынераў і тэхнікаў, вучоных і дзеячаў культуры, урачоў і настаўнікаў, усіх працаўнікоў Мінска, мне хацелася б выказаць упэўненасць у тым, што мінчане і ў далейшым будуць высока трымаць сцяг свайго горада, сцяг, авеяны славай баявых і працоўных здзяйсненняў. **[Працяглыя апладысменты].**

Высокай ацэнкі заслугоўвае той факт, што пад кіраўніцтвам ЦК Кампартыі Беларусі і Мінскага абкома стотысячны атрад мінскіх камуністаў пастаянна ўдасканальвае формы і метады партыйнай работы. Вырасілі выдатныя кадры партыйных, савецкіх, гаспадарчых, прафсаюзных і камсамольскіх кіраўнікоў, валодаючых пачуццём новага, здольных з веданнем справы вырашаць задачы, якія ставяць жыццё, эпоха развітога сацыялізму.

Вялікіх вам поспехаў, дарагія сябры! **[Апладысменты].** Перакананы, што камуністы Мінска, камуністы Беларусі ўнясуць дастойны ўклад у выкананне рашэнняў XXV з'езда КПСС. **[Працяглыя апладысменты].**

У жыцці вашай рэспублікі шмат цікавага, шмат такога, да чаго было б карысна прыгледзецца таварышам з іншых рэспублік. Асабліва радуюць ініцыятывы, мэтанакіраванасць і настойлівасць, з якімі вырашаюцца пытанні эканамічнага і сацыяльнага развіцця.

Вялікай заслугай партыйнай арганізацыі Беларусі, яе працоўных калектываў з'яўляюцца ўстойлівыя, высокія тэмпы нарошчвання эканамічнага патэнцыялу. Вы паспяхова выканалі план дзевятай пяцігодкі. А за першыя 2 гады дзесятай пяцігодкі аб'ём прамысловай вытворчасці вырас на 16,2 працэнта супраць 13,9 працэнта па плану. На 590 мільёнаў рублёў выпушчана звышпланавай прадукцыі. Ну, што тут скажаш? Добра працуеце. Так трымаць! **[Бурныя апладысменты].**

Прыкметныя поспехі дасягнуты ў Беларусі і ў развіцці сельскай гаспадаркі. Быў час, калі беларускія землі лічыліся неўрадлівымі. 7—8 цэнтнераў збожжа з гектара былі амаль што гранічным ураджаем. А што цяпер? Сярэднегадавая ўраджайнасць збожжавых у дзевятай пяцігодцы склала 21,3 цэнтнера, а за мінулыя два гады — ужо 25 цэнтнераў з гектара. Вось што робіць сучасная агратэхніка. Вось што значаць гаспадарлівыя, разумныя адносіны да зямлі. **[Апладысменты].**

Важна, каб не толькі сельскія працаўнікі, але і ўсе, хто пастаўляе вёсцы трактары, камбайны, іншыя машыны, мінеральныя ўгнаенні, хто вядзе меліярацыйныя работы, памнажалі свае намаганні ў барацьбе за далейшае павелічэнне вытворчасці сельскагаспадарчых прадуктаў.

Таварышы! У 1979—1980 гадах усім нам трэба будзе працаваць вельмі напружана. Каб выканаць заданні пяцігодкі ў цэлым, трэба ў астатнія два гады значна павысіць тэмпы росту вытворчасці, прадукцыйнасць працы, палепшыць многія іншыя паказчыкі.

Важнейшай задачай, якую паставіла партыя, з'яўляецца павышэнне эфектыўнасці вытворчасці. На яе вырашэнне мы мабілізуем усе калектывы. У поўнай меры гэта адносіцца і да вас. Асаблівае значэнне ў сувязі з гэтым мае ўсямернае ўзмацненне рэжыму эканоміі, умацаванне гаспадарчага разліку ва ўсіх звеннях і, перш за ўсё, строгае, няўхільнае захаванне планавай дысцыпліны.

Што значыць захоўваць планавую дысцыпліну?

Гэта значыць своечасова, ва ўстаноўленыя тэрміны распрацаваць план і забяспечыць добрую ўвязку, збалансаванасць заданняў па ўсіх паказчыках, звеннях гаспадаркі і рэспубліках.

Гэта значыць безумоўна выконваць прадугледжаныя планам заданні па ўсіх без выключэння паказчыках. Нярэдка ў нас планавыя паказчыкі як бы падзяляюць на «асноўныя» і «другарадныя». Імкнуцца выканаць план па «асноўных» і бесклапотна адносяцца да нябыта «другарадных». Гэта недапушчальна. План павінен лічыцца выкананым, толькі калі выкананы заданні па ўсіх зацверджаных паказчыках.

Захоўваць планавую дысцыпліну — значыць таксама ўстанавіць дзелавы, штодзённы кантроль за ходам выканання планаў, строга патрабаваць з парушальнікаў планавай дысцыпліны.

Абстаноўка, змяненне аб'ектыўных умоў могуць патрабаваць унясення некаторых карэкціровак у планавыя заданні. Гэта зразумела і непазбежна. Але бываюць карэкціроўкі, якія зусім не выклікаюцца аб'ектыўнай неабходнасцю, прызначаны аблегчыць жыццё сямутаму з нашых гаспадарнікаў. Яны як бы ўзаконьваюць адхіленне планавых паказчыкаў у горшы бок.

Такія «папраўкі» да плана часта з'яўляюцца вынікам неарганізаванасці і бяздзейнасці асобных работнікаў. У выніку план страчвае сваю мабілізуючую сілу, ператвараецца ў шырму, якая прыкрывае недахопы ў рабоце.

А кіраўнікі вышэйстаячых арганізацый, калі яны ідуць на ўступкі аматарам «аблегчаных» планаў, праяўляюць беспрынцыповасць і мяккацеласць. Такія фокусы з планам павінны атрымліваць прынцыповую партыйную ацэнку. Нам не патрэбна падазроная дабрата за кошт дзяржавы.

Я так востра стаўлю тут пытанне аб захаванні планавай дысцыпліны не таму, што іменна ў Мінску, у Беларусі справы ідуць дрэнна. Тут у вас хутчэй станоўчы вопыт. Мне расказвалі, што на вашых прадпрыемствах усё радзей і радзей назіраюцца факты парушэнняў планавай дысцыпліны. Гэта вынік вялікай партыйна-арганізацыйнай і ідэйна-выхаваўчай работы партыйных арганізацый. Добра было б гэты вопыт замацаваць і паўсюдна пашырыць. **[Апладысменты].**

Поспехі Беларусі на ўсіх участках эканамічнага і сацыяльнага будаўніцтва несумненныя. Але, па заслугах ацэньваючы зробленае, мы, камуністы, бачым нявырашаныя пытанні.

Не магу не сказаць аб тым, што ў вашай рэспубліцы, у тым ліку і ў Мінску, на жаль, ёсць яшчэ адстаючыя прадпрыемствы, будаўнічыя арганізацыі. На многіх заводах і фабрыках рэспублікі марудна расце фондаддача. Нямала фактаў перарасходу металу, сыравіны, паліва і электраэнергіі. Нізкім застаецца каэфіцыент зменнасці работы абсталявання.

Гэты пералік можна было б прадоўжыць. Але вы, зразумела, лепш за мяне ведаеце, якія ў вас недахопы і якія яшчэ велізарныя рэзервы не прыведзены ў дзеянне. Справа гонару партыйных арганізацый узняць усіх працаўнікоў горада і вёскі на ўсямернае выкарыстанне гэтых рэзерваў.

Цэнтральны Камітэт КПСС мае права спадзявацца, што камуністы і ўсе працоўныя Беларусі, захоўваючы ўпэўнены, устойлівы рытм паступальнага руху рэспублікі, здолеюць паспяхова выканаць заданні дзесятай пяцігодкі і выйсці на новыя рубяжы эканамічнага і сацыяльнага прагрэсу. **[Апладысменты].**

Таварышы!

Тут, на беларускай зямлі, над якой трагічнай перасцярогай гучаць званы Хатыні, асабліва выразна адчуваеш, наколькі важная настойлівая барацьба за мір, якую вядзе Савецкі Саюз, барацьба за тое, каб не даць загарэцца пажару новай сусветнай вайны.

Цяпер у Нью-Йорку заканчваецца спецыяльная сесія Генеральнай Асамблеі ААН па раззбраенню. Яна яшчэ раз пацвердзіла найглыбейшую зацікаўленасць усяго чалавецтва ў спыненні гонкі ўзбраенняў. На карысць раззбраення выказалася пераважная большасць членаў ААН.

Савецкі Саюз і іншыя сацыялістычныя краіны ўнеслі на сесіі шырокую, смелую і ў той жа час рэалістычную праграму поўнага спынення гонкі ўзбраенняў. Іх прапановы былі ў цэнтры дзелавой дыскусіі на Асамблеі.

Сесія паказала таксама, што кіраўнікі раду вядучых краін НАТО, і перш за ўсё ЗША, яўна не жадаюць праявіць канструктыўны падыход да вырашэння задач раззбраення. Як інакш расцаніць правядзенне сесіі савета НАТО ў Вашынгтоне, дзе была прынята новая доўгатэрміновая праграма ўзбраенняў, у той час як у Нью-Йорку на спецыяльнай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН абмяркоўвалася прама процілеглае—як спыніць гонку ўзбраенняў, ажыццявіць раззбраенне? Ці ж гэта не грэбаванне надзённымі клопатамі і спадзяваннямі мілалюбівых народаў?

Атрымліваецца так: у Вашынгтоне краінамі НАТО робіцца «рэальная палітыка», а ў Нью-Йорку яны, выходзіць, удзельнічалі ў дыскусіях для адводу вачэй, каб не падвергнуцца справядлівай крытыцы і асуджэнню.

Ва унісон з гэтай пазіцыяй выступаюць пекінскія кіраўнікі. Падобна, што іх прадстаўнік проста пераблытаў трыбуны. Яму б з яго ваяўнічай прамовай выступаць не ў ААН, а на сесіі блоку НАТО.

Дарэчы, такая лінія Пекіна па заслугах ацэньваецца ў Вашынгтоне. У апошні час у ЗША робяцца, прычым на высокім узроўні і ў даволі цынічнай форме, спробы разыграць «кітайскую карту» супраць СССР. Блізарукая і небяспечная палітыка! Як бы яе аўтарам не давялося ў ёй горка раскаяцца.

Таварыш Л. І. Брэжнеў прымацоўвае ордэн Леніна і медаль «Залатая Зорка» да сцяга горада-героя Мінска.

Фота М. Амельчанкі і Л. Папковіча.

Сесія Генеральнай Асамблеі заканчваецца. Але ўзнятыя на ёй ідэі і прапановы будуць, несумненна, і далей жыць, будуць аказваць сваё ўздзеянне. Барацьба за рэальныя справы ў галіне спынення гонкі ўзбраенняў, у галіне раззбраення працягваецца і павінна быць узмоцнена. **[Працяглыя апладысменты].**

Адзін з важнейшых напрамкаў у гэтай галіне — венскія перагаворы па абмежаванню ўзброеных сіл і ўзбраенняў у Цэнтральнай Еўропе. Не раз даводзілася мне гаварыць аб гэтай праблеме і, па праўдзе сказаць, з цяжкім пачуццём. Сапраўды, пачаўся пятнаццаты раунд перагавораў, ідуць яны ўжо амаль пяць гадоў, але практычных вынікаў пакуль што няма. А пытанне ж не дробязнае, крайне важнае для Еўропы, ды і для ўсёй міжнароднай абстаноўкі.

Усебакова абдумаўшы ўзнікшае становішча, сацыялістычныя краіны пайшлі на новы, важны крок для таго, каб вывесці, нарэшце, венскія перагаворы з тупіка. Нашы краіны ўнеслі ў Вене новыя шырокія і канкрэтныя прапановы, якія ўлічваюць увесь немалы вопыт гэтых перагавораў.

Што галоўнае ў іх?

Па-першае, гэта зусім ясныя і дакладныя прапановы. У іх названы канкрэтныя лічбы падлягаючых вываду на першым этапе савецкіх і амерыканскіх войск. І лічбы гэтыя маштабныя. СССР, са свайго боку, гатоў вывесці на працягу года ў цэлым тры дывізіі з адпаведнай ваеннай тэхнікай, уключаючы прыкладна тысячу танкаў.

Па-другое, скарачэнне ўзброеных сіл краін НАТО і Варшаўскага Дагавора мяркуецца правесці так, каб захавалася іх раўнавага або, як гавораць, парытэт. У выніку скарачэння войск усіх краін для кожнай з груповак у Цэнтральнай Еўропе прапануецца ўстанавіць аднолькавы агульны паталок.

Дарэчы, сама ідэя такога паталка адпавядае таму, што прапаноўвалі заходнія краіны. Хоць, зразумела, мы цвёрда лічым, што ніхто з удзельнікаў перагавораў не мае права, хаваючыся за чужымі спінамі, ухіляцца ад скарачэння, а тым больш павялічваць свае ўзбраенні за кошт скарачэння іншых.

Сацыялістычныя краіны прапануюць сваім партнёрам разумны, рэалістычны кампраміс. Уносячы сваю прапанову, яны прайшлі нават больш, чым сваю палавіну шляху. Мы звяртаемся да краін НАТО: давайце ж, нарэшце, пяройдзем да справы. База для пагаднення, безумоўна, ужо ёсць. Усё цяпер залежыць ад палітычнай волі Захаду.

Дасягненне дагаворанасці ў Вене дало б магчымасць у далейшым перайсці да абмеркавання і іншых канкрэтных пытанняў ваеннай разрадкі ў Еўропе, якія цікавяць бакі.

Аздараўленне палітычнага клімату ў Еўропе — адна з самых важных мірных заваёў апошняга дзесяцігоддзя. Асабліва выразна можна было адчуць гэта ў час нядаўняга нашага візіту ў ФРГ.

Наўрад ці можна знайсці краіну ў Еўропе, на шляху наладжвання ўзаемаадносін з якой было б столькі перашкод — і аб'ектыўных, і суб'ектыўных, — дзе кожны крок быў бы такім складаным. І, аднак, сёння адносіны паміж СССР і ФРГ,—не закрываючы вочы на негатыўныя моманты,—сталі адным з важных элементаў стабільнасці ў Еўропе, разрадкі на еўрапейскім кантыненце.

Вялікі шлях развіцця адносін пройдзены Савецкім Саюзам і Францыяй; добра развіваюцца нашы сувязі па ўсіх лініях з Італіяй, Швецыяй, Аўстрыяй, не гаворачы ўжо аб нашай суседцы — дружалюбнай Фінляндыі.

Рэальным укладам у развіццё мірнага супрацоўніцтва паміж краінамі — удзельніцамі агульнаеўрапейскай нарады стаў візіт у Савецкі Саюз прэм'ер-міністра Турцыі пана Эджэвіта. Перагаворы з ім і падпісанне палітычнага дакумента аб прынцыпах добрасуседскага і дружалюбнага супрацоўніцтва паміж СССР і Турцыяй — гэта важны этап у развіцці нашых адносін па шляху, намечанаму ў свой час Леніным і Атацюркам.

Наогул я згодны са словамі федэральнага канцлера Шміта, які заявіў нядаўна з трыбуны Генеральнай Асамблеі, што ў Еўропе цяпер значна больш узаемнага давер'я, чым калі-небудзь за мінулыя дзесяцігоддзі.

Але гэты агульны набытак міралюбівых дзяржаў Еўропы трэба пастаянна падтрымліваць, умацоўваць, расшыраць. Асабліва гэта важна цяпер, калі міжнародная абстаноўка зноў абвастраецца. Іменна Еўропа можа на практыцы паказаць, як трэба суіснаваць, супрацоўнічаць, сумесна працаваць.

Барацьба за трывалы мір — гэта справа не толькі ўрадаў, але і народаў. Яшчэ ў сярэдзіне мінулага стагоддзя Карл Маркс звярнуўся да рабочага класа з заклікам авалодваць тайнамі міжнароднай палітыкі, актыўна змагацца за мір паміж народамі. Гэта ідэя жыве ў свядомасці і справах шырокіх рабочых мас і іх палітычнага авангарда.

Жыццёвыя інтарэсы працоўных усіх краін патрабуюць не дазволіць перакрэсліць усё добрае, што было зроблена за апошнія гады на сусветнай арэне, рухацца далей—да сапраўды трывалага міру для ўсіх народаў. Аб'яднанымі намаганнямі

(Заканчэнне на стар. 4).

ПОСТУП ТЫДНЯ

Урачыстае пасяджэнне, прысвечанае ўручэнню гораду-герою ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка»

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 2).

мі ўсіх міралюбівых сіл гэта мэта можа быць — і, мы верым, — будзе дасягнута. **(Працяглыя апладысменты).**

Таварышы! Вельмі важнай састаўной часткай міжнароднага жыцця стала ў нашу эпоху мацнеючае супрацоўніцтва народаў брацкіх сацыялістычных краін.

Савецкая Беларусь — актыўны будаўнік выдатных і трывалых мастоў дружбы, перакінутых цераз воды Буга, цераз граніцы Савецкага Саюза з іншымі сацыялістычнымі краінамі. Удзел вашых прадпрыемстваў у міжнароднай сацыялістычнай інтэграцыі, вашы важыўленыя сяброўскія сувязі з ваяводствамі Польшчы, абласцямі ЧССР, акругамі ГДР і Балгарыі, з іншымі сацыялістычнымі краінамі — перакананўчае пацвярджэнне гэтаму. **(Апладысменты).**

Яркім сімвалам новага ўзроўню супрацоўніцтва краін сацыялізму становяцца палёты інтэрнацыянальных касмічных экіпажаў. Нядаўна мы віншавалі першага касманаўта сацыялістычнай Чэхаславакіі. Наперадзе сумесныя палёты з прадстаўнікамі іншых краін сацыялізму. Пажадаем жа героям космасу вялікіх поспехаў. Яны сапраўды высока нясуць над зямлёй сцяг сацыялізму, міру і дружбы народаў! **(Бурныя апладысменты).**

У заключэнне, дарагія мінчане, мне хацелася б сказаць вам, што я адчуваю вялікае задавальненне ад новай сустрэчы з вашым цудоўным горадам, з яго выдатнымі людзьмі. **(Працяглыя апладысменты).**

Дазвольце цяпер зачытаць Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Аб прысваенні гораду Мінску ганаровага звання «Горад-герой».

(Таварыш Л. І. Брэжнеў зачытвае Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, які ўдзельнікі пасяджэння сустракаюць бурнымі працяглымі апладысментамі).

Дазвольце па даручэнню Цэнтральнага Камітэта КПСС і Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР уручыць гораду Мінску высокую ўзнагароду.

(У зале зноў грыміць доўга не змаўкаючая авацыя, калі Леанід Ільіч Брэжнеў прымацоўвае да сцяга горада-героя Мінска ордэн Леніна і медаль «Залатая Зорка». Ён сардэчна віншуе кіраўнікоў Беларусі і Мінска, ветэранаў вайны, прадстаўнікоў працоўных).

Дарагія таварышы! Яшчэ раз сардэчна віншую вас і жадаю ўсім прысутным у гэтай зале, усім працоўным Мінска і Савецкай Беларусі вялікіх творчых поспехаў у барацьбе за ажыццяўленне рашэнняў XXV з'езда КПСС, заданняў дзесятай пяцігодкі, а таксама асабістага дабрабыту і шчасця. **(Бурныя апладысменты).**

Слава гораду-герою Мінску! **(Бурныя, працяглыя апладысменты).**

Таварыш Л. І. Брэжнеў перадаў у дар жыхарам горада-героя Мінска памятны падарунак—карціну «Красная плошча». Гэта—работа вядомага савецкага мастака А. Кітаева. У перакананўчых і яркіх вобразах карціна перадае дух непарушнай дружбы народаў нашай краіны, іх вернасць ідэалам камунізму і міру на зямлі.

У зале зноў успыхваюць апладысменты, якія пераходзяць у авацыі. Піянеры ўручаюць Л. І. Брэжневу, Д. Ф. Усцінаву, П. М. Машэраву, іншым членам прэзідыума кветкі.

На трыбуне—першы сакратар Мінскага гаркома партыі Г. Г. Барташэвіч. Ён сказаў:

— З пачуццём гордасці за нашу вялікую сацыялістычную Радзіму, з душэўнай падзякай Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і яе ленінскаму Цэнтральнаму Камітэту мы выслухалі яркую і ўражальную прамову Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыша Леаніда Ільіча Брэжнева.

Расказаўшы пра поспехі працоўных Мінска, якія за кароткі час ліквідавалі апусташальныя вынікі вайны і дамагліся небывалага пад'ёму эканомікі, культуры і дабрабыту, Г. Г. Барташэвіч запэўніў, што мінчане з новым прылівам творчай энергіі і аптымізму яшчэ вышэй падымуць сцяг сацыялістычнага спаборніцтва, азнаменуюць кожны працоўны дзень дзесятай пяцігодкі натхнёнай працай, павышэннем якасці работы.

Выступае маршал бранятанкавых войск, Герой Савецкага Саюза **А. А. Лосік.** Воіны-ветэраны Узброеных Сіл СССР, сказаў ён, падзяляючы разам з мінчанамі вялікую радасць у сувязі з ўручэннем гораду высокай узнагароды, зноў і зноў звяртаюцца да багатых і слаўных рэвалюцыйных, працоўных і баявых традыцый сталіцы Савецкай Беларусі. Беларускі народ па праву можа ганарыцца сваім укладам у справу Перамогі над фашысцкай Германіяй.

Слова атрымлівае ганаровы грамадзянін Мінска, Герой Савецкага Саюза **М. Б. Осіпава.**

Ад імя ветэранаў вайны, былых партызан і падпольшчыкаў, усіх, хто са зброяй у руках каваў вялікую Перамогу, яна запэўніла ленінскі Цэнтральны Камітэт КПСС, Леаніда Ільіча Брэжнева, што ўвесь свой жыццёвы вопыт і веды ветэраны аддадуць высакароднай справе выхавання падрастаючага пакалення, пабудовы камунізму ў нашай краіне.

Кожнае судакрананне з гераічным мінулым нашага народа напамінае боль страт, але і ўмацоўвае жаданне міру. І мы прымаем сёння зорку Героя як найвышэйшую ацэнку мужнага подзвігу мінчан у гады вайны і як баявы наказ партыі ўмацоўваць магутнасць Краіны Саветаў выдатнымі вынікамі мірнай працы, заявіў слесар-лякальшчык Мінскага трактарнага завода, Герой Сацыялістычнай Працы **Я. І. Клімчанка.** Рабочыя, калгаснікі, служачыя, усе савецкія людзі пастаянна адчуваюць, што ў нашай Камуністычнай партыі, у Савецкага ўрада няма большых клопатаў, чым клопатаў аб чалавеку працы, яго матэрыяльным і духоўным дабрабыце.

У сэрцах і справах маладых будаўнікоў камунізму захаваецца вернасць запаветам бацькоў, сказала, выступаючы ад імя моладзі, студэнтка Беларускага дзяржаўнага універсітэта **Зінаіда Мельнік.** Мы жывём у цудоўны час. Перад юнакамі і дзяўчатамі новая Канстытуцыя СССР адкрыла велічныя гарызонты стварэння—ад штодзённай, настойлівай і мэтанакіраванай работы ля станка да небывалых па сваіх маштабах ударных камсамольскіх будоўляў, да глабальных касмічных даследаванняў. Нам створаны ўсе ўмовы для творчай працы, шырокага праяўлення здольнасцей і талентаў, для авалодання вышынямі навукі і культуры.

Цёпла сустрэты прысутнымі, на ўрачыстым пасяджэнні выступіў кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі **П. М. Машэраў.**

Усіх нас невыказна радуе і натхняе, што вышэйшыя ўзнагароды Айчыны ўручыў гораду-герою Генеральны сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, выдатны палітычны і дзяржаўны дзеяч сучаснасці Леанід Ільіч Брэжнеў **(апладысменты),** чалавек непахіснай волі, бясстрашны камісар Вялікай Айчыннай вайны, які сам прайшоў яе вогненнымі дарогамі ад першых выпрабаванняў да параду Перамогі, здабыў высокі аўтарытэт і павагу сярод усіх сумленных людзей планеты сваёй нястомнай барацьбой за перадавыя ідэалы чалавецтва, за трывалы мір і сацыяльны прагрэс, заявіў ён пад бурныя, працяглыя апладысменты ўдзельнікаў урачыстага пасяджэння.

У сэрцах нашых людзей ніколі не згасне палымянае пачуццё бязмежнай падзякі воінам доблеснай Савецкай Арміі—вызваліцелям Беларусі, усім народам сацыялістычнай Радзімы і перш за ўсё вялікаму рускаму народу за зноў набытае намі шчасце жыць, працаваць і ствараць у адзінай, дружнай савецкай сям'і, з годнасцю і ўпэўненасцю глядзець у заўтрашні дзень.

Усе мы, працягваў прамоўца, зведваем шчырыя пачуцці сардэчнай удзячнасці за Вашы такія цёплыя, сапраўды чулыя, да глыбіні душы хвалюючыя словы аб беларускім народзе, яго працоўнай стараннасці і духоўна-маральным абліччы, аб нашым скромным вопыце, набытым на рубяжах практычнага ажыццяўлення задач пяцігодкі. Усё гэта нас натхняе і вельмі да многага абавязвае.

З поўным разуменнем і вялікай адказнасцю мы ўспрымаем пастаўленыя Вамі ў прамове і на прайшоўшай сёння ў ЦК КПБ гутарцы выключна важныя пытанні, выказаныя заўвагі па недахопах у нашай практычнаў дзейнасці, дадзеныя Вамі канкрэтныя ўстаноўкі і рэкамендацыі, якія дазваляюць ясней убачыць і глыбей асэнсаваць стаячыя перад намі актуальныя праблемы ў сацыяльна-эканамічным развіцці рэспублікі.

П. М. Машэраў расказаў аб барацьбе партыйнай арганізацыі, працоўных Беларусі за дасягненне больш высокай эфектыўнасці грамадскай вытворчасці, за выкананне рашэнняў XXV з'езда КПСС.

Працоўныя Савецкай Беларусі, як і ўсёй краіны, глыбока ўдзячны Вам, дарагі Леанід Ільіч, за Вашу тытанічную работу ў імя працвітання Радзімы, за Ваш велізарны ўклад у высакародную справу ўмацавання міру на нашай планеце. Яны заканамерна звязваюць з Вашым імем, з Вашай дзейнасцю выдатныя перамогі Савецкай дзяржавы ў галіне знешняй палітыкі, няўхільны рост міжнароднага аўтарытэту і ўплыву Савецкага Саюза.

П. М. Машэраў запэўніў ленінскі Цэнтральны Камітэт КПСС, яго Палітбюро, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР, асабіста Леаніда Ільіча Брэжнева ў тым, што рабочы клас, калгаснае сялянства, інтэлігенцыя Беларусі будуць і надалей высока несці сцяг вялікага Леніна, свята захоўваць і выконваць вялікія ленінскія запаветы, з яшчэ большай настойлівасцю памнажаць магутнасць і славу нашай Сацыялістычнай Айчыны, змагацца за поўную перамогу ідэалаў камунізму.

У адрас урачыстага пасяджэння паступілі прывітальныя тэлеграмы, пісьмы і рапарты працоўных перамог. Ад імя ўсіх удзельнікаў старшынствуючы горача падзякаваў іх аўтарам за цёплыя сардэчныя словы, якія выказаны ў адрас працоўных горада-героя Мінска, усіх, хто вызваляў і аднаўляў яго, хто цяпер сваёй самаадданай працай прымнажае слаўныя традыцыі мінчан, усяго вялікага савецкага народа.

З вялікім уздымам удзельнікі ўрачыстага пасяджэння прынялі прывітальнае пісьмо Цэнтральнаму Камітэту КПСС, Прэзідыуму Вярхоўнага Савета СССР, Генеральнаму сакратару ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварышу Л. І. Брэжневу.

Урачыстае пасяджэнне аб'яўляецца закрытым. Выконваюцца дзяржаўныя гімны СССР і БССР.

У зале зноў гучаць здравіцы ў гонар Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Савецкага ўрада, вялікага савецкага народа—будаўніка камунізму.

●

Затым адбыўся святочны канцэрт майстроў мастацтваў, які прайшоў з вялікім поспехам.

БЕЛТА.

РАЗАМ!

Да ўсіх шматлікіх вызначэнняў нашай любай Беларусі—індустрыяльная, калгасная, навуковая і гэтак далей, і гэтак далей — апошнім часам вельмі ж хораша дастасоўваецца яшчэ адно—Беларусь касмічная. І адразу два нашы славутыя землякі—двойчы Герой Савецкага Саюза Пятро Клімук і лётчык-касманаўт СССР Уладзімір Кавалёнак, якія разам са сваімі сябрамі дружна працуюць на касмічнай арбіце, — які гэта хвалюючы і незабыўны падарунак шасцідзесяцігадоваму юбілею нашай роднай рэспублікі і Камуністычнай партыі Беларусі! Камандзіры касмічных караблёў — вось куды мы, беларусы, сягнулі за гады Савецкай улады!

Уладзімір Кавалёнак і Аляксандр Іванчанкаў з «Саюза-29», Пятро Клімук і Міраслаў Германшэўскі з «Саюза-30», рускі, паляк і беларусы—слаўныя прадстаўнікі народаў-братоў, народаў-суседзяў, руская, беларуская і польская мовы, якія ў злагадзе гучаць на касмічнай арбіце, — які гэта цудоўны міжнародны экіпаж, якая дружная інтэрнацыянальная экспедыцыя! Гэта нібы яскравы прыклад да слоў пра сціпласць і глыбокі інтэрнацыяналізм беларускага народа, якія прагучалі падчас урачыстасцей з нагоды ўручэння Мінску зоркі Героя.

Шчыра радуюся, што і мой народ разам з іншымі народамі-братамі ўносіць вагомы ўклад у здзяйсненне даўняй мары нашых продкаў — асваенне і абжыванне касмічнай прасторы.

Янка СІПАКОЎ.

ВІНШУЕМ!

За заслугі ў развіцці беларускай савецкай літаратуры і актыўны ўдзел у культурна-асветніцкай рабоце сярод працоўных Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР прысвоіў загадчыцы рэдакцыі выдавецтва «Мастацкая літаратура», пісьменніцы ВАСІЛЕВІЧ Алене Сямёнаўне і пісьменніку МІРОНАВУ Аляксандру Яўгенавічу ганаровыя званні заслужанага работніка культуры Беларускай ССР.

●

За шматгадовую плённую работу ў галіне літаратурнай крытыкі і ў сувязі з сямідзесяцігоддзем з дня нараджэння Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў тав. МАЙХРОВІЧА Сцяпана Казіміравіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

●

За шматгадовую плённую работу ў галіне выяўленчага мастацтва і ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў заслужанага дзеяча мастацтваў Беларускай ССР мастака ВАШЧАНКУ Гаўрыла Харытонавіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

●

За шматгадовую работу ў галіне музычнага мастацтва, актыўны ўдзел у камуністычным выхаванні працоўных і ў сувязі з сямідзесяцігоддзем з дня нараджэння Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў самадзейнага кампазітара, заслужанага работніка культуры Беларускай ССР ШЫДЛОЎСКАГА Паўла Іванавіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

ВЯЛІКІЯ ЗАДАЧЫ САВЕЦКАЙ ШКОЛЫ

У Маскве працягвае работу Усесаюзны з'езд савецкіх настаўнікаў, які ўрачыста адкрыўся 28 чэрвеня ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў. Шматмільённы атрад педагогаў прадстаўлены амаль чатырма тысячамі дэлегатаў ад усіх рэспублік, краёў і абласцей краіны.

Разам з настаўнікамі ў рабоце з'езда прымаюць удзел партыйныя і савецкія работнікі, кіраўнікі прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, дзеячы навукі і культуры, прадстаўнікі грамадскасці, госці з братніх краін сацыялізму.

У цэнтры ўвагі прысутных—задачы органаў народнай асветы і школ па выкананню рашэнняў XXV з'езда КПСС, пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым удасканаленні навучання, выхавання вучняў агульнаадукацыйных школ і падрыхтоўкі іх да працы».

Бурнымі, працяглымі апладысментамі сустрэлі прысутныя таварышаў Л. І. Брэжнева, Ю. У. Андропава, В. В. Грышына, А. А. Грамыку, А. П. Кірыленку, Ф. Д. Куланова, М. А. Суслава, Д. Ф. Усцінава, П. Н. Дзямічава, В. В. Кузняцова, Б. М. Панамарова, М. С. Саломенцава, К. У. Чарненку, І. В. Капітонава, У. І. Далгіх, М. В. Зімяніна, Я. П. Рабава, К. В. Русакова.

З вялікім натхненнем дэлегаты і госці з'езда выбралі ганаровы прэзідыум у складзе Палітбюро ЦК КПСС на чале з таварышам Л. І. Брэжневым.

Пад працяглыя апладысменты член Палітбюро ЦК КПСС, сакратар ЦК КПСС М. А. Суслаў зачытаў прывітанне Цэнтральнага Камітэта КПСС, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР і Савета Міністраў СССР Усесаюзнаму з'езду настаўнікаў.

Ад імя ЦК КПСС, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, Савета Міністраў СССР і асабіста ад Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыша Л. І. Брэжнева М. А. Суслаў горача і сардэчна павіншаваў і вітаў таварышаў, удастоеных высокага звання Героя Сацыялістычнай Працы, а таксама ўзнагароджаных ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза.

З дакладам выступіў міністр асветы СССР М. А. Пранофʼеў.

На з'ездзе ідзе абмеркаванне задач органаў народнай асветы і школ на сучасным этапе нашага жыцця.

ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

Як паведамлялася ўжо, 14—15 чэрвеня ў Доме літаратара праходзіў чарговы пленум праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, які быў прысвечаны праблемам развіцця беларускай дзіцячай літаратуры.

Уступным словам пленум адкрыў старшыня праўлення М. ТАНК.

З дакладам «Беларуская літаратура для дзяцей і юнацтва, яе стан і задачы ў святле рашэнняў XXV з'езда КПСС, пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па дальшым развіцці савецкай дзіцячай літаратуры» (1974) і пастаноў ЦК КПСС аб агульнаадукацыйнай школе» выступіў сакратар праўлення Б. САЧАНКА.

Сад лады зрабілі: аб прозе для дзяцей і юнацтва на сучасным этапе — старшыня бюро секцыі дзіцячай і юнацкай літаратуры П. КАВАЛЕЎ, аб паэзіі для дзяцей і юнацтва на сучасным этапе — галоўны рэдактар часопіса «Бярозка» В. ЗУЕНАК.

У абмеркаванні дакладаў прынялі ўдзел А. ЯКІМОВІЧ, міністр асветы БССР М. Г. МІНКЕВІЧ, В. ВОЛЬСКІ, старшыня Дзяржкамвыда БССР М. І. ДЗЯЛЕЦ, А. ВАСІЛЕВІЧ, Д. РАЗГОН (Масква), другі сакратар ЦК ЛКСМБ Л. М. БАЛОШКА, намеснік міністра ўнутраных спраў БССР П. С. ЖУК, рэктар Мазырскага педагагічнага інстытута М. ДЗМІТРЫЕЎ, А. ГРАЧАНІКАЎ, А. МАРЦІНОВІЧ, Р. ШКРАБА, намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па тэлебачанню і радыёвяшчанню М. А. СУША, Н. ГІЛЕВІЧ, У. ВЕРАМЕЙЧЫК, інспектар па справах непаўналетніх аддзела ўнутраных спраў Баранавіцкага гарвыканкома А. КРОЛІКАВА, А. ЛОЙКА, М. ПАСЛЯДОВІЧ, В. АУРЫЛА (Літва), мастак У. БАСАЛЫГА, П. МІСЬКО, М. БАРСТОК, С. МАРЧАНКА, М. ГЕРЧЫК, кандыдат філалагічных навук М. ЯФІМАВА, А. КАРПЮК, І. ШАМЯКІН.

Пленум вырашыў арганізацыйнае пытанне: у склад прэзідыума ўведзены А. Грачанікаў, М. Калачынскі і А. Кудравец.

У рабоце пленума прымалі ўдзел загадчык аддзела культуры ЦК КПБ А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ, міністр асветы БССР М. Г. МІНКЕВІЧ, міністр культуры БССР Ю. М. МІХНЕВІЧ, старшыня Дзяржкамвыда БССР М. І. ДЗЯЛЕЦ, другі сакратар ЦК ЛКСМБ Л. М. БАЛОШКА, прадстаўнікі Саюзаў пісьменнікаў СССР, РСФСР і Літоўскай ССР, саюзных і рэспубліканскіх выдавецтваў, навуковай і педагагічнай грамадскасці.

Сёння ў нумары — матэрыялы, прысвечаныя пленуму.

УСЕНАРОДНАЯ, АГУЛЬНАДЗЯРЖАЎНАЯ СПРАВА

Уступнае слова М. ТАНКА

Пераможны поступ савецкага народа да вышынь камуністычнай цывілізацыі — гэта не толькі гістарычная бітва за эканамічны ўздым нашай Радзімы, за стварэнне і памнажэнне матэрыяльных каштоўнасцей, але і штодзённая барацьба за чалавека будучыні, за росквіт духоўных сіл грамадства. Справа выхавання новай маладой змены стала ў нас важнейшай усенароднай, агульнадзяржаўнай справай. У краіне развітога сацыялізму, дзе вышэйшай мэтай унутранай палітыкі Камуністычнай партыі з'яўляецца няўхільнае павышэнне дабрабыту і культурнага ўзроўню жыцця працоўных, дзе ў Вялікай Хартыі правоў — Новай Канстытуцыі СССР — значнае месца адводзіцца развіццю духоўнай культуры, усё больш узрастае роля літаратуры і мастацтва, якія закліканы сцвярджаць высокія камуністычныя ідэалы, спрыяць фарміраванню асобы чалавека з такімі якасцямі, як ідэйная перакананасць, партыйная мэтаімкнёнасць, інтэрнацыянальнае пачуццё дружбы і адказнасці не толькі за свае справы, але і за лёс краіны і ўсяго чалавецтва. Гэтую выхаваўчую місію заклікана выконваць уся наша літаратура, усе яе роды і жанры. Аднак асаблівае месца тут займаюць творы, якія адрасаваны юнаму чытачу. Літаратура для дзяцей і юнацтва валодае сілай выключнага эмацыянальнага ўздзеяння, бо яна імкнецца адкрыць і ўвасобіць свет тых, хто ўступае ў жыццё, хто фарміруе свой светапогляд і характар, хто ў пошуках свайго месца абапіраецца на тыя духоўныя і маральныя каштоўнасці, якія выпрацаваны папярэднімі пакаленнямі.

Гэта літаратура прывівае любоў да сваёй культуры, мовы, гісторыі нашай краіны, прагрэсіўных традыцый мінулага і народжанага новым сацыялістычным ладам у атмасферы ленінскай дружбы народаў. І таму гэта літаратура павінна быць сапраўды, без ніякіх скідак, высокаідэйнай і высокамастацкай. Бо калі недапушчальна абы-якім зерням засяваць поле, дык яшчэ больш клапатліва мы павінны падыходзіць да таго, якія зерні кідаем у чулыя сэрцы моладзі, як загартоўваем яе сілы, яе волю, гатоўнасць да барацьбы супраць розных жыццёвых нягод і выпрабаванняў. Мы павінны помніць, што гэта літаратура ў пару найбольшага ўспрымання акружаючага нас свету на ўсё жыццё пакідае свой след, памагае фарміраванню, станаўленню характару нашай маладой змены, выяўленню і развіццю яе прыроджаных здольнасцей.

У сваім выступленні на XVIII з'ездзе ВЛКСМ, гаворачы аб праблемах выхавання падрастаючага пакалення, Генеральны сакратар ЦК КПСС Леанід Ільіч Брэжнеў зазначыў: «Тут асабліва нецярпімы праяўленні бяздушнасці і фармалізму. Пара ўсім работнікам ідэалагічнага фронту пакончыць з нязжытай яшчэ сям-там практыкай механічнага, бяздумнага паўтарэння прапісных ісцін, са слоўнай траскатнёй. Пара зрабіць правілам — гаварыць з людзьмі простай і даходлівай мовай, пісаць, укладваючы ў кожную фразу жывую думку і пачуцці. Гэта таксама пытанне якасці і эфектыўнасці, прычым па такім важным участку будаўніцтва камунізму, як выхаванне новага чалавека».

Думаецца, гэтыя словы павінны стаць эстэтычнай праграмай для тых пісьменнікаў, хто прысвяціў свой талент стварэнню кніг для дзяцей і юнацтва. Наша літаратура для юных за апошнія гады дасягнула прыкметных здабыткаў ва ўсіх жанрах — у прозе, паэзіі, драматургіі. Многія творы беларускіх аўтараў упрыгожваюць паліцы дзіцячых бібліятэк — не толькі рэспублікі, але і ўсёй нашай краіны і нашых шматлікіх замежных сяброў. Працягваючы слаўныя традыцыі ўсёй нашай шматнацыянальнай савецкай літаратуры, традыцыі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Змітрака Бядулі, Янкі Маўра, сучасныя беларускія пісьменнікі ў сваіх творах для юнага чытача імкнуцца адкрываць складаны і багаты свет краіны маленства, непаўторнасць аблічча кожнага, хто выходзіць з яе, каб заняць сваё дастойнае месца ў шэрагах будаўнікоў камунізму. Разам з тым — чаго грахі ўтойваць — нідзе так не разлапушылася графаманства, як у літаратуры для дзяцей. Сярод кніг для дзяцей і юнацтва, на вялікі жаль, шмат сустракаецца рамесніцкіх падробак, твораў-аднадзёнак, аўтары якіх далёкія ад рэальнага жыцця сённяшняй юнай змены, ад усяго таго новага, што ўносіць у воблік будучых грамадзян нашай краіны сацыялістычная рэчаіснасць, эпоха навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Як вядома, гэта эпоха патрабуе больш глыбокага вывучэння жыцця моладзі, яе патрабаванняў, яе імкненняў і яшчэ большай сувязі з гуманітарнымі навукамі, каб не ўпасці ў вузкі тэхніцызм, каб не парушыць гарманічнага развіцця чалавека, а яшчэ шырэй адкрыць доступ моладзі да самастойнага жыцця і арыентацыі ва ўсіх складаных праблемах і пытаннях свайго часу.

І тут неабходна засяродзіць увагу на пашырэнні тэматычнага абсягу літаратуры для дзяцей і юнацтва. Яшчэ мала намі зроблена ў развіцці любімага моладдзю і папулярнага сярод яе прыгодніцкага жанру і нават той жа казкі, якая ўсё яшчэ не можа выйсці за традыцыйныя рамкі фальклору на прастор фантастычных дасягненняў сучаснай навукі і тэхнікі. Сёння нават праекціроўшчыкі цацак улічваюць гэта. Зайдзіце ў любы магазін дзіцячых цацак і вы пабачыце безліч розных машын, прыладаў, электравозаў, караблёў, экскаватараў, самалётаў, касмічных ракет, лунаходаў і герояў нашага часу, якімі ўжо больш, чым бабай Ягой, з яе ступай і памялом, цікавяцца нашы дзеці, наша моладзь.

Трэба б нам разам з кампазітарамі падумаць і над стварэннем новых песень для дзяцей. Жанр гэты, дзякуючы розным шматлікім ансамблям, фестывалям, перадачам тэлебачання, пласцінкам і магнітафонным запісам, стаў найбольш масавым і папулярным. Ці ж не аб гэтым гаворыць той факт, што першае, што прыносяць малышы з дзіцячага сада, са школы, дык гэта ў іх непаўторным выкананні песню.

Слушна гаварыў адзін канадскі эскімос: «Песня — гэта думка, праспяваная з дыханнем тады, калі людзі ўзрушаны вялікімі сіламі і калі звычайнай мовы не хапае».

Неабходна і нашай крытыцы не спыняцца толькі на інфармацыі ў кароткіх рэцэнзіях, а больш увагі ўдзяляць усебаковаму глыбокаму даследаванню дзіцячай літаратуры, якую пара разглядаць як самастойную, складаную і надзвычай важную галіну творчасці, дзе часта мяняюцца густы чытачоў. Дарэчы, мы мала цікавімся поглядамі гэтых чытачоў і іх ацэнкамі нашых кніг. А іх ацэнкі, як вядома, найбольш непасрэдныя і шчырыя. Мы часта кіруемся тым, што, на нашу думку, павінна падабацца дзецям, а гэта не заўсёды супадае з тым, што сапраўды ім падабаецца і што сапраўды іх цікавіць.

Я не гавару ўжо аб школьных падручніках па літаратуры, якія часта адстаюць ад жыцця і грашаць залішняй дыдактыкай. Ідэйны змест кожнага твора для дзяцей павінен быць у поўнай сугучнасці з яго высока-мастацкай формай. Ідэя твора, як нехта гаварыў, павінна быць, як вітаміны ў яблыку: іх не відаць, але яны знаходзяцца ў ім і робяць сваю карысную справу. Як бачым, наспела вострая патрэба сёння сур'ёзна пагаварыць аб надзённых праблемах развіцця літаратуры для дзяцей і юнацтва, усебакова абмеркаваць гэта важнейшае пытанне ў святле гістарычных рашэнняў XXV з'езда КПСС і вядомых пастаноў ЦК КПСС і мабілізаваць нашы ўсе намаганні і сілы для развіцця савецкай дзіцячай літаратуры.

Мы ўпэўнены, што пленум паслужыць далейшым стымулам у развіцці нашай літаратуры для дзяцей і юнацтва, і мы прыйдзем з новымі дасягненнямі да слаўнага 60-годдзя нашай рэспублікі і Камуністычнай партыі Беларусі.

БЛІЖЭЙ ДА ЖЫЦЦЯ, БЛІЖЭЙ ДА ПРАЎДЫ

З даклада Б. САЧАНКІ

Самае дарагое і неацэннае, што мы маем—гэта дзеці. Думаць, клапаціцца пра дзяцей—значыць дбаць пра наша заўтра. Пасеянае ў дзіцячых душах сёння, узыдзе і дасць плады — што ў гэтым, а што і ў новым, ужо XXI стагоддзі, якое жвельмі імкліва набліжаецца і ў якім не каму-небудзь, а ім, цяперашнім дзецям, жыць, развіваць эканоміку, культуру і навуку, памнажаць створанае на зямлі геніем і працай чалавека. Ад таго, як мы падрыхтуем і выхаваем дзяцей, залежыць наша будучыня. Вось чаму Камуністычная партыя і Савецкі ўрад выхаванне падрастаючага пакалення лічылі і лічаць адной з асноўных сваіх задач, заўсёды надавалі і надаюць яму пільную, неаслабную ўвагу, робяць усё магчымае, каб пакаленне юных расло духоўна багатым, фізічна загартаваным, беззапаветна адданым нашым вялікім гуманным ідэям. Рашэнні з'ездаў, пастановы ЦК роднай партыі, у тым ліку і «Аб мерах па далейшым развіцці савецкай дзіцячай літаратуры» (1969), «Аб рабоце з творчай моладдзю» (1976), апошнія пастановы аб агульнаадукацыйнай школе, прасякнуты менавіта гэтым шчырым, зацікаўленым і паўсядзённым ленінскім клопатам: усё лепшае дзецям!

На XXV з'ездзе КПСС пастаўлена задача якасна новага, комплекснага выхавання савецкіх людзей. Выхоўваць комплексна — гэта не забываць ні пра адну высакародную патрэбу душы юнай, ні пра адзін «выхаваўчы вітамін», што неабходны дзеля маральнай сілы і здароўя. «Найгалоўнейшымі клопатамі нашай школы павінна быць не столькі тое, кім будуць яе выхаванцы, але перш за ўсё — **якімі яны будуць**» — падкрэсліў ў сваёй яркай прамове на VI з'ездзе настаўнікаў рэспублікі кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў.

Безумоўна, у комплексным выхаванні чалавека-працаўніка, свядомага барацьбіта за ідэі і справы партыі, гарманічна развітай і ўсебакова падрыхтаванай асобы выключнае значэнне надаецца мастацкай літаратуры, асабліва цяпер, калі завершаны пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі, калі кніга даступна кожнаму, калі яна стала сапраўды настольнай, як хлеб.

Умець гаварыць з дзецьмі на іх мове пра вялікае і важнае,— а ў гэтым, паводле слоў А. Макаранкі, і ёсць спецыфіка літаратуры для дзяцей і юнацтва—талент рэдкі. У той жа час дзеці з вялікім захапленнем чытаюць і многія «дарослыя» кнігі, якія даўно ўвайшлі ў залаты фонд сусветнай літаратуры. Савецкая ж літаратура для дзяцей і юнацтва — з'ява прынцыпова новая ў гісторыі сусветнай культуры, яна вылучаецца высокімі эстэтычнымі якасцямі, маральнай чысцінёй, аптымізмам, верай у перамогу дабра і праўды, інтэрнацыяналізмам, гуманістычнай накіраванасцю. Упершыню ў свеце літаратура для дзяцей і юнацтва стала сапраўды народнай.

Неад'емная частка ўсёй савецкай шматнацыянальнай літаратуры — беларуская савецкая літаратура, у тым ліку і дзіцячая. Ля яе вытокаў стаялі Я. Купала, Я. Колас, З. Бядуля, М. Лынькоў, К. Крапіва, К. Чорны. Асабліва шмат зрабіў для яе развіцця Я. Маўр і А. Якімовіч. Плённа працавалі і працуюць В. Вольскі, В. Вітка, многа цікавых твораў пакінуў У. Дубоўка.

(Працяг на стар. 6).

У перапынку паміж пасяджэннямі пленума. Максім Танк і міністр асветы БССР М. Г. Мінкевіч.

(Працяг. Пачатак на стар. 5).

Наогул беларускай літаратуры для дзяцей і юнацтва шанцуе на таленты. За рэдкім выключэннем, амаль усе пісьменнікі рэспублікі, хто з большым, хто з меншым поспехам, пісалі і пішуць для юных чытачоў. Сярод іх такія прызнаныя майстры, як А. Куляшоў, М. Танк, П. Панчанка, П. Броўка, І. Шамякін...

Таленавіта працуюць над творамі для дзяцей М. Лужанін, К. Кірэенка, А. Астрэйка, М. Калачынскі. Некалькі цікавых кніжак для дзяцей малодшага і старэйшага ўзросту напісалі С. Грахоўскі, а таксама П. Пестрак, Э. Валасевіч, П. Прыходзька, А. Пысін; пісалі для дзяцей М. Машара, А. Бялевіч, У. Корбан. Прыкметнай з'явай ва ўсёй беларускай літаратуры стала паэма А. Вялюгіна «Вецер з Волгі». З зайздросным майстэрствам і талентам працавалі і працуюць такія вопытныя даследчыкі дзіцячай душы, як Э. Агняцвет, С. Шушкевіч, М. Хведаровіч, І. Муравейка, П. Прануза, М. Смагаровіч.

Шмат зрабіла ў літаратуры для дзяцей наступнае пакаленне паэтаў. Н. Гілевіч, А. Вольскі, А. Вярцінскі, Я. Сіпакоў, У. Караткевіч, Р. Барадулін, В. Зуёнак, Д. Бічэль-Загнетава, П. Макаль, А. Лойка, Е. Лось, Г. Бураўкін, А. Грачанікаў, М. Арочка, К. Цвірка, В. Вярба, У. Паўлаў, У. Ляпёшкін, В. Лукша — кожны з іх як дзіцячы пісьменнік заслугоўвае добрага слова, нават спецыяльнага даследавання.

За гэтым, цяпер ужо сярэднім пакаленнем, ідуць маладзейшыя і маладыя — В. Жуковіч, П. Марціновіч, Н. Тулупава, С. Законнікаў, В. Іпатава, М. Чарняўскі, В. Коўтун, Н. Галіноўская.

На жаль, лічыць Б. Сачанка, не ўсё добра ў нашай дзіцячай прозе, хоць падстаў для асаблівай трывогі да пэўнага часу не было. Для дзяцей пісалі Я. Брыль, А. Кулакоўскі, І. Шамякін, А. Рылько, У. Краўчанка, Т. Хадкевіч. Удала дэбютаваў у свой час П. Кавалёў. З нязменным поспехам працуе А. Васілевіч, свежа заявіў аб сабе ў аповесці «Вайна каля Цітавай копанкі» І. Навуменка. Па некалькі цікавых твораў для юнацтва напісалі А. Марціновіч, А. Асіпенка, У. Мехаў, Г. Васілеўская. У вопытных літаратараў, якія ўмеюць пісаць для дзяцей, выраслі В. Хомчанка, І. Сяркоў і П. Ткачоў. Даўно і стала працуюць А. Пальчэўскі, Я. Бяганская, М. Паслядовіч, В. Гарбук, П. Місько, У. Караткевіч, В. Зуб, І. Грамовіч, М. Ваданосаў, М. Даніленка, Л. Арабей, У. Шахавец, А. Шашкоў, А. Савіцкі, М. Гамолка, Г. Шыловіч, І. Сіняўскі, С. Міхальчук, К. Каліна, У. Юрэвіч, І. Аношкін, У. Мяжэвіч, Л. Прокша, П. Рунец, а таксама Х. Жычка, Д. Слаўковіч, А. Кобец-Філімонава, А. Капусцін, У. Шыцік.

Актыўна працуе ў Беларусі і вялікі атрад пісьменнікаў, якія пішуць па-руску — М. Кругавых, У. Машкоў, М. Герчык, Ю. Багушэвіч, В. Тарас, Г. Васюкова, М. Гарулёў, С. Масіяш, Т. Цулукідзе, І. Клаз, В. Марозаў, А. Міропаў, В. Рудаў, А. Авечкін, Р. Рэлес, а таксама І. Бурсаў і Э. Карпачоў.

Значныя здабыткі мае і беларуская драматургія для дзяцей і юнацтва. Акрамя п'ес В. Вольскага, І. Шамякіна, І. Козела, якія ідуць на сцэнах многіх тэатраў Савецкага Саюза, поспехам карыстаюцца сярод гледачоў і спектаклі па творах К. Губарэвіча, А. Вярцінскага, А. Махнача, П. Макаля, А. Вольскага, Б. Бур'яна, У. Мехава, В. Зуба, Я. Шабана.

Вядома, заўважае прамоўца, поспех развіцця драматургічных жанраў залежыць не толькі ад аўтараў, а і ад тэатраў, ад іх зацікаўленасці ў стварэнні арыгінальнага рэпертуару. У свой час добры прыклад работы з драматургамі даў тэатр юнага гледача. Удалай трэба лічыць і спробу тэатра лялек, які ў творчай садружнасці з паэтам А. Вярцінскім стварыў два спектаклі — «Дзякуй, вялікае дзякуй!» і «Скажы сваё імя, салдат», якія адзначаны, як, дарэчы, і пастаноўкі ў тэатры юнага гледача п'ес П. Макаля «Дай вады, калодзеж!» і «На ўсіх адна бяда», прэміямі Міністэрства культуры СССР і дыпломамі на ўсесаюзных фестывалях дзіцячых тэатраў.

Пэўныя поспехі ёсць і ў кінадраматургіі. Фільмы, знятыя па сцэнарыях К. Губарэвіча «Дзяўчынка шукае бацьку» і «Анюціна дарога», а таксама паводле аповесці «Міколка - паравоз» М. Лынькова заваявалі ўсесаюзны экран.

Самай пачэснай задачай і ганаровым абавязкам беларускія пісьменнікі лічылі і лічаць стварыць вобраз генія чалавецтва, самага чалавечнага чалавека, правадыра партыі і рэвалюцыі Уладзіміра Ільіча Леніна. Першыя крокі ў гэтым кірунку былі зроблены яшчэ ў дваццатыя-трыццатыя гады. Над стварэннем вобраза Ільіча працавалі П. Броўка, П. Панчанка, А. Куляшоў, П. Глебка, М. Танк, М. Лужанін, К. Кірэенка, усе лепшыя нашы паэты. Паэмы пра Леніна напісалі А. Вялюгін і Г. Бураўкін. Шмат цікавага ў вырашэнні тэмы «Ленін і дзеці» ўнеслі П. Ткачоў і В. Хомчанка. Папоўнілі нашу Ленініяну аповесці і апавяданні І. Шамякіна, добры водгук атрымалі кнігі Я. Бяганскай і Я. Сіпакова.

Блізка да ленінскай тэмы стаяць творы, у якіх расказваецца пра рэвалюцыйнае мінулае нашага народа, малюецца вобразы паплечнікаў Ільіча, барацьбітоў за народнае шчасце. Цікавай атрымліваецца серыя «Слава твая, Беларусь!», якую выпускае выдавецтва «Мастацкая літаратура».

Важнае месца ў справе выхавання маладога пакалення ў духу адданасці партыі і Радзіме, працягвае прамоўца, займаюць творы на ваенную тэму, сярод якіх такая арыгінальная кніга, як «Ніколі не забудзем», напісаная самімі дзецьмі. Піянерам-героям прысвяцілі свае творы П. Броўка, С. Шушкевіч, Г. Бураўкін, Г. Васілеўская, І. Сіняўскі, В. Шымук, Я. Курто, Д. Слаўковіч, М. Корзун, А. Махнач.

Вядома, варта вітаць з'яўленне ў беларускай літаратуры кніг пра слаўнае мінулае. Але мы не павінны забываць пра сённяшні дзень. Асноўным зместам твораў для дзяцей павінна стаць наша сучаснасць.

Нельга сказаць, што пра сучаснае жыццё горада і вёскі, жыццё нашых дзяцей і юнакоў пішацца мала. Але не ўсе творы, напісаныя на сучасную тэму, становяцца прыкметнай з'явай. Многія з іх псуе павярхоўнасць і схематызм. Не хапае і майстэрства. Словам, якасць гэтых твораў не заўсёды высокая.

Мала ў нас пакуль што пішацца і добрых навукова-дакументальных, пазнаваўчых нарысаў, мала цікавых кніг аб прафесіях, гарадах, прыродзе, пра заводы, калгасы і саўгасы. Мала прыгодніцкіх твораў. Бадай, што адзін У. Шыцік стала працуе ў жанры фантастыкі. Калі стан паэзіі для дзяцей і юнацтва, мяркуе прамоўца, не выклікае асаблівай трывогі, дык стан прозы насцярожвае — толькі лічаныя добрыя творы мы можам назваць на сучасную тэму, што з'явіліся ў нас за апошнія гады. Знік з літаратуры для дзяцей і юнацтва такі ёмісты і любімы жанр як раман.

Да дасягненняў прозы на сучасную тэму дакладчык адносіць апавяданні В. Хомчанкі «Віця — рабочы клас», М. Парахневіча «Агні маладзёжнай вуліцы», аповесці «Падарожжа ў калгас» П. Місько, «Блакітны экспрэс» А. Кобец-Філімонавай, «Сустрэча з морам» Я. Бяганскай, а таксама творы Я. Брыля, А. Васілевіча, М. Паслядовіча, А. Якімовіча, І. Сяркова. Цікавыя кнігі пра прыроду напісалі З. Бяспалы, Я. Пархута, Г. Нужкова.

У цэлым высока ацэньваючы сучасную беларускую паэзію для дзяцей і юнацтва, прамоўца ўказвае і на яе праліікі, прыводзячы словы П. М. Машэрава, сказаныя на XIII пленуме ЦК КПБ: «У эпоху нечуванага ўздыму навукі, тэхнікі, тэхналогіі, асваення космасу дзіцячая літаратура ўсё яшчэ топчацца вакол лясных гномаў, казачных прынцаў і Іванькаў-дурачкоў».

Мнагавата ў літаратуры для маленькіх, заўважае дакладчык, рамесніцтва, часам амаль плагіяту. Варта аднаму паэту знайсці цікавы мастацкі вобраз, як ён пачынае вандраваць з верша ў верш у іншых аўтараў. Пераймаюць, бяруць татовае напракат у народа. А мова, якою пішуцца іншы раз вершы і апавяданні для маленькіх? Яна то засмечана дыялектызмамі, то занадта вучоная, а то часам ужыта такая гульня слоў, такія метафары, што не толькі дзіця, а і бацька, маці, маючы філалагічную адукацыю, не зразумеюць іх сэнсу.

Б. Сачанка лічыць, што сур'ёзнага вывучэння патрабуе стан драматургіі для дзяцей і юнацтва, бо хоць п'ес напісана нямала, але не ўсе яны адпавядаюць высокім патрабаванням. Ды і дзе п'есы беларускіх аўтараў ставяцца? У тэатры юнага гледача, і зрэдку ў тэатры лялек. Тыя дзеці, што жывуць у Мінску, маюць магчымасць паглядзець гэтыя спектаклі. А астатнія, што жывуць у іншых гарадах, у вёсцы? Абласныя тэатры, праўда, ставяць спектаклі для дзяцей, але чамусьці не па беларускіх творах, што, вядома ж, не заахвочвае драматургаў пісаць новыя п'есы для дзяцей і юнацтва.

Варта, на думку дакладчыка, лепшыя п'есы для дзяцей хоць зрэдку выдаваць асобнымі кнігамі ці зборнікамі, што таксама садзейнічала б актывізацыі пісьменнікаў. Мала, зусім мала п'ес пішацца і для гурткоў школьнай мастацкай самадзейнасці.

Шмат недахопаў і ў нашай кінадраматургіі для дзяцей, у справе стварэння песень, хоць і ў гэтых жанрах, лічыць дакладчык, ёсць свае энтузіясты, якія працуюць стала і самааддана.

Аднак самай пільнай увагі, гаворыць ён, патрабуе крытыка для дзяцей і юнацтва. Яна яўна адстае ад агульнага стану развіцця крытычнай думкі ў Беларусі. Крытычныя працы па літаратуры для дзяцей і юнацтва выходзяць вельмі рэдка. «Беларуская дзіцячая літаратура» Э. Гурэвіч выпушчана восем гадоў таму назад. З'явіліся ў нашым перыядычным друку цікавыя артыкулы і назіранні М. Яфімавай, І. Разанава, Р. Літвінава, С. Хорсун, Т. Арловай, У. Гніламёдава, А. Марціновіча. Добра, працягвае Б. Сачанка, што хоць зрэдку пра літаратуру для дзяцей і юнацтва пішуць В. Вітка, Я. Брыль, Н. Гілевіч, В. Бечык, А. Клышка, М. Барсток. Інакш было б зусім сумна. А літаратура для дзяцей і юнацтва патрабуе крытыкі самай сур'ёзнай. Трэба разабрацца ў тым, што створана ў нас для дзяцей і юнацтва.

Трывогу, заўважае дакладчык, выклікае і тое, што ў нашых вышэйшых навучальных установах няма ніводнай спецыяльнай кафедры, у Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук адсутнічае сектар дзіцячай і юнацкай літаратуры, курс дзіцячай літаратуры на філалагічных факультэтах шэрагу педагагічных інстытутаў рэспублікі зусім не чытаецца.

Прамоўца звяртае ўвагу і на такі важны аспект, як пісьменнік і школа. Тут зроблена нямала. У школе вывучаюцца лепшыя творы беларускіх пісьменнікаў— па праграме і па-за праграмай. В. Вітка, Р. Шкраба, А. Клышка, Э. Агняцвет, А. Якімовіч, М. Барсток, С. Александровіч склалі хрэстаматыі, напісалі падручнікі. Вялікі атрад беларускіх крытыкаў і літаратуразнаўцаў займаецца стварэннем падручнікаў па літаратуры і мове для вышэйшых навучальных устаноў, чытае лекцыі будучым настаўнікам, выкладчыкам школ. Ёсць зрухі ў напісанні твораў пра сённяшні дзень савецкай школы, паказу таго, чым яна жыве. Але плён быў бы куды большы, калі б Саюз пісьменнікаў разам з Міністэрствам асветы БССР аб'явілі конкурс на лепшы твор аб сённяшнім юным героі — школьніку і піянеры.

Літаратура яшчэ не заняла свайго належнага месца ў духоўным фарміраванні асобы школьніка і па той прычыне, што на выкладанне роднай літаратуры ў школьных праграмах адведзена вельмі мала часу. Большай прадуманасці, стабільнасці патрабуюць і самі падручнікі, хрэстаматыі. Падбор тэкстаў, ілюстрацый, пытанняў школьніку павінен адпавядаць самым высокім патрабаванням і густам. Не хто іншы, а школа абавязана навучыць дзяцей, як трэба чытаць і разумець мастацкую літаратуру. Відаць, заўважае дакладчык, ёсць пэўныя недахопы і ў практыцы падрыхтоўкі настаўнікаў — выкладчыкаў літаратуры і мовы. Не поўнасцю задавальняе настаўнікаў і вучняў становішча ў рэспубліцы са школьнымі бібліятэкамі. Кніг, патрэбных нават па праграме, не хапае, а калі яны і ёсць, то ў вельмі абмежаванай колькасці.

Закранае Б. Сачанка і пытанні, звязаныя з выпускам у рэспубліцы кніг для дзяцей і юнацтва. Прыемна, што ўсё лепшае даходзіць да чытача. Павялічыліся, што вельмі важна, і тыражы дзіцячых кніг. Больш, чым раней, перакладаецца на беларускую мову твораў з рускай, з моў народаў СССР і замежных краін. Дастойнае месца ў выдавецкіх планах знаходзіць класіка. Аднак куды больш мэтанакіравана і паспхова выпускала б кнігі для дзяцей і юнацтва спецыяльнае выдавецтва. Значна больш магло б, лічыць дакладчык, выдаваць і перавыдаваць кніг мастацкай літаратуры і выдавецтва «Народная асвета». Шэсць-сем назваў беларускіх аўтараў, прычым некаторыя з іх па 2—5 аўтарскіх аркушаў — мала. Мала, бо перавыдаваць у нас ёсць што. Не толькі творы сучасных пісьменнікаў, а ўся наша літаратура павінна быць уключана ў справу выхавання. Тыражы беларускіх кніжак, што выпускае «Народная асвета», таксама невялікія, ва ўсякім выпадку яны не задавальняюць патрэб ні вучняў, ні школьных бібліятэк. Варта было б выдавецтву папырыць кола аўтараў, творы якіх не ўваходзяць пакуль што ў праграмнае вывучанне, выдаць кнігі, якія заваявалі шырокую папулярнасць і ў Беларусі, і за яе межамі, кнігі, якія сорам не прачытаць ці не ведаць выпускніку сярэдняй школы. Няблага было б, прапануе Б. Сачанка, выдавецтву пачаць выпуск цікавых серый, як скажам, «Прыгодніцтва і фантастыка», «Беларуская дзіцячая класіка» і іншых.

Пытанням развіцця дзіцячай літаратуры, гаворыць у заключэнне Б. Сачанка, Саюз пісьменнікаў заўсёды ўдзяляў належную ўвагу. Дванаццаць гадоў назад быў праведзены спецыяльны пленум праўлення, адбыліся пашыраныя пасяджэнні прэзідыума праўлення СП БССР сумесна з Дзяржкамвыдам, Міністэрствам асветы БССР, ЦК ЛКСМБ і выдавецтвам «Беларусь». Было праведзена таксама некалькі рэспубліканскіх конкурсаў на лепшы твор для дзяцей і юнацтва. Летась у Маскве адбыўся пленум СП СССР, прысвечаны літаратуры для падлеткаў. Па некалькі разоў на год збіраецца Савет па дзіцячай літаратуры пры СП СССР, куды ўваходзяць нашы самыя вядомыя дзіцячыя пісьменнікі. Аднак адны арганізацыйныя меры не дадуць вынікаў, пакуль мы, пісьменнікі, не напішам значных твораў для дзяцей і юнакоў.

Барыс Сачанка, Алег Лойка, Андрэй Макаёнак, старшыня Дзяржкамвыда БССР М. І. Дзялец, міністр асветы БССР М. Г. Мінкевіч, Іван Шамякін.

ПОШУК ПРЫНОСІЦЬ ПОСПЕХ

З садаклада П. КАВАЛЁВА

Сённяшняя дзіцячая і юнацкая проза развіваецца ў агульным рэчышчы ўсёй нашай літаратуры. Мае яна і свае поспехі, добрыя якасці. І самая адметная з іх — дакументальнасць, дакументальнасць мастацкая, якая мае не толькі пазнавальнае, але і эстэтычнае значэнне. Тут варта перш-наперш назваць цэлую серыю твораў на ленінскую тэматыку. Гэта — аповесці і апавяданні І. Шамякіна («Першы генерал», «Браняпоезд «Таварыш Ленін», «Матрос з «Алега», «Хлеб» і іншыя), якія малююць суровую праўду жыцця пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, паказваюць адзінства народа і яго правадыра. Вынікам паездкі Я. Бяганскай у Шушанскае з'явілася яе кніга апавяданняў «Над ракою Шушай», апавяданні якой напісаны проста і прычыра, вучаць дзяцей дабраце. Цікавым атрымаўся зборнік С. Грахоўскага «Агеньчык у акне», таксама ў асноўным прысвечаны ленінскай тэматыцы. Даўно і паспяхова над творамі пра У. І. Леніна для дзяцей і юнацтва працуюць В. Хомчанка і П. Ткачоў. Зборнік апавяданняў В. Хомчанкі «Чырвоны мак», лічыць П. Кавалёў,— значнае дасягненне ўсёй беларускай Ленініяны.

Выхаванню дзяцей і юнацтва ў камуністычным, патрыятычным духу шмат дапамагае таксама і наша проза пра Вялікую Айчынную вайну. Юнакі з захапленнем чытаюць раманы І. Мележа, І. Шамякіна, І. Навуменкі, І. Чыгрынава, І. Пташнікава, аповесці В. Быкава, В. Сачанкі і іншых.

Асабліва поспех, заўважае прамоўца, у юнага чытача маюць дакументальныя творы аб рэальных героях. Тут можна назваць «Дзве дарогі» Г. Васілеўскай, «Апавяданні пра Марата Казея» С. Шушкевіча, «Суровая дабрата» С. Грахоўскага, «Компас паказвае на захад» І. Аношкіна, «Жаваранкі над Хатынню» А. Кобец-Філімонавай, «Дырэктар «зялёнай школы» Ю. Багушэвіча, «Цыганок» А. Шлега, «У разведку ішоў хлопчык» В. Марозава.

Добрую справу робіць выдавецтва «Мастацкая літаратура», выпускаючы спецыяльную серыю пра юных герояў «З арлінага племя». П. Кавалёў спыняецца на кнігах Д. Слаўковіча, І. Сяркова, А. Махнача, М. Ваданосава, Я. Курто, М. Гамолкі, Х. Жычкі, Я. Каршукова, А. Шашкова, В. Шымука і іншых.

Далей прамоўца гаворыць пра кнігі на гістарычную тэматыку, адзначаючы, што такія з іх, як «Падарожжа па краіне беларусаў» В. Вольскага, «Колас расказвае пра сябе» М. Лужаніна, «Кастусь Каліноўскі» А. Якімовіча, «Стану песняй» Л. Арабей, «Канстанцін Заслонаў» Л. Ракоўскага, «Чалавек з легенды» І. Ражкова, «Ад Гомеля да Эстрамадуры» Я. Драбінскага, «Стрэлы над кручай» Л. Прокшы, «Мсціслаўцаў посах» Э. Ялугіна, «Стрэлы на зялёнай палянцы» У. Мяжэвіча, «Старадаўняя гравюра» У. Мехава, «Падарожная Аляксандра Пушкіна» Д. Сімановіча служаць вялікай справе пазнання часу і людзей, выклікаюць пачуццё любові да мінулага свайго народа.

Да дасягненняў дзіцячай літаратуры П. Кавалёў адносіць таксама кнігі «Малюнкі маленства» А. Бялевіча, «Сцежкі» А. Пальчэўскага, «Зямля пад белымі крыламі» У. Караткевіча, «Алёшка-верхалаз» П. Рунца, «Сто здарэнняў у адзін дзень» С. Міхальчука, «Чарапаха без панцыра», «Туман ідзе па следу», «Школа ля крэпасці» Г. Шыловіча. На жаль, канстатуе ён, такіх твораў у апошні час з'яўляецца мала. Тут можна назваць, бадай, толькі аповесць нашага земляка, лётчыка-касманаўта П. Клімука «Зоры — побач» і «Зоркі над палігонам» А. Жука, якая прысвечана сённяшняй арміі, а таксама аповесць М. Кругавых «Юрка — сын камандзіра», што адзначана першай прэміяй на рэспубліканскім конкурсе на лепшы твор для дзяцей і юнацтва.

Кажуць, дрэнныя дзеці—гэта дрэўцы, вырашчаныя няўмелымі садоўнікамі. Гэта таксама наша тэма—паказваць і тое, як часам некаторыя бацькі «матарызуюць і «радыёфікуюць» сваё дзіцятка, а выхаваць душу добрую — забываюць. На жаль, праблема гэтая толькі закранаецца ў беларускай прозе. Вось чаму асаблівай увагі заслугоўвае аповесць У. Машкова «Засумаваў па дожджыку», у цэнтры якой вобраз менавіта «цяжкага» хлапчука.

Добрым словам успамінае П. Кавалёў аповесці «У Ельніцы» М. Парахневіча, «Як Алік у тайзе заблудзіўся» У. Дубоўкі, маладой пісьменніцы Т. Гарэлікавай «Дзе лес шуміць». У апошнім творы, пяглядзячы на пэўныя недахопы, ёсць важная думка: у кожнага з нас, гаворачы словамі А. Алексіна, павінен быць своеасаблівы «талент чалавечнасці».

Большай увагі патрабуе з боку пісьменнікаў і такая важная тэма, як каханне, узаемаадносіны паміж маладымі людзьмі. Высакароднасць чалавечых пачуццяў, вартасць дружбы і самога кахання ўмела сцвярджаецца ў аповесцях І. Навуменкі, па-свойму падышла да гэтай вечнай тэмы ў адным з апавяданняў, што ўвайшло ў кнігу «Жаваранкі на вуліцы» С. Курылёва.

Прамоўца нагадвае словы М. Горкага аб тым, што сапраўднай мастацкасці без выдумкі не бывае. На жаль, лічыць ён, у нас вельмі мала займальных твораў, асабліва для самых маленькіх чытачоў. Можна тут, бадай, назваць толькі тры цікавыя кнігі — «Прыгоды Бульбобаў» П. Місько, «Хлопчык Бульбінка» Л. Прокшы і «Ізумрудавы горад, дзе ты?» А. Вольскага.

Гаворачы пра стан сучаснага беларускага апавядання для дзяцей і юнацтва, П. Кавалёў у першую чаргу вылучае творы В. Гарбука, асабліва з яго кніжкі «Са мной здарылася неверагоднае», пазначаныя добрым мастацкім густам і жывой выдумкай. Добрыя апавяданні ёсць таксама ў А. Паскробышава, М. Даніленкі, А. Капусціна, І. Сіняўскага, К. Каліны, М. Бабарыкі, М. Пянкрата, Н. Маеўскай, У. Юрэвіча, З. Бяспалага, У. Ліцскага, В. Дайліды, Р. Ігнаценкі, М. Корзуна і іншых. І ўсё ж, канстатуе ён, мастацкі ўзровень многіх сённяшніх апавяданняў значна слабейшы за творы, напісаныя ў свой час Я. Брылём, А. Кулакоўскім, М. Паслядовічам, У. Краўчанкам, Т. Хадкевічам, І. Грамовічам. Відаць, гэта і з'яўляецца прычынай таго, чаму мала нашых апавядальнікаў выходзяць на ўсесаюзнага чытача.

Адзін з галоўных недахопаў твораў дзіцячай і юнацкай літаратуры П. Кавалёў бачыць у тым, што многія аўтары няўважліва ставяцца да такога важнага кампанента, як сюжэт. Прыемнае выключэнне тут — У. Паўлаў, У. Шыцік, Г. Папоў. Сумныя, бессюжэтныя творы, лічыць ён, нараджаюцца па простай прычыне — пісьменнікі абыходзяць у сваёй творчасці цяжкасці, якія маюць яшчэ месца не толькі ў жыцці дарослых. Аповесці В. Казько і маюць такую шырокую чытацкую папулярнасць менавіта таму, што пісьменнік не змякчае цяжкія, часам трагічныя супярэчнасці, нялёгкія выпрабаванні чалавека, не шукае ў творах сваіх залатой, спакойненькай сярэдзінкі — гэткага шчаслівага зыходу ва ўзаемаадносінах сваіх герояў.

Літаратура, працягвае прамоўца, павінна вучыць мужнасці, выклікаць спачуванне да чужога болю, з маленства выхоўваць у маладога . пакалення здольнасць ісці насустрач цяжкасцям і перамагаць іх.

ПАЭЗІЯ ЗАЎСЁДЫ З ЧАЛАВЕКАМ

З садаклада В. ЗУЁНКА

Беларуская дзіцячая паэзія заўсёды была мощная сваёй народнай асновай, сваімі багатымі фальклорнымі традыцыямі. Выкарыстоўваючы іх, яна і ў апошнія гады асвойвала самыя найноўшыя пласты жыцця, і з найбольшым поспехам там, дзе гэта рабілася творча, са смелым і натхнёным пранікненнем у свет пачуццяў, настрояў, захапленняў сённяшняга малыша, калі мець на ўвазе кніжкі для дашкольнікаў. Менавіта сённяшняга — і не інакш, падкрэслівае прамоўца, і ў якасці прыкладу прыводзіць радкі з кнігі В. Віткі «Хто памагае сонцу».

Найбольш вартыя творы, працягвае ён, з кніжак С. Шушкевіча «Барадаты камар», І. Муравейкі «Дуб і дубок», А. Дзеружынскага «Конікі-будаўнікі», А. Лойкі «Дзе хто начуе» , М. Чарняўскага «Парад», К. Камейшы «Гаёўка», У. Карызны «На сяле ў бабулі», Н. Галіноўскай «Мой дзень» якраз і вызначаюцца народнай хітрынкай, усмешлівым і па-дзіцячы дапытлівым і ўсёбачным позіркам на з'явы, паміж якіх ёсць і вясёлыя і зусім сур'ёзныя, насычаныя самым сучасным зместам, падказаным нашай навукова-тэхнічнай эпохай.

У лепшых сваіх праявах паэзія для маленькіх імкнецца раскрыць дзецям самае шырокае кола праблем і з'яў жыцця нашага грамадства, зразумела, знаходзячы для гэтага адпаведныя ўзросту формы і мастацкія рашэнні. Сацыяльна-грамадская шматграннасць, напоўненасць нашай дзіцячай паэзіі добра відаць на прыкладзе апошніх кніг М. Чарняўскага, а таксама асобных твораў з яго будучых зборнікаў. Праўда, В. Зуёнак, у цэлым вельмі станоўча ацэньваючы творчасць паэта, указвае і на некаторыя яго праліки.

Радуе таксама жанравая разнастайнасць паэтычных кніжак для маленькіх. Услед за В. Віткам нястомным шукальнікам і выдумшчыкам выступае тут Р. Барадулін. Знаходзім мы ў яго і сур'ёзны верш і жарт, казку і вясёлую небыліцу, загадку і задачку, скарагаворку і каламбур, лічылку і пацешку, калыханку і нават дражнілку, — словам, увесь паэтычны дзіцячы арсенал мастацкага і мастацка-прыкладнога прызначэння. Усё гэта зроблена лёгка, нязмушана, з паэтычнай вынаходлівасцю, — аб чым сведчыць яго апошняя кніжка «Што было б тады б, калі б?».

Паспрабаваў сябе ў жанры загадкі, гаворыць далей прамоўца, В. Жуковіч, выдаўшы дзве кніжачкі-раскладанкі — «Казачны сад» і «Нашы памочнікі», у якіх ёсць і несумненныя ўдачы. Дэбютавалі зборнікамі для дзяцей таксама Г. Дзмітрыеў, В. Пчолка, М. Салаўцоў, В. Гардзей. На думку В. Зуёнка, асабліва прыемнае ўражанне пакідае зборнік В. Гардзея «Чырвоны грабеньчык».

Праўда, нягледзячы на тое, што з'яўляюцца новыя імёны, новыя кнігі, адзін жанр пакуль што застаецца без пэўнага руху. Пасля прыгод цара Зубра, своеасаблівага даследавання «Хто робіць пагоду» і палёту Васі Вясёлкіна на Месяц, завадатарамі якіх былі В. Вітка, М. Лужанін і С. Грахоўскі, ніяк не можа вырвацца на шырокія абсягі фантазіі, абуджанай, падказанай сённяшнім днём, наша паэтычная казка.

Па-ранейшаму, з трывалым поспехам працуе ў паэзіі для школьнікаў Э. Агняцвет. Яе новыя кнігі «Мы сур'ёзныя, мы вясёлыя» і «Доктар Смех» напоўнены сонцам захапляючай рамантыкі, дыханнем сур'ёзных і вясёлых піянерскіх спраў. Кнігі гэтыя ў некаторых сваіх кампанентах незвычайныя, з прыемнымі нечаканасцямі: «Мы сур'ёзныя, мы вясёлыя» ўключае, напрыклад, і песні з нотамі, а «Доктар Смех» паўстае перад намі ў цудоўным афармленні, выкананым вучнямі Рэспубліканскай школы-інтэрната па музыцы і выяўленчым мастацтве.

У сувязі з гэтым, лічыць прамоўца, зноў хацелася б падкрэсліць думку аб неабходнасці стварэння ў рэспубліцы выдавецтва дзіцячай і юнацкай літаратуры.

Адным з недахопаў сучаснай паэзіі для дзяцей В. Зуёнак бачыць у тым, што паэма стаіць у баку ад сённяшніх будняў піянерскага жыцця. А яны — цікавыя, напоўненыя яркім, сур'ёзным зместам. Варта прыгадаць толькі маршруты Усесаюзнага піянерскага марша. Колькі тут матэрыялу, сапраўды паэтычнага, сапраўды натхняючага. Ды бяда ў тым, лічыць прамоўца, што паэты нашы аб усім гэтым маюць даволі прыблізнае ўяўленне.

Запатрабаванні, інтарэсы дзяцей вымагаюць ад літаратуры несупыннага пошуку, адкрыцця новых тэм, новых форм. У гэтым сэнсе цікавы эксперымент зрабіў А. Вольскі кнігамі «Лясныя мастакі» і асабліва — «Ізумрудавы горад, дзе ты?». Кампаноўка, сінтэз паэзіі з апавяданнем, эсэ здаецца з'явай перспектыўнай, бо цікава пашырае выяўленчыя і тэматычныя магчымасці дзіцячай кнігі.

І ўсё ж , канстатуе В. Зуёнак, да крыўднага рэдка, эпізадычна звяртаецца натхненне нашых паэтаў да сённяшняга дня дзяцей, да сённяшняй школы, вучобы, духоўнага гартавання нашай змены і надзеі. Справа гонару і абавязак лепшых нашых паэтаў, лепшых празаікаў — пісаць для дзяцей. Магчыма, у каго-небудзь і не ўдасца (талент дзіцячага пісьменніка — талент асаблівы), але, прынамсі, паспрабаваць трэба. А раптам якраз гэтым і завяжацца сцяжынка да нашчадкаў, як у Яршова славутым «Канькам-гарбункам»?

Старшакласнікам, хто цікавіцца паэтычным словам, праўда, не закрыты самастойныя шляхі да палымянай, баявой, камсамольскай і па-юнацку раздумлівай паэзіі Г. Бураўкіна ці да светлай, як плынь крыніцы, лірыкі Я. Янішчыц. Але і пэўныя арганізацыйныя захады тут ніколі не будуць лішнімі. Добрым компасам для юных у неабсяжным моры паэзіі сталі анталогіі «Люблю будзённы дзень...» і «Дзень добры, мама!», якія прынеслі з сабою сапраўднае свята. Цікавым было па задуме серыйнае выданне «Песню бярыце ў дарогу», але з'яўленне яго неяк засталося ў ценю, не заявіла аб сабе на ўвесь голас.

Паэзія і дзяцінства... Паэзія і юнацтва... Глыбокія, можна сказаць кроўныя сувязі ў гэтых паняццяў. Чалавек расце, узнімаецца, а побач з ім заўжды паэзія: ад калыханкі да прызнання ў каханні, ад вясёлай лічылкі да глыбокага філасофскага роздуму. Бачыць беларускую паэзію для дзяцей і юнацтва на перадавых пазіцыях жыцця, на ўзроўні тых духоўных вышынь, якія ўяўляюцца нам у вобліку чалавека камуністычнага грамадства, гэтым жаданнем, падкрэслівае прамоўца, і былі выкліканы яго думкі, выказаныя ў садакладзе.

Васіль Быкаў, Генадзь Бураўкін Нічыпар Пашкевіч.

ВАЖНЕЙШЫ СРОДАК МАРАЛЬНАГА І ЭСТЭТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

1. ЦІ ІСНУЕ СПЕЦЫФІКА ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ?

У спрэчках, якія разгарнуліся па дакладу Б. Сачанкі і садакладах П. Кавалёва і В. Зуёнка, разам з многімі іншымі закраналася і такое, здавалася б, даўно высветленае ў літаратуразнаўстве пытанне, як спецыфіка літаратуры для дзяцей і юнацтва. З выступленняў, асобных выказванняў вынікала, што на практыцы праблема гэтая ў некаторых аспектах застаецца актуальнай, і вырашацца яна павінна ў індывідуальным парадку кожным, хто піша для юных чытачоў, — абапіраючыся толькі на ўласны вопыт, кіруючыся творчай інтуіцыяй.

Спецыфіка дзіцячай літаратуры прызнаецца як аксіёма, але, на жаль, мала ў нас яшчэ тэарэтычных прац, прысвечаных гэтай праблеме, рэдка з'яўляюцца манаграфіі, у якіх абагульняўся б вопыт вядомых дзіцячых пісьменнікаў. Праўда, ёсць падручнікі, дапаможнікі па беларускай дзіцячай літаратуры для студэнтаў, рыхтуецца іх перавыданне. Аўтары іх, гаварыла ў сваім выступленні кандыдат філалагічных навук **Марына Барсток**, заклапочаны тым, каб палепшыць кнігі, зрабіць іх больш навуковымі і цэласнымі. Але, прызнае М. Барсток, мы адчуваем, што нам не хапае абагульняючых думак — пра суадносіны дзіцячай літаратуры і дарослай, пра яе спецыфіку. Тым большай увагі заслугоўваюць думкі, выказаныя з трыбуны пленума пісьменнікамі.

— Усім вядомы лозунг, што для дзяцей трэба пісаць гэтак жа, як і для дарослых, толькі яшчэ лепш. У апошніх словах — «яшчэ лепш» — і заключана ўся спецыфіка літаратуры для дзяцей, — пераканана гаварыў з трыбуны пленума вопытны майстар, старэйшы дзіцячы пісьменнік рэспублікі **Алесь Якімовіч.**

І гэта слушна, калі мець на ўвазе канчатковы вынік, якасць твораў, кніг. Але калі канкрэтызаваць праблему, то, відаць, гаворку трэба весці і пра шляхі, сродкі для дасягнення высокіх вартасцей твораў для дзяцей, пра творчыя прынцыпы, здольныя прывесці да поспеху.

Цікавую думку выказаў на гэты конт **Іван Шамякін.**

— Ці ёсць спецыфіка дзіцячай літаратуры? — ставіць ён пытанне і адказвае: што датычыцца літаратуры для самых маленькіх, то тут вельмі сур'ёзная спецыфіка. Не кожны можа пісаць для дзяцей... Безумоўна, ёсць свая спецыфіка і ў творчасці для юнацтва, але трэба ўлічваць і наш час, узровень развіцця падлеткаў. Іх узровень дазваляе чытаць усё, што напісана, створана нашым гуманным сацыялістычным мастацтвам. Між тым, выдавецтвы працягваюць выдаваць для іх дыстыляваныя, прэсныя творы.

І. Шамякін падкрэслівае, што зараз у нашай школе, у выхаванні падрастаючага пакалення адбываюцца сур'ёзныя працэсы, і сам факт прыняцця пастановы ЦК КПСС аб агульнаадукацыйнай школе, пастановы, якая ставіць надзвычай многа кардынальных пытанняў, абавязвае пісьменнікаў думаць аб гэтым і больш актыўна пісаць.

Сапраўды, нецікавых, пазбаўленых складанасцей і супярэчнасцей жыцця твораў з'яўляецца на свет нямала. Пра гэта нагадвалі амаль усе, хто выступаў у спрэчках — праўда, за рэдкім выключэннем, адцягнена, не называючы канкрэтных твораў і аўтараў, а толькі ў агульным плане — як аб непажаданай з'яве.

— Сярод дзіцячых твораў, якія ў нас пішуцца і публікуюцца, — адзначыў галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» **Аркадзь Марціновіч**, усё ж мала па-сапраўднаму яркіх удач, пазначаных высокім талентам і натхненнем. Калі мераць высокай меркай, то наша дзіцячая літаратура адстае ад хуткаплыннага жыцця, ад тых дабратворных, але і складаных змен, якія адбываюцца ў жыцці. Мастацкі ўзровень многіх дзіцячых кніг невысокі, у іх залішне нейкай ружовасці, бясхмарнасці, мы быццам баімся ці не ўмеем далучаць падлеткаў да разумення складанасці і суровасці жыцця, набліжаць да тых складаных адказных праблем, якімі жыве сёння грамадства. Як вядома, змястоўнасць і ідэйнасць кнігі для дзяцей павінны спалучацца з займальнасцю, мастацкая кніга павінна захапляць. На жаль, часта гэтай займальнасці якраз і не хапае. У такіх творах панує схематызм — у кампазіцыі, у характарах герояў, у выяўленчых сродках. Многія творы псуе сюсюканне, дыдактызм, голая павучальнасць, якая, канечне, не даходзіць да сэрца юнага чытача.

Мы, вядома, імкнёмся не ўключаць у свае выдавецкія планы слабыя творы, але яны ўсё ж часам трапляюць туды і выходзяць у свет. Піша пісьменнік, рэцэнзуе і рэкамендуе пісьменнік, рэдагуе пісьменнік, а ўрэшце выяўляецца, што кніга слабая. Справа тут не ў адной нашай непатрабавальнасці, бо часам і сам выбар надта абмежаваны, асабліва, калі гаварыць аб творах для падлеткаў, заключае А. Марціновіч.

Выказванне А. Марціновіча яшчэ раз сведчыць, што спецыфіка літаратуры для дзяцей, у тым ліку для падлеткаў, юнацтва, — існуе. І што, на жаль, многімі аўтарамі яна не асвоена, не ўлічваецца пры рабоце над творамі. Не ўлічваецца перш за ўсё ўзровень інтэлектуальнага развіцця, кола інтарэсаў, духоўныя запатрабаванні сучаснага падлетка і юнака.

Чаму так адбываецца? У чым, урэшце, спецыфіка літаратуры для дзяцей? Чаго яна вымагае ад пісьменніка? Пра гэта гаварыў таксама **Павел Місько.**

Па-першае, як адзначыў ён у сваім выступленні, сёй-той у звыклы выраз «дзіцячая літаратура» пачаў укладваць інакшы сэнс: дзіцячая — значыць не сур'ёзная, штосьці накшталт каляровых бразготак-цацак для немаўлят. Калі, па словах П. Місько, аднаго вядомага пісьменніка спыталі, ці ўдзельнічае ён у конкурсе на лепшы твор для дзяцей і юнацтва, той адказаў, што, маўляў, я ж яшчэ не здзяцінеў! Як вынік такіх пагардлівых адносін — меркаванне ў пэўнай частцы літаратараў, што для дзяцей пісаць не цяжэй, а лягчэй. Асабліва крыўдна, калі такое стаўленне да дзіцячай літаратуры ўспрымаюць і засвойваюць маладыя пісьменнікі і пачынаючыя, не кажучы пра кан'юнктуршчыкаў ад літаратуры, якія спяшаюцца «кампенсаваць» дэфіцыт на дзіцячыя творы сваімі няспелымі практыкаваннямі.

За фанабэрыяй і пагардай да дзіцячай літаратуры, якія праяўляюцца ў асобных літаратараў, да тых, хто піша для дзяцей, разважае далей П. Місько, я бачу боязь застацца з вока на вока, тварам у твар з хлапчуком ці дзяўчынкай. Бо ў дзіцячым творы не схаваешся ні за квяцістасць і вычурнасць пісьма, ні за стамляючую дэталізацыю і бытапісальніцтва, ні за пейзажныя апісанні на многія старонкі, ні за дакучлівую псіхалагізацыю і філасофствавание.

У дзіцячым творы не месца шматслоўю, бо дзяцей, як слушна казаў Горкі, «фразай не ашукаеш»; з дзецьмі трэба гаварыць «забаўна» (зноў жа Горкі), бо ніякаю сілай не прымусіш дзіця чытаць сумную кнігу і праз гэты сум пазнаваць свет.

Кожнае слова ў дзіцячым творы павінна несці максімальную нагрузку, і ніводнага гуку, як пісаў А. Талстой, не павінна быць ужыта «для красоты»; твор для дзяцей павінен захапляць і прыцягваць, як магніт, павінен мець дынамічны, інтрыгуючы сюжэт. Нездарма мы, сённяшнія дарослыя, сённяшнія бацькі і нават дзяды, са светлай усмешкай у душы ўспамінаем цудоўную кнігу дзяцінства — «Міколку-паравоза» М. Лынькова. Усё ў гэтай кнізе ёсць, што і сёння захапляе падлеткаў: і рэвалюцыйная рамантыка, і гераічныя падзеі, і незвычайныя прыгоды, і пазнанне дабра і зла, і гумар, смех. Колькі там мудрых думак, як шмат заглыблена ў падтэкст, прызначана, як кажуць, навыраст. Вось гэта — думкі навыраст — я лічу абавязковай умовай дзіцячага твора, гаворыць П. Місько. Не садзіцца на кукішкі перад малым, не апускацца да ўзроўню сярэдненькага дзіцячага чытача, а падымаць яго, весці за сабой, рабіць усё, каб яму было цікава чытаць кніжку і ў 7 гадоў, і ў 10, і ў 12, а то і ў сталым узросце.

Дзеці — гэта маленькі народ, спрэс усе аптымісты, вось чаму гумар яны цэняць вышэй за ўсё. Гумар, смех — вельмі каштоўныя рэчы ў дзіцячай кнізе, проста неабходныя. Але, на жаль, вельмі рэдкія. Збіраць гумар цяжка, але трэба збіраць — хоць па крупінцы, заўважаючы яго ў будзённым і звычайным.

Для дзяцей трэба пісаць толькі па загаду ўласнага сэрца. Калі ж прымусіш сябе напісаць для іх нешта адчэпнае, то і цана гэтаму «адчэпнаму» будзе невысокая: дзеці — вельмі чуйны барометр, фальш, няшчырасць, змушанасць улоўліваюць вельмі хутка. І, як вынік, рэакцыя адна і тая ж — кідаюць кнігу недачытаную.

Навізна, арыгінальнасць твора павінна адчувацца і ў стылі. Стыль павінен быць мускулістым, дынамічным, пазбаўленым апісальніцтва, разжоўвання таго, што даўно вядома. Тканіна твора павінна быць максімальна насычана новай інфармацыяй і дзеяннем, рухам сюжэта. Зрэшты, зазначае П. Місько, пра тое, што такое сучасны стыль пісьма ў дзіцячай літаратуры, павінны сказаць свае слова нашы крытыкі і даследчыкі літаратуры...

2. ДЗІЦЯЧУЮ КНІГУ ПРОСЯЦЬ ДАРОСЛЫЯ

— Пленум абмяркоўвае вельмі важнае пытанне, якое стаіць у агульным рэчышчы праблем, звязаных з камуністычным выхаваннем працоўных і падрастаючага пакалення. Надзённасць яго заключаецца яшчэ і ў тым, што кніга з'яўляецца такім настаўнікам і дарадцам, якога не можа падмяніць ніхто і нішто, — гаворыць паэт і педагог **Уладзімір Верамейчык.** Ён мяркуе, што будучае школы, ступень выхаванасці яе вучняў, іх падрыхтаванасці да жыцця ў вялікай меры залежыць ад таго, ці стала кніга ў школе самым першым, самым галоўным звяном у рабоце з дзецьмі.

Пра добрую кнігу як незаменны інструмент у руках выхавацеля, педагога гавораць госці пленума — Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны настаўнік БССР **П. А. Дзмітрыеў**, намеснік міністра ўнутраных спраў БССР **П. С. Жук**, сакратар ЦК ЛКСМБ **Л. М. Балошка**, прадстаўнікі Саюза пісьменнікаў Літвы **Вінцас Аўрыла** і СП СССР **Леў Разгон**, міністр асветы БССР **М. Г. Мінкевіч**, старшыня Дзяржкамвыда БССР **М. І. Дзялец**, намеснік старшыні Дзяржкамітэта СМ БССР па тэлебачанню і радыёвяшчанню **М. Суша** і іншыя.

Кніга памагае і здольна, павінна яшчэ больш памагаць у выхаванні высокіх патрыятычных і інтэрнацыяналісцкіх пачуццяў. Састаўной часткай камуністычнага выхавання моладзі з'яўляецца фарміраванне ў юнацтва пачуцця савецкага патрыятызму і пралетарскага інтэрнацыяналізму, падкрэслівае П. Дзмітрыеў. І тут немагчыма пераацаніць дапамогу кнігі, кнігі для пазакласнага чытання, якая дапамагла б дзіцяці і падлетку зразумець сусветна-гістарычнае значэнне заваёў Кастрычніка, глыбей убачыць свет і сябе ў ім.

— У літаратуры, як і ў жыцці,—гаворыць госць з Масквы Л. Разгон, — трамадзянскае выхаванне неадлучнае ад выхавання маральна-этычнага. Мы павінны выхоўваць у дзяцей любоў да працы. Але гэта павінны быць кнігі духоўна-маральнай арыентацыі. Мы павінны клапаціцца перш за ўсё аб тым, як навучыць дзіця з самых малых год адчуваць не толькі свой боль, але і боль іншых, як выхаваць у яго пачуццё духоўнай і душэўнай блізкасці з усімі іншымі людзьмі: і тымі, з якімі жыве побач, і тымі, каго няма ўжо сярод жывых, але чыім нашчадкам ён з'яўляецца.

Міністр асветы БССР М. Г. Мінкевіч звяртае ўвагу прысутных на тое, што мала выдаецца кніг для першакласнікаў пра занятак і працу дарослых. Вельмі патрэбны творы пра сучаснасць, наш сённяшні дзень, творы на многія вострыя тэмы, важныя для камуністычнага выхавання школьнікаў. Недастаткова прадстаўлены ў нашай сучаснай літаратуры і жанр школьнай аповесці аб дзейнасці школьнага камсамола і піянерскіх справах, аб вучобе і дружбе школьнікаў. Таксама праца школьнага настаўніка не знаходзіць належнага адлюстравання, а праблемы сучаснай школы, духоўны свет маладых настаўнікаў часам паказваюцца спрошчана. Настаўнік не стаў горшым, узровень работы школы непазнавальна змяніўся ў лепшы бок, але, каб дагадзіць модзе, з аднаго фільма ў другі, а часам і ў літаратурныя творы пераходзяць карыкатурныя вобразы настаўнікаў. А ці варта прыніжаць прэстыж нялёгкай прафесіі настаўніка, да якой трэба выхоўваць усеагульную павагу?!

Адчуваецца патрэба ў творах на маральна-этычныя тэмы, асабліва блізкія вучням пэўнага ўзросту, якія памаглі б паступоваму фарміраванню ў школьнікаў сістэмы маральных прынцыпаў, ідэалаў і перако-

Янка Брыль, Алесь Пальчэўскі, Васіль Вітка, Ніл Гілевіч і Алесь Якімовіч.

нанняў. І вельмі важна, заключае прамоўца, мець нам у сваім выхаваўчым арсенале творы, якія б востра выкрывалі мяшчанскую, спажывецкую псіхалогію, выхоўвалі б культуру пачуццяў, вырашаючы адвечныя праблемы дабра і зла.

Літаратурныя праблемы неаддзельныя ад праблем жыццёвых, часам надзвычай вострых і складаных. Каб паспяхова выконваць сваю місію выхавацеля, дарадцы, настаўніка, літаратура не павінна, не мае права абыходзіць складанасць жыцця. Вось, напрыклад, праблема адносін чалавека з прыродай, на якой спыняецца старэйшы беларускі пісьменнік **Віталь Вольскі.** Сучасны чалавек эпохі развітога сацыялізму, гаворыць ён, не можа не быць у гарманічнай сувязі не толькі са сваім грамадствам, сваім сацыяльным асяроддзем, але і з прыродай, з усім навакольным светам. Нельга ўявіць пранікненне ў космас без надзейнай і трывалай апоры, без любові да ўсяго добрага і прыгожага, што існуе на нашай зямлі. Ашчадныя, клапатлівыя адносіны да жывой прыроды, замілаванне ёй, любоў да звяроў, птушак і раслін, да рэк і азёр, да роднага краю неабходна выхоўваць з маленства, з сям'і, з дзіцячага сада і са школьнай парты—гэта пачэсны абавязак і бацькоў, і настаўнікаў, і пісьменнікаў, бо ахова навакольнага асяроддзя становіцца ў нас сёння сапраўды адной з найважнейшых дзяржаўных задач.

Але чым можна растлумачыць тое, што дзеці, якія павінны добра ведаць пра карысць тых ці іншых птушак, тых ці іншых раслін, пра неабходнасць іх ахоўваць, клапаціцца пра іх, часта робяць якраз наадварот: знішчаюць птушак, ламаюць дрэўцы, топчуць расліны, добра ведаючы, што яны спецыяльна пасаджаны і вырашчаны працаю людзей для прыгажосці, для аздараўлення паветра, для агульнай карысці? Відаць, нешта істотнае ўпускаецца з-пад увагі ў выхаванні дзяцей — і ў сям'і, і ў школе, і ў літаратуры...

На вялікі жаль, шмат што яшчэ ўпускаецца ў выхаванні дзяцей. Пра гэта, нароўні з аналізам літаратурнага працэсу, а можа, нават і ў большай меры, ішла заклапочаная гаворка на пленуме. У выступленнях інспектара аддзела ўнутраных спраў Баранавіцкага гарвыканкома па справах непаўналетніх **А. Кролікавай,** намесніка міністра ўнутраных спраў БССР П. С. Жука прыводзіліся сумныя прыклады недастойных паводзін пэўнай часткі моладзі, аналізаваліся прычыны дрэннага выхавання, канфліктаў, якія ўзнікаюць між бацькамі і дзецьмі, маладымі людзьмі і сталымі. Дзеці часта лічаць, што яны і па адукацыі, і па развіццю перараслі бацькоў, і парады апошніх выконваць няма ніякага сэнсу. Тут магла б вельмі дапамагчы добрая кніга.

— Людзі не нараджаюцца дрэннымі, злоснымі, абыякавымі — яны становяцца такімі. Як бы там ні было, але не-не ды праявіцца ў асяроддзі моладзі эгаізм, душэўная чэрствасць, цынізм... Дык скажыце, заўважае **Алена Васілевіч,** якой павінна быць сённяшняя літаратура для дзяцей і юнацтва, калі назіраецца такое? І ці адны толькі пісьменнікі ў тым вінаваты? А можа, і настаўнікам у некаторых школах не шкодзіла б адарваць свае позіркі ад праграм і падручнікаў і азірнуцца вакол сябе, прыглядзецца да жыцця, якое не ўціснеш ні ў якую школьную праграму, ні ў які падручнік? А самі бацькі? Хто іх вызваліў ад адказнасці за выхаванне дзяцей, ад клопату, каб не толькі іх дзеткі да вяселля мелі ашчадную кніжку і «Жыгулі», але і сёе-тое за душой?

Пэўны духоўны перакос А. Васілевіч бачыць у залішнім, аднабаковым захапленні рознымі відовішчамі, можа, нават у распаўсюджанні бяздумных крыклівых праграм рознымі моднымі эстраднымі ансамблямі, сэнс якіх зводзіцца да слоў: «з песняй па жыцці!» (абы з якой. — **рэд.**) — не з думкаю, не з клопатам, як быццам у нашым жыцці ўсё перароблена, усё пабудавана, усё пераможана! Відаць, гэтая бесклапотная атмасфера пэўным чынам пранікла і ў пісьменніцкае асяроддзе, гаворыць А. Васілевіч, таму так цяжка выявіцца апошнім часам і паўнакроўнаму, жывому герою сучаснага твора для дзяцей. А між тым, такіх герояў падказвае само жыццё: А. Васілевіч зачытвае пісьмо, якое даслала ёй камсамольска-маладзёжная брыгада вадзіцеляў з будаўніцтва Саяна-Шушанскай ГЭС. Хлопцы паведамляюць, што яны вырашылі ўключыць у свой калектыў Героя Савецкага Саюза Пятра Купрыянава, а грошы, зароблены за яго, пасылаць у Фонд міру, «каб не паўтарыліся жахі мінулай вайны». Брыгада просіць даслаць матэрыялы аб сям'і Купрыянавых, каб аформіць куток героя ў сябе на вытворчасці.

Гэта толькі адзін з многіх прыкладаў, што ў нас ёсць з каго пісаць герояў літаратурных твораў.

Думку А. Васілевіч развівае **Міхась Герчык.** З нашай літаратуры амаль зусім выпалі падлеткі, тыя, каму сёння ад трынаццаці да шаснаццаці, хто ставіць самыя вострыя пытанні перад педагогамі і бацькамі, перад грамадствам. А яны — зусім іншыя, чым мы. Не горшыя, а — іншыя, і мы іх не глыбока ведаем, у нас недастатковы з імі кантакт. Таму няма і сапраўдных, сучасных герояў у нашых творах. Падобна, што ў нашай дзіцячай літаратуры ўсё яшчэ адчуваецца тэорыя бесканфліктнасці, даўно адкінутая літаратурай «дарослай». Нашы кнігі пра сучасных дзяцей жывяць не канфлікты, а апісальніцтва, навеянае ўспамінамі пра ўласнае маленства. Таму, натуральна, яны і не становяцца ні духоўнай спажывай падлеткаў, ні набыткам літаратуры. А падлетак, не знайшоўшы адказу на свае пытанні ў нашых кнігах, сустракае тых, хто па-свойму растлумачыць і пра першае каханне, і пра ўсё астатняе...

3. УРОК БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

— Ад школьнага выкладання літаратуры залежыць многае. Настаўнік літаратуры ў гэтым працэсе — даверaная асоба пісьменніка. Ён набліжае пісьменніка і яго творчасць да дзяцей, далучае іх да маральнага вопыту сучаснага і мінулых пакаленняў, ён не проста вывучае з дзецьмі школьны прадмет, а вучыць і выхоўвае літаратурай. І трэба спадзявацца, што агульныя клопаты і намаганні, саюз літаратуры і педагогікі прынясуць багаты плён у справе выхавання ідэйна перакананых, духоўна багатых, працавітых і актыўных будаўнікоў новага грамадства.

Воплескамі сустрэлі пісьменнікі гэтыя словы міністра асветы БССР М. Г. Мінкевіча, бо і самі лічаць сябе педагогамі, выхавацелямі, вераць у цудадзейную сілу мастацкага слова, адчуваюць сябе адказнымі за тое, каб са школы выходзіў усебакова развіты, духоўна багаты малады чалавек.

— За апошнія гады многа зроблена для паляпшэння школьных праграм, удасканалення падручнікаў, удакладнення методыкі выкладання літаратуры ў сярэдняй школе, — гаворыць **Рыгор Шкраба.** — Аднак захапляцца поспехамі не варта: жыццё ставіць новыя праблемы, якія трэба неадкладна вырашаць.

Прамоўца ўказвае на некаторыя з гэтых праблем. Кіно, радыё, тэлебачанне ўладна ўвайшлі ў штодзённы быт чалавека. Тэлевізар, транзістар, магнітафон адбіраюць час у кнігі: перадавыя настаўнікі б'юць трывогу з прычыны таго, што вучні пачалі менш чытаць. Урокі літаратуры часам нагадваюць кіналекторыі, над першакрыніцай працаваць няма калі, хоць бы паспець паглядзець фільм па аднайменнаму раману. Сумна, што, як піша адзін выкладчык літаратуры, наша школа «сяброў Людмілы і Руслана» ўжо не выхоўвае. А чытанне ж, заўважае Р. Шкраба, не толькі дае магчымасць глыбей асэнсаваць твор, пранікнуцца яго хараством, але спрыяе і развіццю памяці. У выніку таго, што вучні не чытаюць тэкст вачамі, а глядзяць інсцэніроўкі па тэлевізару, стала горшае запамінанне, у іх слабее памяць.

— І яшчэ адна бяда, — гаворыць ён. — Па той прычыне, што вучні ў класе слухаюць твор у выкананні выдатных артыстаў, у іх не ўзнікае жадання самім чытаць. Як ні дзіўна, робяць вывад спецыялісты, дасканаласць выканаўчай тэхнікі адрывае дзяцей ад кнігі. Той духоўнай работы, якая ідзе ў свядомасці чытача, што схіліўся над старонкамі «Вайны і міра» або «Людзей на балоце», нельга нічым замяніць.

Алега Лойку непакоіць недасканаласць падручнікаў роднай літаратуры для сярэдняй школы, у прыватнасці тое, як прадстаўлена ў іх сучасная паэзія. Назіраюцца такія факты, што на пэўную, тую ці іншую тэму змяшчаюцца ў іх вершы недасканалыя ў ідэйна-мастацкіх адносінах. А чытанкі павінны быць узорамі мастацкіх тэкстаў, толькі па законах мастацкай дасканаласці павінны ўключацца творы ў чытанкі і хрэстаматыі. Тым больш, што беларуская літаратура дае багаты матэрыял для выбару. А Павел Місько лічыць, што падручнікі літаратуры, у адрозненне ад іншых, не павінны быць стабільнымі. Гэта не алгебра і не геаметрыя, падкрэслівае ён. Падручнік па літаратуры павінен дапаўняцца і змяняцца, ісці ўслед за літаратурным працэсам. Арсенал сродкаў, якія ўздзейнічаюць на юныя сэрцы, трэба абнаўляць.

— У нас літаральна ўсе дзеці праходзяць цераз школу і цераз дзіцячы сад,—падкрэслівае **Ніл Гілевіч.** — Гэта значыць, што літаратуру, паэзію яны могуць засвоіць толькі цераз школу, бо цяпер далёка не ўсе бацькі ведаюць казкі, народныя песні, загадкі. Пагэтаму мяне дужа хвалюе пытанне аб месцы літаратуры ў школе.

Прамоўца падтрымлівае Б. Сачанку, які ў сваім дакладзе закранаў пытанне аб серыі «Школьная бібліятэка», якую выпускае выдавецтва «Народная асвета».

— Я разумею так, — гаворыць ён, — што, відавочна, само выдавецтва пастаўлена ў такія ўмовы, што не можа забяспечыць школу творамі беларускіх пісьменнікаў. Мы справядліва гаворым аб тым, што наша сённяшняя проза — гэта Мележ, Шамякін, Брыль, Быкаў, а таксама — Чыгрынаў, Пташнікаў, Адамчык, Сачанка, Стральцоў, Кудравец і многія іншыя. У паэзіі — апрача Куляшова, Танка, Панчанкі, Броўкі — гэта Макаль, Вярцінскі, Бураўкін, Барадулін, Сіпакоў і іншыя. Мы кажам, і справядліва, што без гэтых імён нельга ўявіць сабе нашу сучасную літаратуру. Аднак, на жаль, у школьных бібліятэках няма кніг названых тут пісьменнікаў сярэдняга і маладзейшага пакалення. Значыць, і вучні, выпускнікі школ, будуць мець няпоўнае ўяўленне пра сённяшні дзень нашай літаратуры.

Трэба падумаць таксама і аб выданні для дзяцей сусветнай класікі, працягвае Н. Гілевіч, а таксама пра тое, каб больш выдаваць выдатных твораў сучаснай літаратуры народаў Савецкага Саюза, уключаць у чытанкі пераклады сусветных шэдэўраў.

Наша выдавецтва «Мастацкая літаратура» некалькі гадоў назад пачало было выдаваць для падлеткаў серыю «Песню бярыце ў дарогу» — лепшае, грамадзянскае і інтымнае, чыста юнацкае з лірыкі сучасных паэтаў. Такія зборнікі выдаюцца не толькі ў нашай краіне, а ва ўсім сацыялістычным свеце. На жаль, гэтую серыю закрылі. Думаю, што яе трэба аднавіць.

Асобна Н. Гілевіч спыняецца на сучасным стане літаратурнай крытыкі, канстатуючы, што яна слаба выконвае свае задачы.

— Мы павінны разабрацца ў гаспадарцы дзіцячай літаратуры, — гаворыць ён. — У нас ёсць такія майстры дзіцячай паэзіі, як Васіль Вітка, Рыгор Барадулін і іншыя аўтары выдатных твораў для дзяцей, але я не ведаю ніводнай дысертацыі аб дзіцячай паэзіі такіх майстроў, не ведаю манаграфій і вялікіх грунтоўных артыкулаў. Выдатныя творы дзіцячай паэзіі ў нас слаба прапагандуюцца і даследуюцца.

Аб стане крытыкі гаварыў таксама ў сваім выступленні старэйшы пісьменнік **Макар Паслядовіч,** які, у прыватнасці, зазначыў, што наша крытыка чамусьці абходзіць маўчаннем кнігі, якія карыстаюцца поспехам у чытачоў. Як прыклады, ён назваў творы І. Грамовіча, У. Юрэвіча, У. Федасеенкі, Л. Прокшы, М. Ваданосава, Я. Курто.

— Больш як шэсць гадоў прайшло з часу выхаду ў свет пастановы ЦК КПСС «Аб літаратурна-мастацкай крытыцы», — гаворыць старшыня Дзяржкамвыда БССР **М. І. Дзялец.**— Крытыка і літаратуразнаўства рэспублікі за прайшоўшы час дабіліся значных поспехаў. Аднак у галіне дзіцячай літаратуры становішча мала ў чым змянілася. Пакуль нестае яшчэ абагульняючых выданняў па гісторыі беларускай дзіцячай літаратуры. У газетах і часопісах мала друкуецца рэцэнзій і аглядных артыкулаў па новых выданнях для дзяцей. У вышэйшых навучальных установах рэспублікі пакуль не многае робіцца для стварэння навуковай базы па падрыхтоўцы крытыкаў і літаратуразнаўцаў у гэтай галіне.

Акрамя таго, у спрэчках выступілі галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка» **Анатоль Грачанікаў,** мастак **Уладзімір Басалыга,** малады крытык **Святлана Марчанка.**

●

У прынятай на пленуме пастанове намечаны шэраг канкрэтных мерапрыемстваў па далейшаму развіццю беларускай літаратуры для дзяцей і юнацтва, умацаванню сувязі пісьменнікаў з вытворчымі і педагагічнымі калектывамі рэспублікі. Мяркуецца часцей практыкаваць творчыя камандзіроўкі дзіцячых пісьменнікаў на вялікія будоўлі краіны, у школьныя калектывы, на прадпрыемствы. Рэдакцыям літаратурных выданняў прапанавана рэгулярна рэцэнзаваць кнігі для дзяцей, выступаць з аглядамі творчасці асобных пісьменнікаў, змяшчаць іх творы.

Цяпер, напярэдадні 60-годдзя рэспублікі і Кампартыі Беларусі, асноўная ўвага літаратараў павінна быць яшчэ больш скіравана на напісанне твораў аб вялікім Леніне, аб партыі, дружбе народаў, аб героях працы, рэвалюцыі і Вялікай Айчыннай вайны.

Алена Васілевіч, Кастусь Губарэвіч, Іван Грамовіч і Алесь Савіцкі.

Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны настаўнік БССР М. А. Дзмітрыеў, Васіль Хомчанка, Эдзі Агняцвет і Сяргей Грахоўсні.
Фота У. КРУКА.

НА АТРЫМАННЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭМІІ СССР

ДАЛЁКАЕ—БЛІЗКАЕ

ІВАН Шамякін валодае цудоўнай здольнасцю. Яму заўсёды ўдаецца зацікавіць чытачоў і ходам падзей, і вострай праблематыкай, і складанымі дачыненнямі чалавечых характараў. Яго творы чытаюцца з неаслабным напружаннем і пільнай увагай.

Так зацікавілі і ўсхвалявалі нас і новыя аповесці Шамякіна «Шлюбная ноч» і «Гандлярка і паэт». Тут шмат новага і нават нязвыклага. Дзесьці за строга рэалістычным, побытавым чуецца павеў лірызму і рамантыкі, у нечаканай жыццёвай калізіі раптам раскрываюцца глыбінныя запасы духоўнасці. І само жыццё паўстае складаным, супярэчлівым, поўным глыбокага зместу.

Кожны новы твор, калі ён сапраўды з'яўляецца набыткам мастака, выяўляе і характэрную адметнасць аўтарскай індывідуальнасці, і адкрывае разам з тым у ёй якіясьці новыя грані, новыя магчымасці.

Сама па сабе тэма кнігі І. Шамякіна «Гандлярка і паэт» не новая. Ею пазначаны галоўныя вехі на творчым шляху пісьменніка на працягу вось ужо трох дзесяцігоддзяў — у апавяданнях і аповесцях, у «Глыбокай плыні» і «Трывожным шчасці». Тэма Айчыннай вайны ўвайшла актыўным кампанентам і ў сюжэт вядомых раманаў Шамякіна аб сучаснасці — «Сэрца на далоні», «Снежныя зімы», «Атланты і карыятыды», дзе яна жыве як «далёкае-блізкае», як шмат у чым вызначальны крытэрый жыццёвых вартасцей.

Аповесці «Гандлярка і паэт» і «Шлюбная ноч» — гэта па сутнасці трэці «заход», зроблены Шамякіным у адлюстраванне тэмы «вогненных гадоў». Падобная аўтарская прыхільнасць абумоўлена не толькі непакоем асабістай чалавечай памяці, што прымушае І. Шамякіна, як і К. Сіманава, Ю. Бондарава, Г. Бакланава, Ю. Збанацкага, В. Быкава, І. Навуменку, А. Адамовіча, А. Кулакоўскага і іншых пісьменнікаў зноў і зноў азірацца назад. Сучаснае жыццё, чым далей, тым больш напаўняе тэму мінулых гадоў надзённым гучаннем, абумоўлівае патрэбу асэнсавання ўрокаў другой сусветнай вайны ў новых умовах барацьбы за мір. Суд розуму і сумлення працягваецца, і сэнс яго — у сучасным аднаўленні праўды гісторыі.

Шамякін зноў піша пра партызанскі рух і камуністычнае падполле на Беларусі перыяду Айчыннай вайны. Па-ранейшаму ён засяроджвае ўвагу на паказе вытокаў вызваленчай барацьбы савецкага народа супраць фашысцкага нашэсця, адлюстроўвае розныя грані і розную ступень праяўлення гераізму: гэта і сам побыт у час акупацыйнага рэжыму, які вымагаў гранічнага духоўнага напружання, і рэальныя цяжкасці наладжвання барацьбы з ворагам, і самаахвярная мужнасць тых, хто здзяйсняў свой подзвіг.

Захоўваючы падзейную рухомасць сюжэта, пісьменнік, аднак, усё больш пераносіць сэнсавыя і эмацыянальныя акцэнты на духоўныя глыбіні твораў. Антаганістычнае супрацьстаянне двух светаў—сацыялізму і капіталізму—ён паказвае як барацьбу дзвюх маральна-этычных сістэм: гуманізму, народжанага ва ўмовах савецкага ладу, і драпежніцкай філасофіі захопнікаў-«звышчалавекаў». Шамякіну ўдалося перадаць у галоўным псіхалагічную атмасферу нацыянальнага жыцця перыяду акупацыі. Побыт партызанскага атрада ў раёне Гомеля, лагера ваеннапалонных пад Мінскам, сцэны на ахоўных паліцэйскіх пастах, жанравыя замалёўкі на Камароўскім рынку — усё гэта лакальныя, але жыццёва праўдзівыя, ёмістыя апісанні, і сведка, які бачыў ці перажыў нешта падобнае, бясспрэчна, пацвердзіць: «Так яно, сапраўды, і было».

Вобраз героя — галоўны рухавік аўтарскай задумы і ў канечным выніку вызначальны паказчык эстэтычнага ўзроўню твора. Герой Шамякіна заўсёды выразны ў сваёй грамадскай сутнасці, актыўны ў асабістым стаўленні да жыцця. Пісьменнік адкрывае яго ў розных сацыяльных сферах. Не робячы таямніцы са сваіх творчых планаў, ён, між тым, амаль заўсёды ўражвае нечаканасцю, арыгінальнасцю вырашэння задумы. І гэта абумоўлена імкненнем знайсці новы ракурс асвятлення з'явы, чалавечага характару, — тым пачуццём першапраходцы, што жыве ў пісьменніку, паводле яго ж слоў, як неадольнае жаданне «капянуць новы сацыяльны пласт».

Арыгінальнасць аповесцей «Гандлярка і паэт» і «Шлюбная ноч» вызначана ўжо самім выбарам галоўнай дзейнай асобы —у дадзеным выпадку гераіні. Відавочна, што гэты выбар зроблены аўтарам не выпадкова. Адчуваецца яго намер — уславіць беларускую жанчыну — маці, жонку, сястру партызана, якая поруч з ім ваявала, разам з ім падзяляла нягоды і неаднойчы ішла на смерць дзеля ўсенароднай справы—перамогі.

Шамякін плённа выкарыстаў значны духоўны і эмацыянальны патэнцыял жаночых вобразаў для выяўлення гуманістычнай канцэпцыі часу. Гераіні яго (Валянціна і Маша з «Шлюбнай ночы», Вольга з «Гандляркі і паэта»), сумленна выконваючы свой грамадзянскі абавязак, толькі ў рэдкія хвіліны скардзяцца на цяжкасці, не дазваляюць сабе «раскошы» быць слабымі. А між тым колькі вынікае з самога «стану і дзеяння» твораў цёплай чалавечай спагады да той, што па жорсткай волі лёсу, насуперак сваёй прыродзе павінна была не ствараць, а разбураць. Унутраны маналог, як галоўны сродак раскрыцця вобраза, яго «самавыяўлення», сведчыць аб тактоўным, беражлівым стаўленні пісьменніка да асабістага жыцця, духоўнага свету гераіні — галоўнай сферы праяўлення і яе сацыяльнага аблічча. Прыгадваецца роздум аб жыцці Лапаціна, вядомага героя К. Сіманава, і, відаць, жанчыны з аповесцей Шамякіна пагадзіліся б з такімі яго меркаваннямі: «Ці бывае наогул якое іншае жыццё, апрача асабістага? Жыццё ўсялякага чалавека складваецца з яго асабістага — з асабістых поглядаў, выбару, асабістых учынкаў. І калі толькі чалавек не раздзяліўся маладушна на дзве псеўдапалавіны, няма ніякага іншага жыцця, як жыццё асабістае».

Як сведчыць папярэдні вопыт Шамякіна, поспеху ў сінтэзе індывідуальнага і агульнага ў характары героя ён дасягае тады, калі стварае вобразы палемічна завостраныя, неадназначныя. Гэта заканамернасць заявіла аб сабе і ў кнізе «Гандлярка і паэт».

Вольга Ляновіч — бясспрэчнае адкрыццё пісьменніка. Гэты вобраз папоўніў не толькі нацыянальную, але і ўсесаюзную літаратурную галерэю самабытным партрэтам-тыпам. У пэўнай меры ён нясе на сабе адзнакі мастацкага эксперыменту, у працэсе якога аўтар-даследчык, вядома, меў права на некаторую ўмоўнасць. Аднак у галоўным пісьменнік не парушае логікі характару, дазваляючы гераіні жыць сваім натуральным жыццём. Рэальная верагоднасць гэтага вобраза грунтуецца на багацці жыццёвых фактаў, трапнасці аўтарскіх назіранняў.

Аповесць «Гандлярка і паэт» засведчыла сталае майстэрства Шамякіна ў паказе складанай узаемасувязі паміж чалавекам і навакольным асяроддзем, характарам і абставінамі. Вольга Ляновіч — незвычайная гераіня, адкрытая пісьменнікам на вядомым, але мала даследаваным мацерыку «Камароўка». Крок за крокам прасочвае аўтар парадаксальную супярэчлівасць гераіні і вызначае галоўную яе прычыну: фарміруючае ўздзеянне дзвюх супрацьлеглых сіл. Дзіця, а затым «каралева» мяшчанскай гарадской ускраіны, яна добра засвоіла запаведзі, этычныя нормы гэтага мікрасвету сацыяльнай замкнёнасці, уласніцтва, эгаізму. З другога боку, у яе душу кінуў свае зерні іншы, вялікі

І. Шамякін. Гандлярка і паэт. Аповесці. Мінск, «Мастацкая літаратура». 1977.

ПРА ЧАС І ПРА СЯБЕ

Максім ЛУЖАНІН:

«БЫЦЬ НА ЎЗРОЎНІ ЧАСУ»

НА ПЫТАННІ НАШАГА КАРЭСПАНДЭНТА АДКАЗВАЕ ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ МАСТАЦТВАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР, ЛАЎРЭАТ ЛІТАРАТУРНАЙ ПРЭМІІ ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА МАКСІМ ЛУЖАНІН.

Творчасць Максіма Лужаніна — яркая, шматфарбная старонка ў гісторыі беларускай літаратуры. Ягоны талент па-сапраўднаму глыбінны, рознабаковы ў сваім творчым выяўленні. Карэннямі сваімі ён моцна мацуецца з роднай зямлёй. Гэтая знітаванасць з бацькоўскім кутам, з тым спрадвечным, што нараджае любоў да Радзімы, добра бачыцца і ў яго паэзіі, і ў прозе, і ў дзіцячых творах. Выразна акрэсленым грамадзянскім кірункам, сацыяльнай напоўненасцю вылучаюцца таксама сцэнарыі шматлікіх мастацкіх і дакументальных фільмаў, у стварэнні якіх ён прымаў актыўны ўдзел. Добра вядомы М. Лужанін і як патрабавальны крытык, і як слынны майстар нашага перакладчыцкага цэху.

І ўсё ж больш за ўсё ён вядомы шырокаму колу чытачоў як паэт. Паэт у душы, паэт па прызванню. Паэзія М. Лужаніна — паэзія вельмі акрэсленага ўнутранага зместу, яркай пачуццёвай дынамікі. Характар яе лірычнага героя, як правіла, значны сваёй чалавечай сутнасцю, сацыяльнай напоўненасцю. Тое, пра што расказвае аўтар, заўсёды з'яўляецца сведчаннем выяўлення канкрэтнай жыццёвай пазіцыі, непрымірымасці да сацыяльнага зла, да грамадзянскай бездухоўнасці.

— Аляксандр Амвросьевіч, цяпер, калі беларускі народ рыхтуецца да 60-годдзя сваёй рэспублікі і Кампартыі Беларусі, неяк па-новаму ўспрымаюцца ўсе тыя змены, якія адбыліся за гады Савецкай улады на роднай зямлі. І, безумоўна, кожны з нас у думках зноў і зноў вяртаецца да тых мясцін, дзе нарадзіўся і рос... Мабыць, і вы часта бываеце ў сваіх Прусах, падтрымліваеце сувязь з землякамі? Наколькі паездкі гэтыя ўплываюць на вашу творчасць? Як уражанні ад убачанага ўваходзяць у тканіну новых мастацкіх твораў?

— Менш за ўсё схільны параўноўваць сённяшняе з некалішнім. Прасцей і дакладней гаварыць: некалі не было, цяпер — стала, зроблена, вынайдзена, створана. Не было звышмільённага горада Мінска, не было буйной індустрыі і будавання дакладных механізмаў, не было здабывання калійнай солі, нафты, граніту. Не радзіў па дваццаць пяць цэнтнераў (на круг) гектар. Шмат чаго не было не толькі ў аддаленыя часы, але і перад вайной. А зараз ёсць, і ў дастойным выглядзе.

Так што гаворка можа ісці не проста пра змены ў нашым жыцці, а аб прынцыпова новым у сацыяльных адносінах, у стварэнні матэрыяльных каштоўнасцей.

Бачыць, ведаць, разумець новыя з'явы ў народным руху наперад — асноўнае для творчых работнікаў. Не мінаю зручных (калі глядзіш і ўсё добра) і нязручных (калі трапляецца негатыўнае) выпадкаў пабыць з жыццём і ў жыцці таксама і я. На жаль, з землякамі сваімі бачуся не так часта, як хацелася б. Затое пазнаёміўся бліжэй з другімі мясцінамі: з Лунінеччынай, Браслаўшчынай, езджу ў Іўе, зноў зірнуў на Нарачанскі край. Не мог не паехаць на радзіму, калі ішло абмеркаванне новай Канстытуцыі. І не па тым, што было, а па тым, што стала там, перажыў, перачуў сілу і жыццёвасць нашага ладу, прынцыповасць і вернасць партыйнага курсу, таленавітасць, умельства, адважнасць народа.

Гэта дало магчымасць выступіць у друку, на сесіі Вярхоўнага Савета рэспублікі, адкласці тое-сёе ў запас.

Як уражанні рэалізуюцца ў рабоце, не скажу, не ведаю. Але яны не марнуюцца: не-не дый пракінецца што ў радку, у характарыстыцы персанажа, у падачы пэўных абставін.

— Значным дасягненнем беларускай літаратуры стала ваша паэма «Як нараджаўся новы свет», твор, у якім знайшла сваё адлюстраванне і тэма рэвалюцыі. Як узнікла задума паэмы, якія цяжкасці сустракаліся пры яе ажыццяўленні?

— Не мною, але некалькі прыкмечана: кожнае літаратурнае пакаленне стаіць на плячах у папярэдняга. Гэта што да ўзаемаўздзеяння твораў і аўтараў. Паэма мая заспявалася ў маскоўскай гасцініцы радком: «Ужо наш век у палавіне». Прапрацаваўшы два дзесяцігоддзі, мусіў паправіць: «Наш век ужо у апошняй квадры». Чаму так усё здарылася? Ды таму, што не я сябе саджаў за стол, а рабіла гэта паэма: я чакаў, калі заспяваецца сама. Што так будзе, не трацію пэўнасці. Яна жыла ва мне доўгі час ад падзелу панскай зямлі да арганізацыі першых калгасаў на Мазыршчыне, да Асінбуда і Магілёўскай шаўковай, ішла са мной праз Айчынную вайну ў сённяшні дзень. Мноства людзей, з кім спяваў песні, ваяваў, быў у адным шэрагу на рабоце, кім любаваўся, у каго вучыўся, патрабавалі працягу жыцця ў літаратурным творы. Вяла духоўная патрэба ў справаздачы перад часам за паўвека работы майго пакалення. Каб размова была — нязмушаная, як бы з вока на вока, без утойвання і каб усім былі відны адносіны: чалавек і чалавек, чалавек і грамадства, чалавек і прырода.

У дадзеным выпадку беларус і прырода: з аднаго боку — спаконвечныя акіяны балот, з другога — спаконвечныя акіяны пяску. Канечная патрэба вызваляцца ад вільгаці і прыдабываць яе, дзе толькі можна, збіраць у штучныя сховішчы. Гартаванне і рост на гэтым людзей, у мінулым і ў наш час. Вось — цэнтральны вузел паэмы. Напісаліся гэтыя раздзелы раней за іншыя, самастойна друкаваліся («Па новых прасторах») і сталі на месца толькі ў асобным выданні.

— Як сказаў Уладзімір Маякоўскі, паэзія — гэта заўсёды «езда в незнаемое». І ўсё-такі ў кожным канкрэтным выпадку аўтару шмат дапамагае вопыт папярэднікаў, прадстаўнікоў іншых творчых пакаленняў. Мабыць, такая духоўная патрэба звярнуцца да лепшых набыткаў нашай айчыннай, усёй савецкай паэзіі была і ў вас? Ці нельга тут правесці своеасаблівую паралель паміж паэмай «Як нараджаўся новы свет» і, скажам, «За далячынню далячынь» Аляксандра Твардоўскага?

— «Праводзіць паралелі», як быццам нейкім чынам раўняцца з Аляксандрам Твардоўскім? Ды немагчыма гэта для якога хочаш аўтара! Разумею, што мая паэма, апублікаваная намнога пазней, як бы апынулася «ў зоне ўплыву» паэмы «За далячынню далячынь». Апрача таго, асобныя раздзелы выраслі, як быццам, з падобнага жыццёвага матэрыялу. Аднак я пісаў, як бачыў і хацеў, хоць і мог чакаць папрокаў. І вось дачакаўся—яны ў вашым пытанні. У канчатковую рэдакцыю паэмы не ўвайшлі радкі, дзе абвяшчаўся прыярытэт вялікага савецкага паэта: «Раней казаць пачаў сучаснік, па праву — ён старэйшы брат». Яны непатрэбны: тэма і аспекты яе яшчэ доўга не вычарпаюцца.

— Наогул, праблемы ўзаемасувязей літаратур асабліва актуальныя... Якія творы рускіх пісьменнікаў, літаратараў іншых саюзных рэспублік зацікавілі вас апошнім часам як перакладчыка?

— Калі адчуваю твор блізкім, як бы сваім, дык лаўлю сябе, што пры чытанні ўслед перакладаю сказ на беларускую мову. Вельмі хацеў бы прачытаць па-беларуску раманы «Цар-рыба» і «Жыві і помні». Гэта задача для людзей маладзейшага веку. Сам бы з ахвотай сабраў

свет, які, таксама быццам свой, жыў, аднак, недзе па-за ёй, кроўную еднасць з якім ёй давялося ўсведамляць у гады цяжкіх выпрабаванняў. Зерні гэтага свету леглі не ў пустую глебу. Парадаксальнасць — своеасаблівая адзнака неардынарнасці гандляркі Ляновічыхі, яе таленавітасці, шырыні і шчодрасці натуры, што выявяцца ў самастойнасці рашэнняў, незалежнасці паводзін, пачуцці ўласнай годнасці. Парадаксальнасць адкрые раптам тонкую інтуітыўнасць гэтай жанчыны, якая адчуе ў зняможаным юпаку-ваеннапалонным невядомую і так патрэбную ёй сілу, або пойдзе ў цяжкія часы за парадай і дапамогай у чужую па духу сям'ю падпольшчыкаў Бароўскіх.

Розны ён, шлях чалавечага Узыходжання. Пакутлівы, але прамы, паслядоўны ў сваёй усвядомленасці ў Сотнікава, героя Быкава. Няроўны і пакручасты, азораны ў канцы яркай успышкай духоўнага ўзлёту — у гераіні Шамякіна. Аўтар пераканаўча адлюстраваў дыялектыку характару Вольгі як нараджэнне ў ёй новага чалавека: праз змаганне з сабой, пераадоленне ў сабе «ваўчыцы», пераацэнку жыццёвых вартасцей да ўсведамлення патрэбы жыць не толькі для сябе. Станаўленне Вольгі Ляновіч як чалавека грамадскага — гэта паступовы працэс узбуйнення яе характару, блізкага ў сваёй сутнасці шырокім працоўным масам. І далучэнне Вольгі да ўсенароднай барацьбы — заканамерная праява гэтай еднасці, што была абумоўлена сацыялістычным ладам жыцця і стала вызначальным фактарам перамогі савецкіх людзей над ворагам у гады Айчыннай вайны.

Вобраз Вольгі Ляновіч праблематычны, шматгранны. І не выпадкова ўзнікае думка: як склаўся б лёс Гандляркі, калі б не сустрэла, не адшукала яна на сваім шляху Паэта? Інакш кажучы, якая роля ў жыцці Вольгі Алеся Гапанюка?

Паказальна, што крытыка адзінадушна высока ацаніла гераіню Шамякіна і па-рознаму паставілася яна да яго героя. Бясспрэчна, вобраз Алеся ўступае вобразу Вольгі ў яркасці, каларытнасці, шматфарбнасці выяўлення, як уступае таксама

перакладзенае таварышамі з Ю. Тувіма і дапераклаў тое-сёе. Гэта і раблю часамі: у тувімаўскай папцы назбіраваюцца новыя старонкі. Каб выйшаў прыстойны томік. Перакладаў нядаўна вершы А. Пракоф'ева.

— У чым, Аляксандр Амвросьевіч, бачацца вам асноўныя тэндэнцыі і заканамернасці развіцця сучаснай літаратуры? Ці задавальняе вас яе праблематыка? Ці я аднолькавай увагай ставяцца пісьменнікі, у прыватнасці, паэты, скажам, да такіх розных тэм, як Вялікая Айчынная вайна і наш дзень, эпоха навукова-тэхнічнай рэвалюцыі? Хоць, сказаць папраўдзе, кожны значны твор пра мінулую вайну — надзвычай актуальны і сучасны...

— Амаль адразу пасля заканчэння Айчыннай вайны чалавецтвам у перадавой яго частцы заўладала турбота: як зрабіць, каб гэта полымя не ўзгарэлася зноў? Адсюль — першачарговасць мірнага клопату ў нашага народа і, вядома, у яго літаратуры. Толькі так, настойліва торачы гэта рэчышча, мы здолелі з пражытых пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі 60 гадоў большую палавіну працаваць без вайны.

Думаю, літаратура, накідаўшы штрыхі да партрэта сучасніка, мае патрэбу да паказу яго ў дзеянні, у думанні, у сардэчных рухах, у супярэчлівасці поглядаў. Такі паказ магчымы, калі літаратар разумее тое, што робіцца ў нашай Радзіме і ў свеце і разбіраецца ў гэтым не намінальна, а ўсведамляючы ўсю глыбіню і шырыню быцця.

Кола тэм не павінна абмяжоўвацца, абы толькі распрацоўваліся яны дастойна. Часам творы з далёкага мінулага прачытваюцца вельмі па-сучаснаму. Усё залежыць ад ступені ўзброенасці жыццём і ўласным талентам у тым сэнсе, што пісьменнік не можа не быць на ўзроўні перадавых ведаў, ідэй і ўмельства часу.

— А што нясе, на вашу думку, маладое пакаленне паэтаў у нашу беларускую літаратуру? Некаторыя крытыкі пачынаюць ужо гаварыць ледзь не пра інфляцыю паэтычнага слова... Ці праваменна такая пастаноўка пытання?

— На маёй памяці ў літаратуру прыйшло не меней за дзесяць хваль новых аўтараў. Усіх іх у свой час называлі маладымі, баючыся паблытацца. Калі думаць пра маладую хвалю, якая ідзе да нас апошнія два-тры гады, я пакуль што не падзяляю пабойвання крытыкі. Наадварот, ёсць запал, свежае пачуццё, часта ўласнае вока і почырк. Боязь за аўтараў у мяне пачынаецца не з першай, а з трэцяй-чацвёртай кнігі. Усе пералічаныя вышэй якасці вычарпаліся, новага не прыдабыта, затое павялічылася праходнасць у друк («аўтар 3-х кніг»!), крышку ахайней—знешне!—выглядае радок. І атрымліваецца, калі можна так сказаць, «рост назад». Такія рэчы засмучаюць, а сустракаюцца ў друку шмат дзе, у тым ліку і ў вашай шаноўнай газеце. Памагчы, асцерагчы, у часе параіць — вось пра гэта трэба думаць усім нам. Асабліва крытыцы, яна часамі то губляе мяжу ў выбары найлепшых слоў для ацэнкі, то лёгка збіваецца на звычайную грубасць.

— Ва ўсе часы хвалявала, хвалюе сёння ды і заўсёды будзе хваляваць літаратараў пытанне майстэрства. На жаль, многія паэты (і не толькі маладыя!) няўважліва ставяцца да самой мовы як першаасновы мастацкага твора, забываючы пра тое, што ўсе нашы знакамітыя пісьменнікі надавалі ёй асаблівую увагу. Вашы думкі, Аляксандр Амвросьевіч, па гэтаму пытанню...

— Думаецца, мы зараз няўважліва працуем як рэдактары. Усё, што вы гаворыце, вырашаецца даволі проста: калі рэч неахайна напісана, якое права мае яна на друкаванне? Трэба рэдагаваць усё: ад агульнай канцэпцыі твора да аграхаў у фразеалогіі (дапусцім, што арфаграфічных памылак мала). Толькі рэдагаваць зычліва, строга, без рэдагавання дзеля рэдагавання, задавацтва, калі ў аўтара што-небудзь крэсляць ці бракуюць, нават не пагаварыўшы.

— А цяпер пра вашы планы... І не толькі пра паэтычныя. Чытачы з радасцю сустрэлі вашу кнігу «Людзі, птушкі, прастор», з цікавасцю пазнаёміліся з нядаўнімі публікацыямі, успамінамі пра пісьменнікаў, сяброў юнацтва, лістамі да маладых, з нецярпеннем чакаюць зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў «Зранку да вечара»...

— За апошнія паўгода напісана кніга вершаў, зараз даводзіцца да ладу. Пра выхад майго чатырохтомніка і кнігі артыкулаў вы ведаеце. Прозу, відаць, пакажу ўвосень, калі ўсё зробіцца, як хачу.

Інтэрв'ю правёў
Алесь МАРЦІНОВІЧ.

З ПАЭТЫЧНАГА СШЫТКА

ЖЫВУ ВА ЎЛАДЗЕ НОВЫХ МАР...

Анатоль АСТРЭЙКА

●

Пастукала сонца ў акенца
Сваім залатым прамянём.
Залезла праз шчыліну ў сенцы,
Ад сну абудзіла наш дом.

Расою сцюдзёнай умыла
За ночку заспаны свой твар.
Цяплом і святлом надзяліла
Увесь навакольны абшар.

Пад сонцам вясёлым, ласкавым
І лотаць і бэз зацвілі.
Зялёнаю коўдраю травы
Накрылі прасторы зямлі.

Трывож мяне, сонейка, раннем,
Каб часам праспаць я не мог,
Як ладзіць жыццё-вандраванне
У новую далеч дарог.

●

Цяпло сардэчнай дабраты
Расце не кідка, непрыкметна,
Хаця саткана з пекнаты
І веснавой, і летняй.

Яно, як сонечны прамень,
Што прыцемак азорыў шэры,
У новы клапатлівы дзень
Нам адчыняе дзверы.

Вяртае к радасці быцця,
Заўжды з душы здымае змогу.
З ім песня ладзіцца жыцця
І ў хмуры час трывогі.

Вяртае зморанай душы
Святло забытае і ласку,
Яму пад сілу ўзварушыць
Старую нават казку.

Узяўшы неба пад крыло,
Вясёлка тчэ свае красёнцы.
Гатоў я дабраты цяпло
Зраўняць з вясеннім сонцам.

●

Я безнадзейна спадзяваўся
На нейкіх ісцін адкрыццё,
Да дзён прытомленных вяртаўся,
Гартаў забытае жыццё.

Яно ж прад мною ажывала,
І час яго не астудзіў.
Мяне нанова хвалявала,
Раджала ў сэрцы промні дзіў.

Калі журыліся бярозы,
Карцела да вясны дажыць.
У роспачы
Бяды пагрозу
Хацеў я ценем засланіць.

А цень ад сонца толькі схова.
Не быў ніколі ён шчытом...
Квітаўся я з вайной суровай
І словам гнеўным,
І штыком.

Высока,
З гонарам пранеслі
Цераз варожы мы заслон
Жыцця свайго лясную песню
Да новых подзвігаў і дзён.

Не безнадзейна спадзяваўся
Я на сябе і на людзей.
У цяжкі час пераканаўся:
Жыццё за смерць
Нашмат мацней.

●

А я нічога тут не кратаў.
Сабе спакою не шукаў.
Быў рады колерам багатым
Прынёманскіх пахучых траў.

У небе жаўранкі звінелі
На ўсе няхітрыя лады.
У лазняках струмені пелі
Свой старажытны гімн вады.

Зязюля на вярбе гасціла
І, як цыганка, рэй вяла.
Камусьці моцна нахлусіла.
Мне шмат гадоў не дадала.

Нясмела салавей азваўся
Каля ракі на статку ліп.
За ноч ён гэтак наспяваўся,
Што аж пад раніцу ахрып.

І плюхнуў сом каля карчагі,
Пайшлі аж пырскі ад ракі,
Ды кáня плакала ад смагі
А ў лозах нылі кулікі.

Не бралася на вуду рыба,
Прачнуўся бусел на сасне.
А я па беразе падыбаў
Насустрач сонцу і вясне.

●

Яшчэ не сцішылася ноч.
Сасновы бор казанні шэпча.
Яшчэ зары смалісты корч
Збірае воблачкі на вечар.

І перасмешнікі-дразды
Вядуць з раднёю пераклічку,
Яшчэ грукочуць паязды
Неўгамаванай электрычкі.

І вылез месяц з-за гары,
На небе прыкляпаў падкову,
Каб мак пацiху камары
Стаўклі парою вечаровай.

Сяджу маўкліва пры акне
І не тушу святло на дачы.
Забыцца сном няможна мне,
Бо скрыпка за сцяною плача.

Аднекуль прыляцеў пугач
Сюды да ельніка старога
І, скрыпкі выслухаўшы плач,
Па лесе свой рассыпаў рогат.

Я вечаровы час люблю,
Калі змаўкае голле бору,
Калі прыходзяць на зямлю
І ў росах засынаюць зоры.

●

У маладосці — крылы,
У старасці — развага.
У маладосці — сіла
Ды яшчэ адвага.

У маладых дарога
Надзеямі абвіта.
Каля майго парога
Палавее жыта.

У маладосці — мары.
Хада без асцярогі,
Далёка недзе хмары,
Снежныя аблогі.

Жыццё лічыў я песняй.
Не помню той пацехі,
Калі з часіны весняй
У старасць пераехаў.

Здаецца мне, старому,
Што толькі стаў на ногі,
Сабраўся выйсці з дому
У дальнюю дарогу.

●

А думаў я, што перажыў
Усе зямныя захапленні.
Чаго чакаў, па чым тужыў,
Цяпер пастаўлю на калені.

Гук слова і яго вагу
Смялей нібыта адчуваю,
Да іх павагу берагу
І з імі па жыцці блукаю.

А не звужаецца сям'я
Тых слоў, што мною не здабыты,
Яны растуць, растуць штодня,
Як ураджай на полі жыта.

Жыве ва мне патрэба слоў
Важкіх і ёмістых аб шчасці.
Каб выказаць к жыццю любоў,
Я іх гатоў у сонца ўкрасці.

Я іх збіраю, як пчала
Нектар для мёду
З весняй краскі,
Каб красавала і была
За гаспадыню ў хаце казка.

Жыву ва ўладзе новых мар,
Шукаю слоў жывыя рэкі,
Славесны цераблю гушчар —
Для думак светлыя прасекі.

У СВЯТ

Сцэна з оперы Эйна Тамберга «Сірано дэ Бержэрак».

Сцэна з балета Лепа Сумера «Гісторыя Ансельма».

Цудоўна, «Эстонія»!

З глыбінь стагоддзяў дайшоў да нас адзін з паэтычных народных эпасаў пра эстонскага легендарнага героя Калеву і яго жонку Лінду. З імёнамі гэтых герояў звязана ўзнікненне высокага скалістага ўзгорка Таампеа, на якім узнік цудоўны і горды сваёй векавой гісторыяй горад Талін.

Цяпер, каб адчуць паэтычную прыгажосць Таліна і цудоўнай радзімы Калева, трэба пабываць на адным са спектакляў Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета «Эстонія». Ён носіць у сваёй назве імя радзімы. І гэта назва ўвабрала ў сябе прыгажосць марскога ўзбярэжжа, зачараванне гісторыі, сілу духу няскоранага народа.

Тэатр «Эстонія» ўзнік на базе харавога таварыства ў 1906 годзе. Старонкі гісторыі тэатра авеяны легендарнай славай. У спектаклях тэатра спявалі Фёдар Шаляпін, Лідзія Ліпкоўская, Кіпрас Пятраўскас, Яўген Віцінг, славутыя эстонскія спевакі Аляксандр Ардэр, Марта Рунгі, Эльза Маазік, Бенна Ханзен, От Раўкас, Карл і Георг Отсы, нарэшце, спяваюць шырока вядомыя ў свеце Ційт Куузік, Хендрык Крум, Маці Пальм, Маргарыта Войтес і іншыя.

Гастрольная афіша «Эстоніі» ў Мінску нешматлікая— усяго сем спектакляў, але ў іх поўнасцю адлюстравалася шматпланавасць пошукаў сучаснага тэатра, які пастаянна шукае шляхі ўзбагачэння сродкаў выразнасці музычнай оперна-балетнай мовы. На афішы побач з папулярнымі класічнымі творамі сустракаюцца сачыненні малавядомыя. На сцэне тэатра шчасліва ўжываюцца самыя розныя музычныя жанры — оперы, балеты, аперэты, мюзіклы, што сведчыць аб шматбаковасці творчых імкненняў майстроў эстонскага тэатра.

— Тэатр «Эстонія» шматжанравы, і гэта робіць яго, побач

з Ленінградск
і некаторымі
краіны, сапра
кузняй, у гор
ваюцца почыр
рактару і сту
савецкіх, эсто
гаворыць бела
Генрых Вагне
нія» падарава
чы з нацыяна
гавару пра ба
тара Лепа Сум
сельма» і опер
стра Эйна Там
Бержэрак». На
што абодва г
таклі створань
светнай літара
чэрпнуты з ка
мана, а другі-
драмы ў вер
абодва захапл
ным каларыта
халагічнага ра
Каб стварыць
музыцы, Э. Та
звяртацца да
зацыі музыкі
Але ад гэтага п
бавілася вост
музычнай на
страціла яркай
насычанасці, з
дычную выраз
ную дакладнас
прыгажосць...

Балет Лепа
рыя Ансельма
асаблівы. Кам
спалучае рэал
ны свет, каб
шукаў гофман
яго вобраз уз
латы гаршчок
сумяшчальнас
фантазіі і вуз
кар'еры, якая
усяго да цёпл
месца і ціхага
ця. Кампазітар
рэографу — т
Мурдмаа — у
складанай м
фічнай мовай
каў героем ме
імі абодвума
тоўваюцца эл
абагульнення.

На шляху
ма, якому трэб
паміж бюргер
поўным няўда
радасным па ... і ад-
крыцці жыццём вучонага, паў-
стае шмат спакус. Спакусы бюр-
герскія — рэальныя — увасаб-
ляюць чыноўнік Паульман і вя-
дзьмарка Ліза, якая жыве ся-
род людзей пад выглядам ганд-
ляркі і нянькі дачкі Паульмана
Лізы. Фантастычна-паэтычныя
ідэі, якія адольваюць дапытлі-
вага юнака, адлюстраваны воб-
разамі караля саламандраў (па
сярэдневяковых вераваннях са-
ламандра — дух, які сімвалізуе
стыхію агню, стыхію вечнага
гарэння) і яго дачкі Серпанці-

у і дас-
Мурдмаа,
ваючы ба-
асць эле-
танца,
дзіўным
акраба-
ца «ма-
пераўзы-
сць ду-
чалаве-
ай апан-
прымі-
м свету.
задоленне
рскіх спа-
ай Мурд-
анятыя ў
— Вячас-
ым), Інге
іс Гаран-
раў), Та-
нціна) і
ы тэхніч-
ца, вы-
чую дум-
графа аб
дным ха-
абмежа-
пазнання

ў адчуць
творамі,
евядомы.
Д. Вердзі,
балетам
кампазіта-
ній і Кле-
мінчанам
горадзе
шкента ў
. сябры
астроляў
ваяцца ў
ыню —
ах «Аты-
ак у Іта-

ыкі і вы-
те Вердзі
— гаво-
кая спя-
а.

— памя-
пера ма-
ладога Вердзі, была напісана кампазітарам каля 1846 года і пастаўлена ў Венецыі. Як і ўсе яго раннія творы, опера сваім патрыятычным зместам і драматычнай музыкай выклікала захапленне слухачоў Італіі, таму што была глыбока сучасным творам, які адлюстроўваў надзеі і спадзяванні ўсіх прагрэсіўных італьянцаў на вызваленне ад аўстра-венгерскага прыгнёту. Але наступныя шэдэўры Вердзі засланілі натхнёныя творы маладога кампазітара, і толькі ў 1960 годзе швейцарская пастаноўка вярнула оперу «Атыла» да творчага жыцця.

— Я аддаю належнае смеласці пастаноўшчыка оперы—галоўнага рэжысёра тэатра Арне Міка і галоўнага дырыжора тэатра—народнага артыста Эстонскай ССР Эры Класа, якія аднавілі шэдэўр Вердзі. Праўда, іх смеласць была абгрунтаванай, — прадаўжае Тамара Мікалаеўна, — таму што ў цяперашні час тэатр «Эстонія» валодае стабільнай і таленавітай групай вакалістаў, якім па плячу любыя цяжкасці. Сама я даўно не адчувала такога вялікага эстэтычнага задавальнення ад опернага спектакля, як сёння. Рэжысёр Арне Мік дакладна перадае патрыятычны пафас барацьбы жыхароў старажытнай Італіі супраць гунаў, якія разрабавалі ў пятым стагоддзі Італію. У цэнтры дзеяння ляжаць драматычныя падзеі — барацьба хітрага і асцярожнага рымскага палкаводца Аэцыя супраць караля гунаў Атылы. Дзеянне оперы дапоўнена лірычнай лініяй Адабэлы—дачкі патрыцыя з Аквіляў і маладога воіна Фарэста, якія ў цяжкія хвіліны разумеюць сваё грамадзянскае прызначэнне і ўзнімаюцца на барацьбу з Атылай...

Музыка оперы напоўнена здзіўляючым меладычным хараством маладога Вердзі, яна даволі цяжкая для выканання. Але дырыжор спектакля Эры Клас, хормайстры Уна Ярвела і Ане Дорбек, салісты стварылі такі цудоўны ансамбль, які без усялякіх сумненняў стаіць на сусветным узроўні выканання. У маёй памяці гучыць цудоўны голас сапраўды нястомнага Ційта Куузіка (Аэцый), які стварыў вобраз хітрага і разумнага палкаводца. Нельга без задавальнення не адзначыць творчую сталасць выканаўцы партыі Адабелы Жэні Анвельт, якую я ўпершыню пачула два гады назад на конкурсе ў Вільнюсе, і, зразумела, Хендрыка Крума, які мае голас рэдкай прыгажосці, драматычнай напоўненасці і мастацкай выразнасці. Ён прадаўжае, побач з Ційтам Куузікам, слаўныя традыцыі свайго педагога Аляксандра Андэра, які выхаваў цэлую плеяду таленавітых эстонскіх спевакоў. Нарэшце, цяжка забыць уражанне, якое засталося ад артыстак балета, што ўлівалі свае галасы ў хор тэатра, які спявае вельмі складаную ў тэхнічных адносінах партыю...

...Гарачыя, доўга не змаўкаючыя апладысменты пастаянна чуліся як на балетных, так і на оперных спектаклях эстонскіх майстроў, гучалі як адзнака цудоўнага кантакту з выдатным калектывам тэатра «Эстонія», як ухвала мастацтву, што ўзбагаціла наша ўяўленне аб культуры братняга народа — нашчадкаў Калева і Лінды.

У. ЯФРЭМАЎ.

ПАСЛЯ СПРАВАЗДАЧЫ Ў СТАЛІЦЫ

Чэрвень коласаўцы правялі ў Мінску, паказаўшы на дзвюх сцэнічных пляцоўках дзесяць спектакляў розных жанраў. З іх толькі тры былі раней вядомы сталічнаму гледачу — «Сымон-музыка» паводле паэмы Якуба Коласа, «Званы Віцебска» У. Караткевіча і «Улада цемры» Л. Талстога. Артысты сустракаліся з прадстаўнікамі мінскіх фабрык і заводаў, устаноў, са студэнцтвам. Адбылася прэм'ера п'есы дэбютанта ў драматургіі Алены Паповай «Скорыя цягнікі». Гледачы аднадушна ацэньваюць высокае майстэрства вядучых артыстаў трупы, арыгінальную рэжысёрскую трактоўку твораў нацыянальнай літаратуры, сучасную методыку сцэнаграфіі. Заслугоўвае падтрымкі і ўхвалы праца тэатра па ўдасканаленню надзвычай прываблівых для гледачоў спектакляў. асабліва «Сымона-музыкі».

Акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа прысвяціў свае гастролі ў Мінску 60-годдзю Беларускай ССР і Кампартыі Беларусі.

Адбыліся творчыя гутаркі калектыву з пісьменнікамі і з актывам Беларускага тэатральнага аб'яднання, у часе якіх былі абмеркаваны прадстаўленыя на гастрольнай афішы спектаклі бягучага рэпертуару.

Гэты здымак зроблены ў час сустрэчы коласаўцаў з пісьменнікамі ў Доме літаратара: артысты Я. Шыпіла і Т. Мархель, галоўны рэжысёр В. Мазынскі, народны пісьменнік Беларусі І. Шамякін, загадчык літаратурнай часткі тэатра У. Ганчароў, народны артыст СССР Ф. Шмакаў, Ю. Гаўрук, народны пісьменнік Беларусі А. Макаёнак, Н. Гілевіч, заслужаны дзеяч культуры БССР Г. Асвяцінскі.

Фота У. КРУКА.

У ТРЭЦІ раз мінчане сустракаюць гэты знакаміты і заслужана праслаўлены калектыў. З горада Горкага прыехаў у Беларусь і ўжо выступаў у Віцебску Акадэмічны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга тэатр драмы імя М. Горкага. Сёлетнія гастролі ў Беларусі ён праводзіць як свой 180-ы сезон. Гэта — адзін са старэйшых тэатраў Расіі. У яго вялікія дасягненні ў галіне фарміравання і гартавання нацыянальных традыцый сцэнічнага мастацтва. У 1964 і ў 1970 гадах мінскі глядач мог ацаніць смелы творчы пошук горкаўцаў, шырыню іх рэпертуарных далягляд аў, адмысловыя акцёрскія таленты, якія часта складаюць дзівосны ансамбль мастакоў-аднадумцаў. Па тых гастролях мы помнім арыгінальнае прачытанне тэатрам з горада на Волзе трагедыйнага «Рычарда III» Шэкспіра, глыбіннае даследаванне горкаўскіх твораў аб выспяванні рэвалюцыі, публіцыстычную вастрыню сучасных спектакляў пра маральнае аблічча савецкага чалавека, які праходзіць выпрабаванні на прынцыповасць і сумленнасць у гады вайны і ў гады міру. А як свежа і арыгінальна гучаць на гэтай сцэне Г. Ібсен і Т. Уільямс! Мінчане і дагэтуль помняць, якія гарачыя апладысменты абуджалі ў зале такія майстры, як У. Самойлаў, Э. Суслава, В. Дваржэцкі, Р. Вашурына, А. Самарына, В. Віхроў, В. Кузняцоў і іх калегі.

Народная артыстка РСФСР Э. Суслава ў спектаклі «Дзейныя асобы» А. Гельмана.

ТРЭЦЯЯ СУСТРЭЧА

Заўтра горкаўцы адкрываюць заслону. На іх афішы пазначаны імёны класікаў—У. Шэкспіра, М. Салтыкова-Шчадрына, М. Горкага, Э. Растана. Яны прапануюць сцэнічны пераклад надзённых нарысаў В. Аграноўскага «Спыніце Малахава!», жанр якога вызначаны як драматычнае даследаванне актуальнай праблемы маральнага выхавання падлеткаў. Упершыню на сцэне ўбачаць мінчане новую п'есу А. Гельмана «Дзейныя асобы» («Зваротная сувязь»). Усяго будзе паказана адзінаццаць работ тэатра апошняга часу. Трупа на гэты раз папоўнена творчай моладдзю, якая ў суладдзі з артыстамі старэйшага і сярэдняга пакаленняў складае цікавы творчы калектыў. Мастацкае кіраўніцтва тэатра ўзначальвае заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР Герман Мяньшэнін.

У МІНІСТЭРСТВЕ КУЛЬТУРЫ БССР

РЭПЕРТУАРНЫЯ ДАЛЯГЛЯДЫ ПАШЫРАЮЦЦА

Калегія Міністэрства культуры БССР разгледзела рэпертуарныя планы рэспубліканскіх тэатраў на 1979 год.

У творчай дзейнасці Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы адзначана паглыбленая работа з выканаўцамі роляў, больш прадуманае планаванне рэпертуару, які мае спектаклі, значныя па ідэйна-мастацкаму зместу («Аптымістычная трагедыя» У. Вішнеўскага і «І змоўклі птушкі» І. Шамякіна), і прадугледжвае пастаноўкі п'ес, прысвечаных выдатным прадстаўнікам беларускага народа — Г. Скарыне і К. Арлоўскаму. Тэатру прапанавана пачаць падрыхтоўку да знамянальных дат — да сотых гадавін з дня нараджэння Я. Купалы, Я. Коласа і Е. Міровіча. У 1979 г. купалаўцы пакажуць «Генрыха IV» Шэкспіра, «Вечар беларускага вадэвіля» («Пінская шляхта» В. Дуніна-Марцінкевіча, «Мікітаў лапаць» М. Чарота і «Міхалка» Далецкіх), «Апошні тэрмін» В. Распуціна і п'есу маладога аўтара А. Паповай — «Мэта і сродкі».

Адзначыўшы творчую актыўнасць коласаўцаў у падрыхтоўцы новых спектакляў «Летась у Чулімску» А. Вампілава і «Не страляйце ў белых лебедзяў» Б. Васільева, а таксама прэм'еры да 60-годдзя БССР і КПБ— драмы «Кастусь Каліноўскі» У. Караткевіча, калегія ўказала на заўчаснае знікненне з афішы такіх важных у рэпертуары спектакляў, як «Таблетку пад язык» А. Макаёнка, «Укралі кодэкс» А. Петрашкевіча і «Матухна Кураж і яе дзеці» Б. Брэхта. Ёсць недахопы ў арганізацыі вытворча-творчага працэсу, што можа адмоўна адбіцца на выкананні коласаўцамі плана гэтага года. Калегія прыняла да ведама заяву галоўнага рэжысёра тэатра аб рабоце над бліжэйшымі прэм'ерамі. Кіраўніцтву тэатра (дырэктар заслужаны дзеяч культуры БССР Г. Асвяцінскі, галоўны рэжысёр В. Мазынскі) прапанавана актывізаваць дзейнасць па стварэнню спектакляў, прысвечаных маючым адбыцца 100-годдзям з дня нараджэння народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа. Сярод прэм'ер 1979 г. Акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа пакажа «Рамэа і Джульету» Шэкспіра, «Жорсткія гульні» А. Арбузава, «Тры мяхі засмечанай пшаніцы» У. Цендракова, «Напісанае застаецца» А. Петрашкевіча і мантаж беларускіх народных казак.

Дзяржаўны тэатр лялек БССР мае на афішы дваццаць пяць назваў п'ес, пастаўленых у розныя гады, мацуе сувязі з беларускімі драматургамі, шукае новыя мастацкія сродкі раскрыцця задумы ў яркай сцэнічнай форме. Праўда, часам адчуваецца недахоп адпаведна падрыхтаваных выканаўцаў роляў для лялечнага тэатра. Калектыву (дырэктар У. Прыліпіч, галоўны рэжысёр заслужаны артыст БССР А. Ляляўскі) прапанавана інсцэніраваць творы беларускіх пісьменнікаў. Зацверджаны такія новыя п'есы, якія ўвойдуць у рэпертуар 1979 г., — «Чаканне сабакі Тэафіла» Г. Марчука, «Лясны барабан» Г. Сапгіра і Г. Цыферава, «Прыгоды вавёрчаня Мішы» Д. Кардоша і «Салавей» Г. Кнаўта.

ПАДЗЕІ І ДАТЫ

Рыгору БЯРОЗКІНУ — 60

Вядомаму беларускаму крытыку Рыгору Бярозкіну спаўняецца 60 гадоў. У сувязі з гэтым праўленне Саюза пісьменнікаў БССР накіравала юбіляру прывітанне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Рыгор Саламонавіч!

Горача віншуем Вас, вядомага крытыка, даследчыка роднай літаратуры, з 60-годдзем з дня нараджэння.

Вось ужо больш за сорак год Вы працуеце ў галіне савецкай крытыкі. За гэты час Вы апублікавалі шмат артыкулаў і рэцэнзій па пытаннях развіцця беларускай дарэвалюцыйнай і савецкай паэзіі, якія ўвайшлі ў кнігі «Паэзія праўды», «Спадарожніца часу», «Постаці». Высокую ацэнку атрымалі Вашы нарысы і манаграфіі аб творчасці Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Аркадзя Куляшова, Пімена Панчанкі. Актуальнай праблеме творчай індывідуальнасці і ўзаемадзеяння літаратур прысвечана Ваша новая праца «Звенні».

Шмат сіл і творчай энергіі Вы аддалі працы ў часопісах і газеце «Літаратура і мастацтва», узначальваючы на працягу многіх год аддзелы крытыкі і літаратуры. У час Вялікай Айчыннай вайны Вы ўдзельнічалі ў абароне Сталінграда, ваявалі на іншых франтах. Ваш ваенны шлях адзначаны баявымі ордэнамі і медалямі.

Жадаем Вам, дарагі Рыгор Саламонавіч, добрага здароўя, шчасця, далейшых поспехаў у літаратурна-крытычнай дзейнасці».

Рэдакцыя штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтага віншавання і жадае Рыгору Саламонавічу доўгіх год жыцця, бадзёрага настрою, новых творчых поспехаў.

ГОЛАС ВЫСОКАЕ ГРАМАДЗЯНСКАСЦІ

Калі разгортваеш старонкі свежага нумара «ЛіМа» ці прабягаеш вачамі змест чарговых нумароў «Полымя», «Маладосці», «Нового мира», «Вопросов литературы», «Книжного обозрения» і сустракаеш на гэтых старонках артыкул, над якім ці пад якім стаіць прозвішча Рыгора Бярозкіна, калі ўбачыш яго кнігу на прылаўку кнігарні ці бібліятэчнай паліцы, у цябе адразу абуджаецца дух жывое цікавасці, і вочы міжволі пабягуць па радках: «Пра што ж гэта тут Бярозкін?.. Пра каго?..» Уважлівае чытанне, згода, а часам і спрэчка, радаснае судакрананне са свежаю думкай, са свежым словам — усё гэта будзе потым, увечары, калі аціхне мітусня дзённых спраў, а зараз толькі б даведацца, пра што ў цябе на гэты раз адбудзецца гаворка з цікавым, арыгінальным крытыкам, і ўнутрана падрыхтавацца да яе.

Чым жа выклікаў гэту цікавасць да сябе, да свайго слова Рыгор Бярозкін?

Найперш — прынцыповасцю ў поглядзе на літаратуру. У ацэнцы канкрэтных яе з'яў, вышынёю і пэўнасцю ідэйна-мастацкіх крытэрыяў. Для крытыка Р. Бярозкіна не існуе табеля аб рангах. З аднолькавай павагай і патрабавальнасцю ён ставіцца і да высокіх багоў паэзіі, і да тых, у каго яшчэ толькі набольваюць крылы. Вышэй за ўсё ён ставіць праўду як маральную і эстэтычную меру мастацтва, нездарма яго першая кніга так і называецца «Паэзія праўды».

Рыгор Бярозкін — крытык глыбока эрудзіраваны. Улюбёны яго свет — свет паэзіі. Яго думка свабодна арыентуецца як у беларускай, так і ў паэзіі братніх савецкіх народаў, ён жа неблагі знавец паэзіі народаў свету. Загаворыць пры ім хто пра Паўло Тычыну — ён тут жа «выдасць» Тычыну па памяці і дадасць, што ў Купалы, напрыклад, гэта гучыць вось так... А ў Лермантава — вось гэтак... Што, Багдановіч, кажаце?.. А давайце ўспомнім: Пушкін... (верш па памяці), Фет... (верш па памяці), Бацюшкаў... (таксама), Языкаў... (таксама). Відаць, існавала пэўнае падабенства саміх пытанняў, якія ў розных гістарычных умовах, на розным нацыянальным грунце паўставалі перад гэтымі мастакамі... Шокавая паралель: Дзяржавін — Купала, але гэта толькі на першы погляд. Дзекабрысцкія паэты-рамантыкі ўзялі ў Дзяржавіна ягоную высокасць і гучнасць, каб выказаць свой рэвалюцыйна-вызваленчы, грамадзянскі пафас... Тут не індывідуальна-творчая паралель, а тыпалагічна-агульная...

Прашу прабачэння ў дарагога юбіляра за гэтую міжвольную імітацыю: мне хацелася паказаць стыль яго мыслення, шырыню яго думкі праз жывую яго інтанацыю. А Бярозкін мысліць сапраўды шырока і грунтоўна. Яго лепшыя літаратурна-крытычныя і літаратуразнаўчыя работы — гэта сапраўдная навука з яе пільнай увагай да прадмета даследавання, з добрасумленнасцю і ўсебаковасцю аналізу, з яе імкненнем да сінтэзу. І з той добраю доляю займальнасці, дасціпнасці, высокага густу, якія і павінны быць у навуцы, што даследуе літаратуру. Усё гэта, разам узятае, малюе перад намі жывую раку нашай радзіннай паэзіі, якая ў сваім паступовым, у сваім няўхільным руху імкне ў акіян сусветнай паэзіі. «Беспрыдзь імкне ў акіян», — так выказаў гэтую думку Бярозкін у артыкуле пра творчасць Куляшова, развіўшы яе потым у самай сваёй лепшай, з сэрца вынятай кнізе «Звенні». Гэта — вяршынная думка сучаснай беларускай крытыкі, якая заснавае вопыт сваёй літаратуры ў сувязі з вопытам усёй нашай шматнацыянальнай літаратуры, з вопытам літаратуры сусветнай.

Пры ўсёй сваёй патрабавальнасці, пры ўсёй прынцыповасці ў ацэнках літаратурна-мастацкіх твораў Р. Бярозкін — крытык вельмі ашчадны. Ён цэніць кожную крупінку таленту, у каго б яна ні выблісну. Складальнік тома анталогіі беларускай паэзіі, ён, помніцца, усё трывожыўся, каб з яе не прапала ніводнае імя. Сумленны працаўнік на ніве беларускай літаратуры, ён умее цаніць і берагчы яе багацце.

Рыгору Бярозкіну спаўняецца... А-ай, давай не будзем лічыць сваіх гадоў, дарагі Рыгор Саламонавіч. Давай лепш памераем тыя гады перажытым і зробленым — гэта, дальбог, весялей і карысней.

Што было? Былі франты — Паўднёва-Заходні, Сталінградскі, Бранскі, 1-ы Украінскі, быў Сталінград. Заслужаны за баявыя заслугі — ордэн Айчыннай Вайны II ступені, ордэн Чырвонай Зоркі, медалі «За вызваленне Прагі», «За ўзяцце Берліна». Вось што зроблена для Радзімы, калі яна паклікала цябе ў свой цяжкі час.

Што ёсць? Ёсць твае добрыя кнігі, у якія ўкладзена ўся душа: «Паэзія праўды», «Спадарожніца часу», «Аркадий Кулешов», «Человек на заре», «Свет Купалы», «Мир Купалы», «Постаці», «Пімен Панчанко», «Кніга пра паэзію», «Звенні» — вось іх колькі, вось што зроблена ўжо на працэўным фронце для людзей, для літаратуры, для будучыні.

Дык добрага ж табе здароўя і доўгіх гадоў жыцця, дарагі Рыгор Саламонавіч! Няхай яшчэ доўга гучыць у літаратуры твой голас — голас высокае грамадзянскасці.

Вера ПАЛТАРАН.

Івану МЯЛУ — 60

Празаіку Івану Мялу спаўняецца 60 гадоў. З нагоды юбілею праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі накіравала яму прывітанне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Іван Ільіч!

Сардэчна вітаем Вас са слаўным юбілеем—60-годдзем з дня нараджэння.

Вы прыйшлі ў літаратуру, маючы за плячыма багаты жыццёвы вопыт: служба ў радах Савецкай Арміі, вучоба ў Маскоўскім зааветэрынарным інстытуце, а потым у аспірантуры, абарона дысертацыі на званне кандыдата ветэрынарных навук.

Першае апавяданне «Белы конь» Вы надрукавалі ў 1947 г. у часопісе «Огонек». З таго часу Вы актыўна працуеце ў жанры прозы. Чытачы добра ведаюць Вашы аповесці і раманы «Передний край», «Бытень», «Верность», «Искушение Гарпины», «Отлучка», «Раскол» і іншыя.

Большасць сваіх твораў Вы прысвяцілі паказу подзвігу савецкіх людзей у грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнах. Ярка і каларытна расказваеце Вы і аб жыцці налгаснай вёскі. Вы ўмееце стварыць запамінальны характар, дакладна паказаць псіхалагічны стан чалавека.

Прыемна адзначыць, што Вы паспяхова спалучаеце літаратурную справу з навуковай—з 1962 г. па сённяшні дзень працуеце ў Беларускім навукова-даследчым ветэрынарным інстытуце, выступаеце ў друку з цікавымі навуковымі публікацыямі.

Жадаем Вам, дарагі наш сябра, новых творчых і навуковых набыткаў, добрага здароўя, шчасця».

Рэдакцыя штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтага віншавання і жадае юбіляру шчасця, доўгіх год жыцця, ажыццяўлення творчых задум.

СЛОВА ПРА СТАРЭЙШАГА ТАВАРЫША

Чытаць Івана Мялу і цяжка, і лёгка, і пакутліва, і прыемна. Рэдка хто з пісьменнікаў карыстаецца такім шырокім, маляўнічым слоўнікам, рэдка хто можа пранікнуць у псіхалогію, быт простага селяніна, як гэта ўмее Мяла.

Я кажу гэта зусім не таму, што ў юбілеі прынята гаварыць або толькі прыемнае, або нічога не гаварыць. У апошнія гады па волі абставін мне давялося быць адным з першых чытачоў і нават — рэдактараў часопісных, «неманскіх», публікацый яго твораў. Сярод іх аповесць «Чертово беремо», раманы «Раскол» і «Искушение Гарпины». Усе яны, гэтаксама як і іншыя кнігі пісьменніка, так або інакш прывязаны да роднага яму Старадуба, горада, які стаіць на скрыжаванні старажытных гандлёвых шляхоў і да сцен якога з трох бакоў падыходзяць расійскія, беларускія і ўкраінскія землі (дарэчы, і размаўляюць мялаўскія героі на вельмі адметнай сумесі ўсіх гэтых моў).

Па-за Старадубшчынай Мяла быццам адчувае сябе няўтульна, скавана, можа, таму ён з вялікай ахвотай то пераносіць чытача ў XVI стагоддзе, у часы старадубскай вольніцы, то піша драматычны раман аб суровых гадах пачатку нашага стагоддзя — зноўтані прывязаны да Старадубшчыны, дзе складана развіваліся падзеі рэвалюцыі; то, паклікаўшы на дапамогу смеласць, піша ў перайманне гогалеўскім «Вечарам» сваю гарэзлівую, смехатлівую «Гарпину», кнігу пра нашых сучаснікаў, у якой сапраўды ёсць нешта ад Гогаля, а ўсё ж больш ад самога Івана Мялы. Усё тут напоўнена жыццём, і ты не старонні сведка, ты — саўдзельнік вясёлых нірмашоў, знешне бесшабашных пірушак, высока апазтызаваных народных ігрышчаў, ты з задавальненнем суперажываеш з мялаўскімі героямі і каханне, і пакуты... Часам здзіўляешся, адкуль у пісьменніка такое арганічнае пранікненне ў душу свайго героя, такое разуменне яго радасцей і трывог, такое веданне абставін і, нарэшце, такое багатае ўяўленне!

Так, ён майстар у дзесятку слоў раптам «выкаціць» яскравы вобраз (што адзначаў у свой час яшчэ Ю. Алеша і пазней — не раз — В. Шкловскі). Чалавек у Мялы, нават выпадковы сустрэчны, і апрануты, так што аж бачыш яго, і пагляд у яго адметны, і жэст, і характар...

Жыццялюбнаму, тэмпераментнаму пісьменніку Івану Мялу, а менавіта такі ён і ёсць, спаўняецца шэсцьдзесят. Ведаю, не прыслухоўваючыся, што беларускія зязюлі прадракуць яму яшчэ многа.

Уладзімір КУДЗІНАЎ.

«Ускраіна» Мінска — Чыжоўка.

Фота Э. ЭЛЬКСІНА.

Рэпліка

ФАЛЬШЫВАЯ МЕЛОДЫЯ

Не так даўно ў Мінску, а перад гэтым у Гомелі, Магілёве, Бабруйску і Салігорску можна было бачыць маляўнічыя афішы такога зместу: «Ленінградская група «Мелодыя» паказвае музычна-эксцэнтрычнае шоу-буф. Толькі для дарослых».

Дык вось, ніякіх «жартоўных мелодый Еўропы, Азіі, Амерыкі» ансамбль не паказаў, калі не лічыць сто разоў чутых мексіканскай і нямецкай народных мелодый, якія аркестр выканаў, натуральна, у самбрэра і капелюшах з пяром. Так сказаць, для каларыту. І яшчэ саліст ансамбля Юлій Карнееў праспяваў песню, якую «Мелодыі» ў час зарубежных гастроляў «падарыў» адзін папулярны англійскі спявак. Спяваў яе Карнееў, вядома, на англійскай мове (ва ўсякім разе, артыкуляцыя была не руская).

Што датычыцца джазрока, дык гэтага было ўдосталь. Скажам адразу, мы не супраць сучасных рытмаў. У тым ліку, і поп-музыкі. Вядома, лепшых яе ўзораў. Але госці абрынулі на галовы слухачоў проста какафонію гукаў, узмоцненых без меры дынамікамі. Што і казаць, гэтыя басы рытм-гітары ўмеюць у руках віртуозаў вішчаць.

Здзівіла яшчэ вось што. І вядучы прадстаўлення, і мастацкі кіраўнік калектыву У. Румянцаў у гутарцы з аўтарам гэтых нататак гаварылі, што «вялікая творчая дружба звязвае «Мелодыю» з кампазітарам В. Салаўёвым-Сядым». З асаблівым гонарам вымаўляліся ўсе яго званні: народны, лаўрэат, герой і г. д. Толькі засталося незразумелым, чаму ансамбль так і не выканаў ніводнай песні, ніводнай мелодыі знакамітага аўтара.

Паўзы паміж музычнымі нумарамі госці запаўнюць рознымі сцэнкамі, жартамі, пантамімай, прыпеўкамі і г. д. На жаль, пераважная большасць з іх разлічана на прымітыўны густ. Мы не кажам ужо, што няма наогул стрыжня, тэмы прадстаўлення. Атрымалася нейкая «салянка», прыгатаваная, да таго ж, надзвычай нясмачна.

Вось некалькі ўзораў гумару залётных артыстаў.

Пачынаецца шоу з інтэрв'ю, якое адзін з артыстаў бярэ ў налег, якія «іграюць» публіку. Пытанне ў інтэрв'ю адно: як гледачы разумеюць слова «шоу».

— Шоу, — адказвае адзін, — гэта слова, а слова — не верабей, выляцела — не злоўіш (?!).

А вось як аб'яўляецца выхад аднаго з артыстаў.

— Перад вамі выступіць маг і чарадзей, які тут праездам з Бабруйска ў Парыж.

Таксама «хохма» часоў «Залатога цяля» І. Ільфа і Я. Пятрова. Мы ўжо не кажам, што каронным нумарам «мага і чарадзея» (артыст М. Лангоцкі) было завязванне вузла на насоўцы, пасля чаго, памахаўшы той насоўкай, ён сказаў: «Да пабачэння» і задаволена зарагатаў ад такога «падвоху» гледача.

Слухалі мы і прыпеўкі на «народныя» словы, як аб'явіў вядучы. Выконвалі іх дзядзькі-артысты, апранутыя ў сарафаны. Большасць куплетаў вось такога ўзору: «На горе стоит корова, семечки грызет, отморозила копыта, никто замуж не берет» (?!).

Другое аддзяленне канцэрта заняў Юрый Кукін, лаўрэат Усесаюзнага конкурсу турысцкай песні. Сам Ю. Кукін чалавек, безумоўна, здольны (ён аўтар таніх папулярных песень, як «А я еду за туманам», «Парыж» «Поезд» і іншых). І тут выступленне яго пакідае ўвогуле прыемнае ўражанне. Па-першае, заўсёды цікава пачуць вядомую песню, як кажуць, «з першых рук». Па-другое, да кожнай песні аўтар «падводзіў» дасціпным расказам, як яна нараджалася.

Вось толькі... гітара ў руках спевака выглядала бутафорскай, бо выконваў Ю. Кукін свае песні ў суправаджэнні той жа «Мелодыі».

Дзіўны музычны сімбіёз!

Мы ведаем цудоўнае мастацтва Ленінграда і заўсёды з радасцю сустракаем пасланцоў горада на Няве. Марка ленінградцаў — заўсёды высокая марка, ці тычыцца гэта якасці прамысловых вырабаў, ці твораў мастацтва. І тым больш прыкра, што яўная халтура, якую прадэманстравала «Мелодыя», мела камандзіроўку ленінградскай канцэртнай арганізацыі.

Так, за выключэннем выступлення Ю. Кукіна, сустрэліся мы з халтурай. Крыўдна за сапсаваны вечар, за падманутыя спадзяванні гледачоў, якія запоўнілі ў гэты вечар трыбуны («Мелодыя» давала свае прадстаўленні ў памяшканні Мінскага дзяржцырка). І павінен сказаць, што У. Румянцаў і яго падначаленыя ўмеюць рабіць сабе «паблісіці». Тут, у Мінску, пасланцы «Мелодыі» з гэтай мэтай пабывалі ў рэдакцыях многіх газет. У. Румянцаў прасіў і аўтара гэтых радкоў абавязкова даслаць яму на ленінградскую кватэру газету з рэцэнзіяй на прадстаўленне. Само сабой, мелася на ўвазе што водгук будзе самы станоўчы.

Ну, а Белдзяржфілармонія, якая арганізуе канцэрты гастралёраў? Дырэктар філармоніі В. Букань прызнаўся нам, што сам праграмы не бачыў, але чуў, што яна вельмі пасрэдная. Дапусцім, сам дырэктар не можа асабіста прагледзець усе канцэрты, але ж нехта павінен гэта рабіць? Мо тады б і не здарылася гэтага «шоу-буфа».

М. ЗАМСКІ.

ПАДЗЕІ І ДАТЫ

АДЗІН З ПАЧЫНАЛЬНІКАЎ

ДА 110-годдзя ЯДВІГІНА Ш.

АНТОН Лявіцкі (сапраўднае прозвішча пісьменніка), раманіст, нарысіст, драматург, перакладчык, фельетаніст, байкапісец — адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры. Творчасць яго па тым часе вызначалася высокімі мастацкімі вартасцямі, і гэта сёння важна падкрэсліць.

Ядвігін Ш. нарадзіўся 25 чэрвеня 1868 г. на Рагачоўшчыне. Вучыўся ў Мінскай гімназіі, а пасля нейкі час на медыцынскім факультэце Маскоўскага універсітэта. Дэмакратычна настроены з юнацтва, ён не мог быць у баку ад студэнцкага руху, прымаў актыўны ўдзел у хваляваннях, якія тады адбываліся ва ўніверсітэце, за што трапіў у Бутыркі. Пасля адбыцця тэрміну пакарання быў выключаны з універсітэта, вярнуўся ў Беларусь і працаваў памочнікам аптэкара ў Радашковічах.

Літаратурную працу Ядвігін Ш. пачаў яшчэ седзячы ў Бутырках перакладам на беларускую мову апавядання У. Гаршына «Сігнал» (асобнай кніжкай выйшла ў 1891 годзе ў Маскве). Пасля гэтага доўгі час на роднай мове друкавацца не мог, але літаратурнай працай займаўся актыўна і ўпарта. Супрацоўнічаў у рускай і польскай прэсе (апавяданні «Мілка», «Мустафа», шэраг артыкулаў і фельетонаў).

Першы ўласны твор на беларускай мове Ядвігін Ш. надрукаваў у 1906 г. (апавяданне «Суд» у «Нашай долі», № 3). З гэтага часу і пачаўся яго актыўны і плённы ўдзел у развіцці беларускай літаратуры. Пісьменнік падтрымліваў сталыя сувязі з многімі грамадскімі і палітычнымі дзеячамі, быў, можна сказаць, у самай гушчыні жыцця. Гэтаму садзейнічала тое, што ён супрацоўнічаў і нават нейкі час загадваў літаратурным аддзелам «Нашай нівы».

Нялёгкім быў жыццёвы і літаратурны лёс Ядвігіна Ш. Але, нягледзячы на цяжкую хваробу, ён працаваў у літаратуры доўга і зрабіў нямала. Яшчэ пры жыцці выйшлі ў свет кніжкі яго твораў «Дзед Завала» (1910), «Бярозка» (1912), «Васількі» (1914), «Успаміны» (1921) і інш.

Галоўная асаблівасць творчасці Ядвігіна Ш. — вялікая вера ў чалавека працы, у яго кемлівы розум. Ягоныя невялікія шчырыя апавяданні раскрываюць багатую душу простых людзей, шырока паказваюць чалавечнасць і дабрыню, веру ў справядлівасць і праўду на зямлі («З маленькім білецікам», «Зарабляюць», «Гаротная» і іншыя).

Цёпла адзываліся аб пісьменніку яго сучаснікі. М. Багдановіч, напрыклад, лічыў яго «найлепшым баечнікам нашых часоў». Сябраваў з ім Янка Купала. Наогул, сучаснікі паважалі яго за светлы розум, за талент, які ён аддаваў свайму народу. Хоць у большасці сваёй увага да чалавека працы абмяжоўвалася ў Ядвігіна Ш. пасіўным спачуваннем, але ён заўсёды верыў у светлае заўтра, у духоўнае разняволенне народа.

Іван ПАЎЛЮКОЎСКІ.

ВЫПРАБАВАННЕ ДОЎЖЫЦЦА ГОД...

Пад уяўным купалам (гэта звычайная спартыўная зала) дзве імклівыя фігуркі выконваюць на трапецыі складаныя практыкаванні. Але раптам нешта не атрымалася, дзяўчынкі спыніліся, абмеркавалі сваю памылку і пачалі зноў...

Вось ужо на працягу дзевяці гадоў кожнай восенню Аляксандр Аляксандравіч Шлюндзін — мастацкі кіраўнік народнага цырковага калектыву «Юнацтва» Наваполацкага Палаца культуры нафтавікоў сустракаецца з сотнямі юнакоў і дзяўчат, якія прыходзяць сюды па аб'яве, што абвяшчае прыём у падрыхтоўчую групу. Сустракаецца з сотнямі, а выбірае не больш трыццаці. Але галоўнага выпрабавання для гэтых трыццаці чалавек, якім так хочацца трапіць у асноўны састаў «Юнацтва», яшчэ не адбылося. Наперадзе экзамен на волю і ўменне працаваць. Экзамен доўжыцца год і вытрымліваюць яго толькі пяцьшэсць чалавек.

Што прымусіла дзяцей прыходзіць у цырк не цікаўнымі гледачамі, а яго